www.polszcza.com

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

# www.polszcza.com

*Польшча вачыма беларускіх журналістаў і дасьледнікаў*

KAMUNIKAT.org

Цэнтар Грамадзянскай Адукацыі Польшча – Беларусь
Беласток 2005

Рэдактар
Марцін Рэмбач

Карэктура
Віталь Луба

Падрыхтоўка да друку
Аляксандар Максімюк (http://valcomp.biz/setpro/)

У кнізе скарыстаныя элементы дызайну сайту
www.polszcza.com

KAMUNIKAT.org

*Кніга выдадзеная за кошт*
*Міністэрства Замежных Справаў Польшчы*

Copyright © 2005 by Centrum Edukacji Obywatelskiej Polska – Białoruś

Друкарня
„Offset-Print”, ul. Broniewskiego 14, Białystok

# палітыка

polszcza.com

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

**Аляксей Лапіцкі**

# Знаёмства з далёкай і блізкай Польшчай

## У Беластоку напярэдадні дня незалежнасьці Польшчы

Беласток сустрэў сьвежым і надзвычай цёплым для другой паловы лістапада паветрам, нязвыклай у параўнаньні зь Беларусьсю цішынёю, нейкім нутраным спакоем і ... — поўнай адсутнасьцю паліцыянтаў.

Не, яны канешне-ж праяжджалі ў машынах, рабілі ўласную штодзённую справу па ахове правапарадку. Але ў адрозьненьні ад Менску, дзе „шэры колер” літаральна запаланіў прыпынкі ў мэтро й мільгаціць ледзь не на кожным вулічным перакрыжаваньні, быццам у часе нейкай чарговай спэцапэрацыі пад кодавым назовам „перахоп” — ахова парадку ў Польшчы працавала цывільна й неяк зусім ужо незаўважна.

Палітычнае жыцьцё працягвала сваю няспынную хаду пасьля адбыўшыхся парлямэнцкіх і прэзыдэнцкіх выбараў, на якіх перамог ПіС (Партыя „Права й Справяд-

лівасьць", Яраслаў Качынскі) і Лех Качынскі. Вялікая колькасьць людзей уважліва сачыла за тэлевізійнымі дэбатамі, заявамі, пасьлявыбарчымі перамовамі па фармаваньні новага ўраду на чале з Казімежам Марцінкевічам. Было бачна, што палякам неабыякавы лёс уласнай краіны, што яны асэнсавана прыймалі ўдзел у выбарах і маюць спадзяваньні на эфэктыўнае разьвіцьцё й узмацненьне пазыцыяў Польшчы ў Эўразьвязе, пераадоленьне беспрацоўя й дзейснай барацьбы з карупцыяй.

Дарэчы, аб апошніх сур'ёзных праблемах сучаснае Польшчы казалі практычна ўсе суразмоўцы, як афіцыйныя асобы, гэтак і просты люд, пэнсіянеры, студэнты, прадпрымальнікі, заангажаваныя ў грамадзка-палітычнае жыцьцё краіны.

Натуральна, што час паставіў перад сяброўкай ЭЗ новыя актуальныя задачы, расставіў новыя сацыяльна-эканамічныя прыярытэты, прапанаваў абрацць за аснову якасна новыя крытэрыі сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця й эўрапэйскага дабрабыту, стабільнасьці й бясьпекі, эфэктыўнай працы розных галінаў улады, функцыяваньня грамадзка-палітычных інстытутаў і свабоднага рынку незалежных СМІ.

Новыя сустрэчы зь цікавымі людзьмі ў Беластоку пацьвердзілі некаторыя папярэднія назіраньні, пэўныя чаканьні. Акрамя таго, яны далі вельмі шмат новай інфармацыі для асэнсаваньня той сытуацыі, у якой знаходзіцца сучасная Польшча й таго, што чакае краіну ў бліжэйшым часе...

**Сустрэчы**

**У цягніку на Польшчу**

Пані сталага веку ў цягніку з Гародні да Кузьніцы, якой ёсьць што ўзгадаць і пра што паведаць казала, што ўскладае вялікія спадзяваньні на новы ўрад на чале з панам Марцінкевічам, шчыра жадае ўзмацненьня пазыцыяў уласнай краіны ў аб'яднанай Эўропе. Яна — пэнсіянерка, атрымлівае пэнсію ў 1 200 злотых (360 USD).

Ейны муж атрымлівае менш, але цалкам сужэнцы задаволеныя жыцьцём і маюць спадзяваньні на паступовае паляпшэньне сытуацыі й рост дабрабыту. Пані казала, што людзі занепакоеныя станам беспрацоўя й нянадта спрыяльнымі ўмовамі Польшчы ў Эўразьвязе, праблемаю карупцыі ў краіне. Яна распавяла пра ўласных родзічаў у Гародні, што сама раней пражывала ў Заходняй Беларусі й ведае цяжар „камуністычнай сыстэмы”, вельмі станоўча ставіцца да зафіксаванай у новай Канстытуцыі Польшчы забароны фашыстоўскіх і камуністычных арганізацыяў.

— Тыя пакуты й выпрабаваньні, якія прынеслі народу дыктатарскія ідэалёгіі й рэжымы проста нельга параўноўваць з тымі праблемамі, якія мае сёньня краіна. З праблемамі справімся. Ёсьць вялікая надзея й добрыя перадумовы, ёсьць сілы.

Панечку хвалявала значна ўзросшая ў параўнаньні з 1980-мі гадамі зьнешняя запазычанасьць краіны. Яна памятае пра тагачасную 40-мільярдную даляравую зьнешнюю запазычанасьць і цяперашнія... каля 500 млрд. даляраў пазыкі. На разьвітаньне пані пажадала беларусам посьпехаў і хутчэйшых пераменаў у краіне...

Потым, пасьля размоваў з дасьведчанымі асобамі, я шкадаваў, што ня мог адразу давесьці да жанчыны аб’ектыўную інфармацыю па гэтым пытаньні. Аказалася, як мне патлумачылі потым кваліфікаваныя суразмоўцы, сытуацыя з дэфіцытам бюджэту й зьнешняй пазыкаю з прафэсійнай пазыцыі выглядае цалкам нармальна. У сёньняшняй Польшчы ў параўнаньні з 1980-мі гадамі значна ўзрасла ўдзельная вага валавога ўнутранага прадукту (ВУП), таму ўзровень зьнешніх пазыкаў краіны адносна росту ВУП у адсоткавым вымярэньні адпавядае эўрапэйскім стандартам і ўсім нормам эфэктыўнасьці функцыяваньня сучаснае эканомікі. Дарэчы, без выкананьня абавязковых паказчыкаў па гэтых пазыцыях Польшча ня здолела-б увайсьці ў Эўразьвяз.

### Рэзюмэ па сустрэчах і ўражаньні ад СМІ

Шчыра ўразіла адкрытасьць дзяржаўных чыноўнікаў, дэпутатаў і бізнэсоўцаў для сустрэчаў і абмеркаваньняў рэальных праблемаў. У адрозьненьні ад беларускіх тэлеканалаў польскія тэлеаўдыторыі маюць магчымасьць глядзець масу карысных праграмаў. А грамадзка-палітычная палітра прадстаўлена на ТВ-экранах вялікай колькасьцю прадстаўнікоў розных партыяў, магчымасьцю грунтоўнага выкладаньня імі ўласных пазыцыяў.

Пасьля лукашэнкавай прапаганды на ТБ, якая літаральна запаланіла тэлеэтэр ідэалягічным „сьмецьцем”, селектарнымі „прамыўкамі” й шчыра замоўным антызаходнім і антыэўрапейскім „слэнгам” становіцца відавочным той велізарны крок, які прайшла суседняя Польшча ў вызваленьні ўласных СМІ ад ідэалягічнага дыктату й цэнзуры, манаполіі ўлады на распаўсюд інфармацыі.

Сёньня, у адрозьненьні ад тэлебачаньня Беларусі, электронныя СМІ Польшчы працуюць на свабодным рынку інфармацыі, што само па сабе працуе на паступовае фармаваньне сучаснага, аб’ёмнага, максымальна аб’ектыўнага погляду на зьявы й рэчы, прыцягвае новыя чытацкія й тэлевізійныя аўдыторыі, актывізуе грамадзянскую ініцыятыву.

Ствараецца ўражаньне, што на эўрапейскай мапе сёньня засталося адзінае месца, дзе дзяржаўныя зманапалізаваныя СМІ безупынна працуюць у рэжыме „псыхатропнага праграмаваньня”, замацоўваюць старыя мэнтальныя стэрэатыпы мысьленьня, масава тыражуюць зацьверджаныя ў ідэалягічных аддзелах паліталягічныя ідэалягемы й штампы, фармуюць у тэлегледачоў варожае стаўленьне да любой грамадзянскай ініцыятывы, альтэрнатывы „адзінаправільнай вэртыкалі ўлады”.

Ня трэба было дасканала ведаць польскую мову, каб адразу заўважыць розьніцу. Некалькі праграмаў польскае тэлевізіі прадставілі прыклад таго, як працуюць свабодныя СМІ ў суседняй краіне, якія разам утвараюць

свабодны мэдыйны рынак інфармацыі й скіраваныя на максымальны рэзананс і патрэбы ўласных чытацкіх альбо тэлевізійных аўдыторыяў, імкнуцца працаваць эфэктыўна, выконваць ролю апэратыўнага й нескажонага абмену інфармацыяй, дакладнага данясеньня й рэтрансляцыі розных палітычных плятформаў і праграмаў, навінаў і інфармацыйных падзеяў, шырокага спэктру грамадзкае думкі й палітычных выказваньняў. Яны ствараюць пляцоўкі для абмеркаваньня праблемаў і навязаньня зваротнае сувязі з канкрэтнымі мэтавымі аўдыторыямі ў грамадзтве.

Тэлебачаньне час ад часу паказвала выступы розных палітычных лідараў, яны выказвалі свае пазыцыі, ішла жывая дыскусія. У часе грамадзка-палітычных дэбатаў было бачна, што ў тэлеэтэры прадстаўлены розныя думкі, пазыцыі й плятформы. Ідзе жывое абмеркаваньне. Выступаюць розныя суб’екты грамадзкай супольнасцы, прадстаўнікі партыяў і грамадзкіх арганізацыяў.

Дарэчы, на беларускіх „чырвона-зялёных” тэлеканалах у кантэксьце польскай выбарчай кампаніі прыйшлося назіраць наўпростую пяратасоўку фактаў і тэндэнцыйныя рэапартажы пра „недасканалую” ў параўнаньні зь беларускай выбарчую сыстэму сяброўкі Эўразьвязу Польшчы.

Чарговую вутку супраць суседняе Польшчы на фоне тэлекарцінак з польскімі афіцыйнымі асобамі, выбарчымі плякатамі на польскіх вуліцах „запускаў” афіцыйны прадстаўнік парлямэнту Беларусі, сам таварыш Чаргінец. У выніку, была скрытыкаваная ў пух і прах выбарчая сыстэма Польшчы, дзейсны закон, адсутнасьць у ім такога паняцьця, як назіральнікі й г.д.

Ведаючы рэальна сытуацыю з выбарчай сыстэмай у Польшчы, якая рэальна гарантуе грамадзянам выбар і кантроль за выбарчым працэсам праз непасрэдны ўдзел у фармаваньні й працы выбарчых камісіяў для прадстаўнікоў розных выбарчых камітэтаў, нельга было адшу-

каць словаў, каб выказаць тыя эмоцыі, якія выклікала прадстаўленая для тэлегледачоў у Беларусі чарговая брудная, замоўленая беларускай уладаю тэлефальшыўка.

Таварыш з БТ, як заўсёды проста запамятаў паведаміць беларускім тэлегледачам, незнаёмым з прынцыпамі фармаваньня выбарчых камісіяў у Польшчы, што кожны з выбарчых камітэтаў і мае магчымасьць праз дэмакратычную працэдуру жараб'ёўкі трапіць у склад любой выбарчай камісіі й ня проста адсочваць увесь працэс галасаваньня й падліку выбарчых бюлетэняў, але непасрэдна ўдзельнічаць у падліку й кантраляваць знутры дзейнасьць выбарчых камісіяў усіх узроўняў.

Хай бы лукашэнкаўская, самая правільная ў сьвеце „выбарчая піраміда", паспрабавала дазволіць сабе такое! Ды яна-б разваліласяразам зь дзейсным рэжымам пасьля першых-жа дэмакратчыных выбараў. А колькі радасных імгненьняў падарыла беларускім ідэолягам зьніжаючаяся выбарчая актыўнасьць палякаў на апошніх выбарах! Трэба было бачыць. Але глядзець на ўсё гэта ў Беларусі даўно абрыдла.

**Сустрэча ў Дзяржаўнай Выбарчай Камісіі**

Пры сустрэчы з кіраўніком дэлегатуры Цэнтральнага Выбарчага Бюро ў Беластоку Маркам Рыбнікам давялося абмяняцца ўражаньнямі й пачуць шчырыя зьдзіўленьні тым, як магло БТ выкарыстаць яго ў якасьці відэазастаўкі для чарговай правакацыі й прапаганды перавагаў лукашэнкавай выбарчай сыстэмы над быццам бы недасканалай польскай, „празаходняй".

Ці маюць давер палякі да выбарчае сыстэмы?

У якіх выбарах удзельнічае болш палякаў?

Што зьмянілася за 15 год у гэтае выбарчае сыстэме?

Аказалася, што ніхто з суб'ектаў палітычнае прасторы Польшчы ня мае недаверу да дзейснай выбарчай сыстэмы. Таму, шчыра зайздросьціў простым палякам — яны маюцы магчымасьць свабоднага выбару, маюць рэальныя інструмэнты ўплыву на прымаемыя рашэньні.

Традыцыйна актыўнасьць палякаў на выбарах у мясцовае самакіраваньне на гмінным, павятовым і ваяводзкім узроўні значна большая. Тут 5 чалавек можа ўтварыць выбарчы камітэт, які можа быць прадстаўлены ў выбарчай камісіі шляхам адкрытай жараб'ёўкі.

Пан Рыбнік зазначыў:

— Сапраўды ў нас не існуе дэфініцыі „назіральнік", але ёсьць давераныя асобы. І яны маюць рэальна нават большыя паўнамоцтвы, чым назіральнікі ў Беларусі.

Важна, што сьпісы выбарнікаў робяцца на падставе рэестру, які напрацягу года складаецца й удакладняецца мясцовай уладаю пад кантролем камісара па выбарах і ЦВК. Грамадзяне заносяцца ў сьпісы адпаведна прапіскі, атрымаўшы бюлетэні — распісваюцца ў сьпісах. А самі выбары праводзяцца ў адзін дзень. Паліцыя не выступае інструмэнтам уціску, знаходзіцца на вуліцы й ахоўвае памяшканьні выбарчых участкаў, сочыць за правапарадкам і апэратыўна рэагуе на факты парушэньня выбарчага права з боку любога правапарушальніка.

Ці існуюць прыклады парушэньня выбарчага права ў Польшчы? Ці панёс хто-небудзь адказнасьць за падобныя правапарушэньні?

Сёньня ёсьць рэальныя прыклады, калі за парушэньне выбарчай працэдуры ў часе галасаваньня чыноўнікі панесьлі належную адказнасьць па законе.

Канкрэтны выпадак здарыўся падчас выбараў прэзыдэнта горада Плоцка. Мясцовы суд пакараў кіраўніка выбарчай камісіі за тое, што апошні перад пачаткам галасаваньня меў ужо выбарчыя бюлетэні ў вурне. Сябра камісіі даў сыгнал паліцыі, якая несла варту на вуліцы. Паліцыя зрабіла дагляд выбарчай вурны й засьведчыла парушэньне. Справа трапіла ў суд і павінная ў гэтым асоба была пакараная.

Адразу мушу засьведчыць, што для сучаснае Беларусі гэты прыклад добрая ілюстрацыя таго як міліцыя выконвае свае непасрэдныя абавязкі, супрацоўнічае з усі-

мі, хто сочыць за выкананьнем выбарчага закону, рэгіструе парушэньні, спыняе спробы фальсыфікацыі.

15 год назад, ва ўмовах несвабодных СМІ, адсутнасьці рэальнага падзелу ўладаў і незалежнай праваахоўча-судовай сыстэмы свабоднага выбару ў Польшчы, па сутнасьці, проста не існавала. Быў фарс пад назовам „выбары”. Склад выбарчых камісіяў фактычна прызначаўся выканаўчай уладаю. Не існавала свабоды выбару, бо альтэрнатывы адзінай у краіне камуністычнай партыі ўлады таксама не існавала. Вялікім дасягненьнем сёньня, праз 15 год, ёсьць тое, што людзі паверылі ў дзейснасьць мэханізмаў існуючай выбарчай сыстэмы. Кожны ведае, што за парушэньне выбарчага права існуе рэальная судовая адказнасьць.

Марк Рыбнік падкрэсьліў, што новым і найважнейшым элемэнтам дэмакратызацыі выбарчага права зьяўляюцца незалежныя выбарчыя органы, незалежныя ад усёй сыстэмы адміністрацыйнай улады.

Гэта вышэйшая Дзяржаўная Выбарчая Камісія, утвораная з 9 незалежных судзьдзяў. Цэнтральнае Выбарчае Бюро й ягоныя аддзяленьні (дэлегатуры), якія абапіраюцца на адпаведныя незалежныя суды й мясовыя ўрады.

Выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў розных партыяў (па аднаму прадстаўніку ў камісію) колькасьцю ад 11 да 17 чалавек. У скаладзе камісіяў абавязкова прысутнічаюць судзьдзі. Напрыклад, на ўзроўні ваяводзтва старшынём камісіі можа быць толькі прафэсійны судзьдзя. Акрамя таго, давераныя асобы назіраюць за працэсам галасаваньня й падліку галасоў непасрэдна. Яны могуць уносіць заўвагі ў выніковыя пратаколы выбарчых камісіяў. На ўсе заўвагі камісіі мусяць адказаць абгрунтавана й пісьмова.

Такім чынам, выбарчая сыстэма ў новым сучасным выглядзе працуе як паўнавартасны й дзейсны мэханізм саманагляду й самакантролю як знутры камісіяў, гэтак і з боку давераных асобаў (назіральнікаў). Увесь мэха-

нізм абапіраецца на незалежны суд і неад'емнае, замацаванае Канстытуцыяй РП выбарчае права, гарантыі адказнасьці любога чыноўніка перад законам за парушэньне роўнасьці, непасрэднасьці й таемнасьці працэсу галасаваньня.

І гэта дае нам сёньня гарантыі высокіх дэмакратычных выбарчых стандартаў.

Свабода СМІ, незалежны суд і рэальны кантроль над дзейнасьцю выбарчых камісіяў прадстаўнікамі розных выбарчых камітэтаў — моцныя перадумовы забесьпячэньня дэмакратчынага выбару ў Польшчы.

Палякі, у адрозьненьні ад беларусаў, не баяцца не пайсьці на выбары.

— У нас няма прымусу да галасаваньня й выбары — сапраўды свабодныя. А галасаваць можна толькі на выбарчым участку (за невялікім выключэньнем, зьвязаным са знаходжаньнем у шпіталю й кепскім станам здароўя). Гэта ў 1988-1989 гг. на выбары ў Польшчы прыходзіла ледзь ня ўсё грамадзтва. Нармальным лічылася, калі „выдавалася на-гара" лічба 97-98% прагаласаваўшых.

*Дыктатура заўсёды захапляецца лічбамі. Яны мусяць пераканаць любога, што большасьць у грамадзтве падтрымалівае дзейсны рэжым. Нешта падобнае сёньня робіцца ў Беларусі.*

*Але дзікунству тут — ня бачна межаў. Мала таго, што кожны раз праводзіцца пэрсанальны адбор і прызначаецца склад удзельнікаў усёй выбарчай пірамiды, але гэты мэханізм потым жорстка працуе на канкрэтны, заплянаваны вынік пад аховаю органаў „правапарадку". Пракуратура й міліцыя забясьпечваюць недатыкальнасьць кіраўніцтва й удзельнікаў гэтае „пірамiды". А суды проста адмаўляюцца разглядаць выбарчыя справы. Пры гэтым адміністрацыі дзяржустановаў, дзе кожны супрацоўнік трымаецца на прымусовым працоўным кантракце, літаральна зганяе „наяўны кантынгент" на „выбарчыя" ўчасткі. На маніпуляцыі ат-*

*рыманымі такім чынам бюлетэнямі застаецца каля 5 сутак, адведзеных на выбары й яшчэ некалькі пасьля агалошваньня неабходнае лічбы. Канчатковай падгонкай займаюцца ўжо „профі" з акружных камісіяў пад аховаю міліцыянтаў у саміх будынках выканкамаў. Такім чынам, рэжым мае поўную прастору для маніпуляцыяў і ўціску ў ходзе падобных „выбарчых экзекуцыяў" над уласным грамадзтвам.*

*Напрыклад, напярэдадні парлямэнцкіх выбараў 2004 г. у Беларусі назіралася вар'яцкае па нахабнасьці й цынізьме відовішча. У прамым тэлевізійным этэры, на нарадзе старшыняў выбарчых камісіяў, А. Г. Лукашэнка, як перад спалоханымі калгаснымі брыгадзірамі, кажа літаральна наступнае:*

*- Я бяру адказнасьць на сябе. А вы калегіяльна ў выканкамах прымайце рашэньні. І ні ў лева, ні ў права — выконвайце іх жалезна. У нас з вамі адна дарога. Іншага шляху — не існуе. У нас ёсьць ужо досьвед і напрацаваныя тэхналёгіі. Ідзіце й рабіце тое, што павінны зрабіць. Нам патрэбен такі вынік, каб у нашай з вамі перамозе потым ніхто ня змог сумнявацца.*

Вяртаючыся да Польшчы, калі разглядаць актыўнасьць выбарнікаў на мінулых выбарах 2005 г. (каля 43% — у парлямэнт і блізу 49% — на прэзыдэнта краіны), то тут назіраецца пэўнае зьніжэньне выбарчае актыўнасьці, што часам тлумачыцца стомленасьцю альбо расчараванасьцю выбарнікаў палітыкамі вышэйшага рангу. Але самая актыўная частка грамадзтва заўсёды бярэ на сябе выбарчую ініцыятыву й у далейшым нясе пэўную маральную адказнасьць за зьдзяйсьняемы выбар.

Ва ўсялякім разе сёньня ў людзей зьявіўся рэальны мэханізм непасрэднага абраньня ўсіх кіраўнікоў урадаў пачынаючы ад кіраўніка гміны, прэзыдэнта горада (мэра) альбо войта. Такім чынам, грамадзяне маюць рэальны мэханізм уплыву на кіраўніцтва, склад і дзейнасьць мясцовых уладаў, праграмы мясцовага разьвіцьця.

**Уся эфэктыўнасьць выбарчае сыстэмы сёньня праходзіць апрабацыю менавіта на мясцовым узроўні, дзе ўсё бачна як на далоні.**

Марк Рыбнік засьведчыў, што на прыкладзе мясцовых выбараў грамадзяне бачаць рэальную вартасьць і дзейснасьць выбарчых мэханізмаў, пранікаюцца даверам да выбарчае сыстэмы й гэты пазытыў актывізуе грамадзтва. Вельмі паказальна, калі, напрыклад, у адным Падляшскім ваяводзтве было сфармавана 2 тыс. выбарчых камітэтаў па выбарах у мясцовыя органы ўлады.

Сытуацыя са свабодным удзелам-няўдзелам у выбарах прадстаўляе магчымасьць рабіць аб'ектыўны аналіз настрояў у грамадзтве, карэктаваць праграмы, мець жывую зваротную сувязь з выбарнікамі, працаваць на карысьць далейшых пазытыўных пераменаў у грамадзтве.

Як вы лічыце, ці павялічыліся за апошнія 15 год гарантыі рэалізацыі выбарчага права для грамадзянаў Польшчы? Ці маюць палякі давер да існуючай сёньня выбарчай сыстэмы? Ці дазваляе яна ім свабодна абіраць і актыўна ўдзельнічаць у выбарчым працэсе?

Гэта пытаньне — да кожнага грамадзяніна. Выбарчую сыстэму, якая існуе сёньня, выбарнікі вельмі добра могуць праверыць у ходзе выбараў мясцовых органаў улады й мясцовага самакіраваньня. Той факт, што 5 грамадзянаў могуць засноўваць выбарчы камітэт і актыўна ўдзельнічаць на ўсіх стадыях выбарчага працэсу (зьбіраць подпісы, агітаваць, удзельнічаць у працы выбарчых камісіяў і назіраць за галасаваньнем…) зьяўляецца вельмі паказальным і станоўчым фактарам. Палякі рэальна карыстаюцца гэтым правам. Напрыклад, тры гады назад на мясцовых выбарах у Падляшскім ваяводзтве было зарэгістравана аж 2 000 выбарчых камітэтаў.

— Аднак, у першых свабодных парлямэнцкіх выбарах 1989 года ў Польшчы ўдзельнічала прыкладна 60,5% ад усіх грамадзянаў, а ў 2005 г. называецца лічба каля 41-43%.

Чаму за гэты час аб’ектыўна зьменшылася колькасьць людзей, якія ідуць на парлямэнцкія выбары?

— Гэтае пытаньне хутчэй да навукоўцаў і сацыёлягаў. Але відавочна, што пэўны пэсымізм грамадзянаў існуе ў дачыненьні да наяўнага палітычнага спэктру й самаго прадмету выбару, а не да выбарчае сыстэмы. Падобныя зьмены грамадзкіх настрояў мусяць улічвацца палітыкамі. Гэта, магчыма, яшчэ зьвязана таксама з праблемаю мэнтальных зьменаў у грамадзтве.

Каб зьмяніць мэнталітэт грамадзтва й пазбавіцца ад стэраэтыпаў мінулага, патрабуецца шмат часу. Гэтыя працэсы ідуць марудна. Навукоўцы сьцьвярджаюць, што мэнтальныя зьмены ў грамадзтве адбываюцца ня менш як на працягу трох пакаленьняў.

У выніку, ужо сёньня можна канстатаваць, што важнейшым дасягненьнем польскай выбарчай сыстэмы зьяўляецца ейная падкантрольнасьць і адкрытасьць, рэальны давер да яе грамадзянаў Польшчы.

Дэцэнтралізацыя ўлады й магчымасьць непасрэднага абраньня грамадзянамі мясцовага самакіраваньня ў гмінах, паветах і ваяводзтвах, непасрэднага абраньня войтаў, прэзыдэнтаў гарадоў (па-нашаму кіраўнікоў выканкамаў альбо мэраў гарадоў і мястэчкак) — дае магчымасьці гараджанам шырока выкарыстоўваць дзейсныя мэханізмы дэмакратчынага выбару, прымаць рэальны ўдзел грамадзянаў у фармаваньні ўлады, уплываць на яе рашэньні. Рэальны бюджэт, паўнамоцтвы й зьдзяйсьняньне мясцовай уладаю праграмы рэгіянальнага разьвіцьця, скіраванай на вырашэньне значных праблемаў у грамадзтве, прыцягваюць увагу й актывізуюць лякальныя супольнасьці й практычна ўсё грамадзтва.

Сыстэма дазваляе грамадзянам рабіць свабодны й асэнсаваны выбар, кантраляваць выбарчы працэс і ход галасаваньня да моманту падліку бюлетэняў і агалошваньня канчатковых вынікаў.

## Сустрэча ў выдавецтве „Кур’ер Паранны”

*Паказальныя жыцьцёвыя прыклады й высновы*

Я запытаўся Кшыштафа Палінскага, што зьмянілася за апошнія 15 год у выніку сыстэмных трансфармацыяў у Польшчы? І папрасіў паспрабаваць выказаць уласную пазыцыю, праілюстраваць яе на канкрэтных жыцьцёвых прыкладах, як станоўчых, гэтак і адмоўных.

Вось, што ён мне паведаў.

— Што зьмянілася? Адразу мушу пачаць з таго, што зьямнілася літаральна ўсё.

Усё — зьмянілася.

Эканоміка краіны атрымала новае разьвіцьцё, пачала працаваць у рэальных умовах рынкавай канкурэнцыі, стала адкрытай для эканомік іншых краінаў. Грамадзтва пасьля працяглага камуністычнага экспэрымэнту вярнулася да тэарэтычна нармальнага стану.

**Але, што гэта азначала для простых людзей на практыцы?**

Прывяду паказальны прыклад (гісторыя № 1):

У 1990 годзе, праз 4-5 месяцаў ад пачатку эканамічнае рэформы, распачататай пад кіраўніцтвам Лешка Бальцаровіча, спадар Кшыштаф Палінскі аднойчы быў сьведкам таго, як адзін сталы мужчына сварыўся й абураўся. Ён выглядаў вельмі незадаволеным, узрушана крычаў і лаяўся: „Што за краіна? Што за парадкі? Куды падзеўся парадак?” Аказалася, што ён быў ужо ў чацьвёртай краме. І ў кожнай краме адзін і той жа від сыру меў розны кошт. Гэты чалавек ня мог патлумачыць гэтую зьяву й наогул зразумець як такое можа быць. У такіх варунках ён адчуваў сябе пастаянна падманутым і прыніжаным.

Гэта ёсьць клясычны прыклад таго як чалавек нечакана з аднаго становішча, дзе ўсё гарантавана дзяржаваю, усё спакойна й зрадумела, раптам пераносіцца ў іншае, дзе працуюць правілы рынкавай эканомікі.

**Што гэта азначае насамрэч?**

**Выснова простая й відавочная — новая эканамічная сыстэма забрала ў простых людзей пачуцьцё бясьпекі й стабільнасьці.**

Яшчэ адзін прыклад (гісторыя № 2):

Атрымалася так, што я зьявіўся сьведкам бізнэсовай кар’еры адной 19-гадовай асобы.

У сакавіку 1990 года кожны дзень на сьвітанку, з самага ранку, калі яшчэ даволі халодна, яна стаяла на вуліцы з адной скрыняю, з маленькімі шалямі й гандлявала яблыкамі. Праз некаторы час яна была ўжо з двума-трыма скрынямі. Восеньню ў яе зьявіўся латок. Акрамя яблыкаў, яна гандлявала ўжо й іншай садавінаю.

У 1991 годзе я выпадкова сустрэў гэтую-ж дзяўчыну, у якой год назад на вуліцы набываў яблыкі. Яна была ўжо уладальніцай касмэтычнае крамы. Яна пазнала мяне. У размове высьветлілася, што цяперашнія ўмовы працы яе цалкам задавальняюць. Яна з гонарам адзначала, што шмат чаго здолела зрабіць, каб палепшыць уласныя ўмовы працы. У краме было цёпла й прыгожа, у ёй працавалі яшчэ дзьве дзяўчыны. А маладая гаспадыня ўжо зарабіла неабходныя сродкі й пачала атрымліваць вышэйшую адукацыю.

Дзьве гэтыя гісторыі вельмі паказальныя для сытуацыі, калі была ўведзена рынкавая сыстэма. З аднаго боку — сталы мужчына, які згубіў пачуцьцё бясьпекі й перастаў разумець правілы новага парадку, які абрынуўся на яго. З другога боку — гісторыя маладой дзяўчыны, якая пачынаючы са скрыні яблыкаў за год стала ўладальніцай маленькае крамы. Гэта не азначае, што яна пазбавілася ад усіх праблемаў. Не, гэтага не адбылося. Проста зьмяніўся характар праблемаў. Канешне, ужо не было холаду, цяжкай фізычнай працы... Але зьвіліся цяжкасьці з падаткамі, канкурэнцыяй, кліентамі, недахопам часу...

Зьмянілася якасьць і зьмяніўся ўзровень праблемаў.

Але дзяўчына — маладая. Яна гатовая ісьці наперад, гатовая працаваць і навучацца, каб адпавядаць новым

патрабаваньням жыцьця. Адваротныя прыклады, былі-б у дачыненьні да сталых людзей, альбо ў дачыненьні да тых, каму па розных прычынах не ўдалося зрабіць уласную бізнэсовую кар’еру. А такіх людзей у Польшчы, на жаль, дастаткова шмат. Няўдалы досьвед прадпрымальніцтва ў пачатку пакінуў нэгатыўны сьлед у сьвядомасьці гэтых людзей.

**У гэтых умовах, у параўнаньні зь іншымі, працаўнікі бюджэтнае сфэры мелі мінімальныя магчымасьці для павелічэньня сваіх заробкаў, для павышэньня якасьці й узроўню ўтрыманьня ўласных сем’яў.**

У пачатку 1980-х гадоў, калі пан Кшыштаф Палінскі пачынаў працаваць выкладчыкам, ён атрымліваў штомесяц сярэдні заробак ад узроўню, які існаваў па краіне. А ў 1991 годзе, калі ён ужо выкладаў ва ўнівэрсытэце, ягоны заробак складаў толькі 1/3 ад сярэдніх заробкаў па краіне. І, каб дасягнуць хаця-б гэтага сярэдняга ўзроўню, ён быў вымушаны працаваць дадаткова ў іншых месцах.

Былі цяжкасьці й у прадпрыемстваў, фірмаў, якія працягвалі працаваць па інэрцыі, па старому, якія ня здолелі адаптавацца да запатрабаваньняў рынку. У 1990-1991 гг. яны згубілі свае асноўныя рынкі збыту, бо 90% вытворчасьці працавала на рынак СССР. Падобныя прадпрыемствы мелі велізарныя вытворча-складзкія плошчы, выраблялі неабгрунтавана вялікія аб’ёмы прадукцыі, якая мела кепскую якасьць і была неканкурэнтаздольнай на іншых рынках.

Адна з падобных фірмаў, на якой сёньня працуе 1 000 рабочых, вырабляе кепскай якасьці тканіну для вайсковай вопраткі для ўнутранага спажываньня.

Яшчэ адзін прыклад — фірма „Uchwyty”. На прыкладзе гэтае фірмы можна ўбачыць, як адно з польскіх прадпрыемстваў, што выпускала 75% прадукцыі на ўсходнія рынкі, у 1991 годзе згубіла практычна ўсе свае заказы. Раней там працавала 6 000 рабочых. А зараз — 600-800

чалавек. Гэтая фірма сёньня вырабляе розныя дробныя рэчы й рэалізуе іх на нацыянальным рынку.

Сам спадар Кшыштаф Палінскі сёньня ўзначальвае выдавецтва, якое складаецца з двух газэтаў і тыпаграфіі. Разьвіцьцё выдавецтва само зьяўляецца цікавым і відавочным прыкладам рэструктурызацыі прадпрыемстваў у Польшчы, прыкладам выкарыстаньня новымі інвэстарамі нерэнтабэльных вытворчых плошчаў былых фірмаў і рэшткаў гэткай спэцыфічна савецкай зьявы як даўгабуд.

Для газэты „Кур’ер Поранны” спадаром Палінскім была пабудаваная тыпаграфія на месцы былога малаказавода, што пачынаў будавацца напрыканцы 1980-х гадоў. Але гэты гігантычны комплекс так ніколі й не працаваў. Разьлік паказаў, што каб задзейнічаць усе вытворчыя магутнасьці гэтага завода, трэба было-б завозіць для апрацоўкі малако з усяе тэрыторыі Польшчы. Тэрыторыя прадпрыемства займала 24 га й найвялікшым будынкам на ёй быў склад бутэлек з-пад малака плошчаю каля 4 000 квадратных мэтраў.

Меркавалася, што гэта дапаможа вырашыць існуючую тады ў Польшчы праблему зваротнага выкупу й абароту шкляной тары. Але ў 1991 годзе высьветлілася, што малако ў бутэльках ніхто не набывае, бо зьявілася больш зручная й эканамічная сучасная ўпакоўка.

Сытуацыя з малаказаводам добра ілюструе той стан, у якім раптоўна аказалася практычна ўся Польшча. Болшасьць палякаў працавала на падобных вытворчасьцях, якія не выраблялі анічога карыснага, запатрабаванага рынкам.

Але зараз на тэрыторыі гэтага завода зьявілася новая выдавецкая фірма. І гэта ёсьць натуральным працэсам у цяперашніх умовах рынкавай эканомікі. Дарэчы, рынак прэсы ў Польшчы зноў ажывае, ён ужо пераарыентаваны на новую сучасную якасьць паліграфіі, на рэальную свабоду слова, прафэсійную журналістыку й ін-

тэнсыўны інфаабмен, на новыя чытацкія аўдыторыі, якія таксама пачынаюць даволі істотна пашырацца. Паступова, крок за крокам, павялічваецца ўзровень адукацыі й прадпрымальнасьці палякаў. Яны пачынаюць больш чытаць. І гэта аб’ектыўна — вельмі станоўчы, пазытыўны працэс.

Такім чынам, як мы бачым на ўласныя вочы, для таго, каб адпавядаць новым умовам разьвіцьця, працаваць па законах спажывецкага попыту ва ўмовах рынкавай эканомікі, прадпрыемствы ў Польшчы, як і ў прыкладзе зь людзьмі, мусілі знайсьці свае нішы й свой асартымэнт тавараў, зрабіць працэс вытворчасьці новых тавараў аптымальным, зарыентаваным на адпаведныя плацежаздольныя рынкі збыту.

Падобная трансфармацыя, пераарыентацыя на новыя віды і новую якасьць тавараў, іншыя ўмовы працы дыктуецца законамі свабоднага рынку й уяўляе ўжо сучасны ўзровень, якасна новы стан усёй польскай эканомікі.

Так, безумоўна, працэс рэструктурызацыі й санацыі прадпрыемстваў, выхад на новыя тавары й актыўныя маркетынгавыя тэхналёгіі быў і застаецца заканамерна неабходным працэсам. Але, гэты працэс адначасна выклікае значнае скарачэньне рабочых месцаў. Узьнікае праблема росту беспрацоўя.

Таксама відавочна, што ў часе актыўных трансфармацыяў дзяржава мусіць прадбачыць падобныя цяжкасьці пераходнага пэрыяду й своечасова запусьціць адпаведныя праграмы рэабілітацыі й перападрыхтоўкі вызваляемага з падобных нерэнтабэльных прадпрыемстваў пэрсаналу. Людзей трэба падтрымаць матэрыяльна, дапамагчы ім авалодаць запатрабаванымі рынкам спэцыяльнасьцямі, даць ім новы шанец знайсьці сваё месца ў новых рынкавых умовах.

Туды, дзе ёсьць кваліфікаваныя працоўныя кадры й спрыяльны інвэстыцыйны клімат, прыходзіць інвэстар, ствараюцца новыя працоўныя месцы, вырашаецца праб-

лема беспрацоўя й назіраецца рэальны рост жыцьцёвых стандартаў. Таму, любой краіне, у тым ліку й сучаснае Польшчы, як паветра патрэбен дастатковы прыток інвэстыцыйнага капіталу, адкрыцьцё новых фірмаў і прадпрыемстваў, новых працоўных месцаў. Узровень заробкаў і ўмовы працы будуць таксама няспынна расьці. Гэтым шляхам прайшлі многія нашыя суседзі. Сёньня гэта ня толькі геаграфічна, але й цывілізацыйна, новыя эўрапэйскія краіны.

Пан Кшыштаф Палінскі паведаў пра цікавае дасьледаваньне хатніх гаспадарак, якое праводзілася напрыканцы 1990-х гадоў у Польшчы, у часе якога апытваліся сем’і, якія маюць аднаго альбо двух беспрацоўных.

Аказалася, што 97% падобных сем’яў мае каляровыя тэлевізары, 80% — відэамагнітафоны й пральныя аўтаматычныя машыны, 20% — аўтамабілі. Гэтыя людзі ня маюць дастаткова грошай і ня маюць працы. Але яны хочуць мець шмат таго, што ёсьць у іншых людзей. І гэта — натуральна. Людзі хочуць жыць лепей.

Адначасова яны бачуць вялікую розьніцу ў заробках і ўзроўні жыцьця па краіне. Адны працуюць за 1 000 зл. у месяц, другія — за 5 000 зл., іншыя — за 50 000 зл. Напрыклад, мэнэджэр буйнога банку зарабляе штомесячна 650 000 зл. (200 000 USD).

І людзі гэта ўсё бачаць у газэтах, па тэлевізіі.

Яны робяць высновы, што жывуць усё горш і горш, бо адчуваюць сябе жабракамі ў параўнаньні з падобнымі прыкладамі розьніцы ў даходах і ўзроўню жыцьця.

Штотыднёвік „Палітыка” робіць штогадовы аналіз колькі неабходных рэчаў можна купіць на сярэдні заробак у Польшчы. Досьледы праводзяцца з канца 1980-х гадоў.

У гэтым аналізе вельмі добра бачна розьніца ў даходах звычайнай польскай сям’і ў канцы 1980-х гадоў і цяпер. Тая розьніца на асноўны спажывецкі кошык тавараў зараз складае 2,5-3 разы. І гэтая тэндынцыя росту

захоўваецца. Але ўяўленьні палякаў пра тое, што яны хочуць, што яны мусяць мець — растуць яшчэ хутчэй.

Такім чынам рост спажывецкіх патрэбаў і адпаведных чаканьняў у грамадзтве, што стымулюецца рынкам, розьніцай заробкаў і свабодным інфаабменам, значна перавышае сёньня рост рэальнага сярэдняга ўзроўню жыцьця.

І гэта, на маю думку, ёсьць асноўнай тэзаю, аб'ектыўнай высноваю, якая мусіць быць пакладзеная ў аснову любых будучых плянаў мадэрнізацыі й разьвіцьця эканомікі, далейшага павелічэньня жыцьцёвых стандартаў у краіне, пашырэньня й умацаваньня пазыцыяў сярэдняе клясы ў грамадзтве...

І гэта таксама тычыцца сфэры адпаведных мэнтальных зьменаў, узроўню адукацыі й магчымасьцяў творчай самарэалізацыі ў сучасным польскім грамадзтве.

Некалькі дзесяцігодзяў палякі жылі ў нейкім летаргічным паўсьне.

Спадар Кшыштаф Палінскі памятае ў 1960-х гадох гэткі „стабільны камунізм". Было дастаткова тавараў і прадуктаў. Людзі ня бачылі вялікай розьніцы ва ўзроўні жыцьця. Але рэальна былі жабракі, праблемныя сем'і, алькаголікі, хворыя... Канешне, былі й заможныя людзі. (У адрозьненьні ад рэспублікаў СССР у Польшчы нават тады існаваў прыватны бізнэс, а сельская гаспадарка мела толькі каля 20% калгасаў і саўгасаў. Але ў газэтах і на тэлебачаньні не было відаць багацьця. Дробных вытворцаў, рамесьнікаў, якія выраблялі нешта й маглі зарабіць больш за астатніх моцна кантралявалі, каб яны нянадта шмат „высоўваліся".

— У 60-х гадах было вельмі папулярным і нэгатыўным слова „спэкулянт". Калі я запытаўся ў сваёй 23-гадовай дачкі хто такі спэкулянт, яна адказала, што ня ведае. Калі я патлумачыў ёй, што ў мінулым спэкулянтамі называлі тых, хто набываў тавары па танных коштах, а потым, недзе ў іншым месцы, прадаваў іх даражэй, яна не магла зразумець, што ў гэтым кепскага.

Сапраўды, камэрцыя — пабудаваная на законах рынку. Кошт тавару ўсталёваецца ў адпаведнасьці з наяўнай рынкавай кан'юнктураю, попытам і прапановаю. Недахоп тавару, дэфіцыт, павялічвае попыт і абумоўлівае адносна вышэйшыя ўзроўні коштаў. Такім чынам, пры насычэньні рынку неабходнымі таварамі дэфіцыт зьнікае, бо тавары імкнуцца туды, дзе іх можна прадаць даражэй, дзе на іх існуе павялічаны попыт. Калі рынак ураўнаважвае попыт і прапанову, зьнікае й значная розьніца ў коштах.

Зьмены цывілізацыйныя, узаемазьвязаныя з эканамічнымі зьменамі. Аднак, мэнтальныя зьмены могуць наступіць толькі з часам і ростам узроўню адукацыі ў грамадзтве. З гэтага вынікае, што сфэра адукацыі ёсьць абсалютным прыярытэтам і важнейшым чыньнікам для прагрэсыўнага разьвіцьця грамадзтва.

Кшыштаф Палінскі зазначыў, што на пачатку 1990-х у Польшчы было 6-7% людзей з вышэйшай адукацыяй. У той самы час Беларусь і Літва мелі прыкладна па 20%, Фінляндыя — 30%.

Зараз у Польшчы гэты паказчык павялічыўся да 10-11%. Але ў Літве ён складае ўжо 35%, у Фінляндыі — 40%. Зараз у польскім грамадзтве нарастаючымі тэмпамі павялічваецца колькасьць людзей, што ідуць атрымліваць вышэйшую адукацыю ў ВУЗы.

Пры гэтым, у 1990-х гадах самымі папулярнымі спэцыяльнасьцямі лічыліся маркетынг, мэнэджмэнт, бізнэс і эканоміка. А з 2000 года прыярытэты зьмяніліся. Цяпер самымі папулярнымі ёсьць сацыялёгія й псыхалёгія. На гэтыя спэцыяльнасьці конкурс сягае аж да 60-70 чалавек на адно месца.

На думку аўтара, уяўляецца натуральным, што для забесьпячэньня працэсу пераходу колькасьці тавараў у новую якасьць і адраснасьць прапановаў патрабуюцца новыя ўмовы й веды пра спажыўца. Новыя віды тавараў маюць неабходнасьць у адпаведнай якаснай рэкляме, у фармаваньні новай спажывецкай нішы для па-

велічэньня аб’ёмаў вытворчасьці й шырокай рэалізацыі гэтых тавараў ва ўмовах часовага зьніжэньня канкурэнцыі... Рост рэнтабельнасьці й эфэктыўнасьці бізнэсу ў падобных умовах забясьпечвае ўмацаваньне канкурэнтных пазыцыяў фірмы на рынку, рост папулярнасьці ейнага брэнду сярод спажыўцоў.

Такім чынам, маючы дастатковы досьвед вывучэньня рынкавай кан’юнктуры, спосабаў кіраваньня й дзейнасьці ва ўмовах эканамічных заканамернасьцяў, фірмы сутыкнуліся зь неабходнасьцю „прасоўваньня тавараў” і „фармаваньня спажывецкага рынку”, неабходнасьцю ўлічваць вельмі важкі складнік — людзкі фактар.

Ён выйшаў на першае месца й сёньня кожны разумее, што не дадстаткова нешта вырабляць, трэба дакладна ведаць што, калі й у якой колькасьці вырабляць, у якім выглядзе й па якіх коштах прапаноўваць, як распавесьці пра тавар так, каб гэта пачулі патэнцыйныя пакупнікі — трэба ведаць чалавека, спажыўца, супрацоўніка фірмы й г.д.

Кшыштаф Палінскі, які добра ведае прадмет размовы, спасылаючыся на лічбы й факты вельмі яскрава паказваў рэальны стан рэчаў, які тычыцца розных аспэктаў сацыяльна-эканамічнага й мэнтальнага стану грамадзтва ў параўнаньні зь мінулым.

Ён нагадаў, што ў 1990-х гадах у Польшчы было 54 тысяч фірмаў. Пры гэтым 50 тысяч фірмаў былі ўтвораныя з аднаго чалавека. Гэткая колькасьць людзей прайшла своеасаблівую практыку, школу прадпрымальніцтва. У тых, у каго нічога не атрымалася ў выніку, як мінімум таксама застаўся базысны ўзровень ведаў.

Аказваецца, Польшча была адзінай краінай сацыялістычнага блёку, у якой заўсёды працавалі фэрмэры. У сельскай гаспадарцы было занята каля 38% працаздольнага насельніцтва. Сёньня — гэта 18%.

У сучаснай сфэры вытворчасьці Польшчы працуе 40% усяго занятага насельніцтва. І гэта вельмі шмат. Напры-

клад, гэты паказчык у ЗША — блізу 16%. За акіянам у сфэры паслугаў працуе аж 84% занятага насельніцтва.

Колькасьць маладых палякаў ад 18 гадоў сёньня складае каля 30 млн. чалавек. Афіцыйна працуючых у краіне — 13,5 млн. чал., альбо 34% грамадзянаў Польшчы. Яны ўтрымліваюць усе 100% палякаў.

Аказваецца, гэткая прапорцыя існуе й у 20 краінаў, лідараў сусьветнай эканомікі. Але ў Польшчы маецца 8 млн. непрацуючай моладзі ўзростам да 18 гадоў, а таксама каля 9 млн. пэнсіянераў і інвалідаў, 3 млн. — беспрацоўных... I кожны атрымлівае штомесячную пэнсію, дапамогу па беспрацоўю й сацыяльную дапамогу.

Такім чынам, сёньня ў Польшчы на аднаго працуючага прыходзіцца адзін беспрацоўны працаздольнага веку ад 18 да 68 гадоў. Такая-ж сытуацыя назіраецца, напрыклдад, і ў Нямеччыне. Але нацыянальны даход у разьліку на аднаго жыхара ў Нямеччыне — у 10 разоў большы, чым у Польшчы.

Так, безумоўна, палякі імкнуцца да сусьветных стандартаў. Яны маюць шмат амбіцыяў, жаданьняў. I мару — жыць, напрыклад, як у Нямеччыне.

Але менавіта зь немагчымасьцю хуткага росту ўзроўню жыцьця й рэалізацыі гэтае мары зьвязана больш за ўсё расчараваньняў у Польшчы. Для дасягненьня высокіх сацыяльна-эканамічных стандартаў аб’ектыўна трэба шмат чаго зрабіць, шмат працаваць, патрэбен значны запас часу.

Паказальна, што сёньня ў Польшчы цяжка знайсьці рабочых за 1 000 зл. I гэта тлумачыцца тым, што беспрацоўны тут атрымлівае 450-500 зл. наяўнымі. Пры гэткіх заробках, з улікам выдаткаў на дарогу да працы, ежу (каля 200-300 зл.), у яго рэальна заставалася-б 700-800 зл. У такіх варунках розьніца з дапамогай па беспрацоўю складае толькі 250-300 зл. Аднак, за такія грошы мала хто з палякаў адмовіцца ад свайго беспрацоўнага статусу.

Акрамя таго, у Польшчы працуе нелегальна каля 2,5 млн. мігрантаў: беларусаў, украінцаў... Толькі ў адной Варшаве з 2 млн. жыхароў маеца 30-40 тыс. апякунак дзяцей, сядзелак. Пры гэтым вельмі цяжка знайсьці апякунку з заробкам меншым за 1,5 тыс. зл.

З аднаго боку, у Польшчы назіраецца высокі ўзровень беспрацоўя — да 18%. З другога, можна сказаць, што актуальнасьць гэтае тэмы для саміх беспрацоўных палякаў ня надта вялікая.

Гэта вынікае з праведзеных у жніўні 2005 г. сацыялягічных досьледаў. Так, беспрацоўным было прапанавана абраць адзін з трох варыянтаў адказу ў анкеце.

Я гатовы на:

— любую працу;

— любую працу, якая добра аплачваецца;

— любую добра аплачавемую працу, пры ўмове, што яна будзе адпавядаць майму ўзроўню адукацыі й маштабу.

Аказалася, што на апошняе пытаньне адказала 90% рэспандэнтаў. Таму, можна зрабіць выснову, што беспрацоўе для большасьці апытаных — ня надта актуальная зьява.

У Польшчы, як і паўсюль у сьвеце, існуе й своеасаблівы пляст маргіналаў.

Прыклад з двума беспрацоўнымі аматарамі алькаголю, якія звычайна „ашываюцца” ля вясковае крамы й практычна заўсёды на падпітку — яшчэ адно цікавае назіраньне ў гэтае сфэры. Калі да аднаго зь іх аднойчы падышоў гаспадар лецішча й прапанаваў зрабіць канкрэтную працу за добрыя грошы, ён вылаяўся й адмовіўся. Яго, аказваецца, нават абразіла падобная прапанова. Для гэткіх асобаў больш важкім ёсьць пачуцьцё роўнасьці ў сваім, практычна дэклясыяваным асяродзьдзі, у асяродзьдзі сваіх паплечнікаў-сабутэльнікаў. І калі нехта „купіцца” на „спакусу” зарабіць грошы, ён аўтаматычна рызыкуе парушыць закон „зоны” й згубіць

давер у астатніх. Таму ён ня можа раптам стаць лепшым за сваіх „братоў па сьветапоглядзе” й такім чынам — ім здрадзіць. Ім утульна ў сваім асяродзьдзі, у сваім замкнёным сьвеце. Яны нічога ня хочуць мяняць у сваім уласным жыцьці.

Пры гэтым, сацыёлягі адзначаюць, што 20-30% палякаў проста ня могуць знайсьці сваё месца ў жыцьці. Для іх ёсьць вялікім пытаньнем, што з сабою рабіць і чым займацца?

Іншая вялікая група — гэта тыя, што жывуць у вёсках і зарабляюць малыя грошы. Але яны ня ў стане нічога зрабіць, каб якасна зьмяніць сваё жыцьцё да лепшага. Яны проста жывуць ілюзіямі, хочуць зарабіць, але адразу вялікія грошы. Менавіта людзі з гэтага асяродзьдзя маюць менш дастаткаў альбо зьяўляюцца беспрацоўнымі. Яны вельмі часта трапляюць у сытуацыі самападману й наступнага расчараваньня.

Цяперашняе польскае грамадзтва адкрыта й шмат кажа пра карупцыю. Людзі асэнсавалі гэтую праблему й імкнуцца як мага хутчэй ад яе пазбавіцца. 15 год назад практычна нічога не рабілася без хабару. Карупцыя была як бы правілам жыцьця. Зараз карупцыя — гэта калі нехта скраў мільён злотых, альбо калі лекар бярэ хабар за апэрацыю. А раней хабар давалі для таго, каб, напрыклад, проста набыць мяса ў краме. І то не была карупцыя. Гэта рабілі для таго, каб пражыць. Зараз людзі хочуць пазбавіцца падобнай заганнай традыцыі нешта даваць камусьці дзеля таго, каб атрымаць належнае па законе.

Хуткія трансфармацыі ў эканоміцы вельмі небясьпечныя для асноваў грамадзкай маралі. Людзі, што трапілі ў новыя для сябе ўмовы, не вытрымліваюць выпрабаваньня рынкам. Яны як бы пачынаюць раптам губляць натуральныя для іх у мінулым шляхетныя якасьці. Яны пачынаюць зайздросьціць і імкнуцца за прыбыткам любымі сродкамі, імкнуцца зарабіць адразу шмат „лёгкіх

грошай”. Яны бачуць вакол багацьце й ім падаецца, што ўсе зарабілі свае сродкі падобным чынам.

Але прыклад з дзяўчынаю, якая пачынала цяжка працаваць і зрабіла пасьяпховы бізнэс, адкрыла ўласную краму, пачала вучыцца.

А іншыя людзі думалі, што яны таксама працавалі цяжка, аднак не зарабілі сабе на краму. Як тады, гэтак і зараз трэ проста выкарыстаць момант і знайсьці ўласную нішу.

Напрыклад, калі ёсьць магчымасьць набыць у Беларусі цэмэнт і прадаць яго тут, то можна зарабіць вялікія грошы. Калі нехта ўбачыць гэта з боку, падумае, што столькі грошай немагчыма зарабіць так хутка. Гэта азначае, што грошы былі скрадзеныя. І сапраўды, каб купіць цэмэнт у Беларусі на экспарт, трэба даць хабар. І другі раз хабар трэба даць тут, каб прадаць цэмэнт у Польшчы.

Як на прыкладзе гэтай сытуацыі, людзі бачаць, што адны хутка зарабляюць вялікія грошы, а другія зарабіць нічога ня могуць. Самае простае, што прыходзіць у галаву, што гэта ёсьць парушэньне закону й карупцыя. І часткова так яно й ёсьць. Але, таксама вельмі часта ёсьць і тое, што цяжкай працаю па 16 гадзінаў у суткі чалавек дасягае сапраўднага посьпеху. Толькі гэта для большасьці цяжка зразумець, бо мы й надалей працягваем жыць пад уплывам „камуністычнае зоны”, якая давала нам пачуцьцё бясьпекі. Было адчуваньне, што ўсе мы больш-менш аднолькавыя.

Уладыслаў Гамулка быў 13-14 гадоў першым сакратаром партыі ў Польшчы й зболшага вызначыў мысьленьне палякаў. Напрыклад, мэнтальнасьць бацькоў. Гэта быў авантурны чалавек. Ён часта рабіў рэвізіі, перасьледваў партыйцаў за тое, што яны багацелі...

Крыніцаю пратэстаў у 1970-х гадох было ня тое, што палякам кепска жылося, але тое, што некаторыя партыйцы жылі вельмі й вельмі заможна. Яны мелі магчымась-

ці выезду за мяжу, мелі спэцыяльныя крамы, усемагчымыя ільготы й прывілеі… Гэткая несправядлівасьць была бачная людзям. І тады было ўсё проста. Было вядома, хто ва ўсім вінаваты. Гэта — партыя ўлады й ейныя дзеячы.

Сёньня няма партыі, няма дзеячоў партыі, зьмянілася сыстэма. Але й зараз ёсьць тыя, што зарабляюць вельмі шмат, і тыя, што зарабляюць вельмі мала. І людзі задаюць сабе пытаньне: „Хто ў гэтым вінаваты?" І ў асноўным такія пытаньні сабе задаюць людзі сталыя, бедныя, малаадукаваныя й пакрыўджаныя. Яны не разумеюць гэтага сьвету, адчуваюць, што ён для іх небясьпечны. Яны пачынаюць зайздросьціць і злуюцца на тых, у каго ўсё атрымліваецца іначай, хто можа ўдала выйсьці з сытуацыі, хто мае посьпех.

Ёсьць вялікая бездань паміж маладымі людзьмі, якія жывуць у розных умовах.

У вялікім горадзе малады чалавек ходзіць у ліцэй, вучыцца у добрых настаўнікаў. Ягоныя бацькі працуюць і добра зарабляюць. У яго ёсьць кампутар з пастаянным доступам у інтэрнэт. Ён ходзіць на выставы, у тэатар і кіно. Ён мае магчымасьць вучыць дадаткова яшчэ 2-3 мовы. І вымяральнікам ягонага посьпеху ёсьць тое, што потым ён ідзе вучыцца ў Оксфард ці Гарвард.

Так, некалькі соцень тысячаў палякаў сёньня вучацца за мяжою.

І другі малады чалавек, якому таксама 17-18 год. Але ён жыве ў малым гарадку, дзе раней быў калгас ці саўгас. Ён ня ходзіць у ліцэй, бо ня мае на гэта грошай. Ягоныя бацькі не працуюць, атрымліваюць дапамогу па беспрацоўі й маюць выпадковыя нелегальныя заробкі. Кампутар ён бачыў пару разоў у жыцьці. У школе слабыя настаўнікі. Інтэрнэту ён можа й зусім ня бачыў. Але ён таксама бачыць тэлевізар. Ён бачыць чыйсьці посьпех. І ён, магчыма, гэткі-ж здольны малады чалавек. Але з самага пачатку яму наканавана жыць у горшых умовах і застацца за мяжою посьпеху.

І сотні тысячаў маладых людзей у Польшчы жывуць у падобных умовах.

Менавіта з гэтага асяродзьдзя маладыя людзі збольшага трапляюць у нацыянал-фашыстоўскія групоўкі й адпаведны ўплыў. Гэта яны, пакрыўджаныя жыцьцём, могуць спагнаць сваю злосьць у нападах на турыстаў, зьбіцьці замежных студэнтаў...

І гэта таксама вялікая праблема ў Польшчы. Праблема ў тым, каб бедным дзецям кожны дзень даць цёплую ежу, каб даць ім стыпэндыю для нармальнага вучаньня, даць ім шанцы для таго, каб вырвацца з-за мяжы жабрацтва й азлобленай бездапаможнасьці.

Вельмі абнадзейвае, што на працягу апошняга году ў Польшчы на вырашэньне гэтае праблемы пачалі ісьці вялікія сродкі. Шматдзетныя семьі атрымліваюць на кожнага юнака ад дзяржавы па 30 даляраў на кніжкі, падручнікі й школьную форму. Бяз гэтых малых сродкаў дзеці проста не маглі-б вучыцца. Менавіта гэтыя дзеці зьяўляюцца надзеяй для зьмены сытуацыі, бо іхныя бацькі ўжо проста няздольныя мяняцца й адаптоўвацца да новай сыстэмы.

Акрамя таго ў Польшчы разьвіваецца сыстэма стыпэндыяў. Гэтым займаецца грамадзянская супольнасьць, ейныя ініцыятыўныя людзі. І з году ў год іх становіцца ўсё больш і больш.

У Кшыштафа Палінскага ёсьць знаёмы ксёндз, які стварыў таварыства, у якім займаюцца дзеці з маламаёмасных сем’яў. Ён дапамагае ім зь лекцыямі, падручнікамі, дае цёплую ежу, адзеньне. У гэтым годзе каля 2 000 дзяцей выехалі па адпачынак на мора. Для шмат каго зь іх гэта былі першыя падобныя вакацыі.

І людзі ахвотна даюць грошы на падобныя рэчы. У гэтым годзе ксёндз сабраў на падобную дабрачынную дзейнасьць ужо больш за 2 млн. зл. І ён ужо навучыў сотні маладых людзей, якія аддаюць свой свабодны час на дапамогу дзецям.

Назіраецца новая для Польшчы сытуацыя, калі ўзьнікаюць і актыўна працуюць малыя фонды па дапамозе дзецям, няўрадавыя ініцыятывы й арганізацыі. У асноўным у іх працуюць маладыя людзі — таксама нашыя дзеці.

Такім чынам, можна заўважыць, што ва ўмовах вялікай розьніцы ў даходах і існуючай праблемы ў грамадзтве дзейнічае свабода СМІ й асацыяцыяў, разьвіваецца адкрытая грамадзянская супольнасьць. А дабрачынна-выхаваўчая, адукацыйная дзейнасьць НДА й грамадзянскіх ініцыятываў, прыватных фондаў — становіцца дзейсным інструмэнтам актывізацыі грамадзтва на вырашэньне існуючых праблемаў.

**Кшыштаф Палінскі аб палітыцы ў Польшчы**

Распавядаючы аб нюансах палітчынае сфэры й параўноўваючы сёньняшні стан з 15-гадовым мінулым, актыўны ўдзельнік пераменаў і польскай „Салідарнасьці” Кшыштаф Палінскі распавёў пра свае назіраньні, выказаў нечаканыя і, як падаецца, вельмі істотныя для Беларусі высновы.

Так, самае цікавае ў польскай палітыцы, што ўсе перамены, уся трансфармацыя, што адбылася ў Польшчы была зьдзейсьнена дзякуючы меншай, але арганізаванай і актыўнай часткі грамадзтва.

У 1989 годзе адбыліся першыя свабодныя выбары ў Польшчы. У іх удзельнічала 60,5% грамадзянаў. За „Салідарнасьць” галасаваў 61% тых, хто прыйшоў да выбарчых участкаў, альбо 34% ад агульнай колькасьці выбарнікаў у краіне. Такім чынам, існуе міт аб тым, што большыня людзей у Польшчы хацела рэвалюцыі й пераменаў.

У 2005 г. на парлямэнцкіх выбарах у Польшчы ўдзельнічала каля 46% выбарнікаў. Партыя ПіС (Права й Справядлівасьць — лідар Яраслаў Качынскі) атрымала 26,5%, Грамадзянская Плятформа (лідар Дональд Туск) — 24%. Сумарна гэта 50,5%. Разам зь іншымі прадэмакратычнымі партыямі, якія атрымалі 3,5%, можна лічыць, што за дэмакратычны выбар прагаласавала

54% ад тых, што прыйшлі на выбары. Атрымліваецца, што на апошніх парлямэнцкіх выбарах у Польшчы з тых, хто мае права голасу толькі каля 25% прагаласавалі за дэмакратыю. Калі ўлічыць яшчэ некаторыя дробныя партыі, якія падобныя на дэмакратаў, то цалкам атрымалася б каля 30%.

Такім чынам, прыходзіцца канстатаваць, што на працягу 15 гадоў у гэтым пытаньні мала што зьмянілася.

Рэальныя лічбы сьведчаць, што 2/3 ці 66% людзей у Польшчы ў 1989 годзе альбо не галасавала за „Салідарнасьць", альбо зусім не галасавала.

Высноваю ёсьць тое, што рэвалюцыі заўсёды робіць актыўная й арганізаваная меншасьць пры маўклівай згодзе большасьці. Польшча тут — яскравы прыклад.

Напрыканцы двухгадзіннай сустрэчы, я задаў пану Палінскаму апошняе пытаньне.

— Як бы Вы асабіста, адзін з актыўных удзельнікаў пераменаў у краіне, адным словам сфармулявалі-б найважнейшы вынік той сыстэмнай трансфармацыі, якая адбылася ў Польшчы за апошнія 15 год? Адным словам назваць тое, што зьявілася сёньня. Чаго не было й не магло быць у мінулым.

Адказ быў імгненым, цьвёрдым і ўпэўненым. Было бачна, што Кшыштаф Палінскі абсалютна дакладна ведае, за што змагаліся ягоныя сябры, што зьяўляецца сапраўднай каштоўнасьцю для яго самога й ягонай краіны.

— Шансы. Шансы, якія зьявіліся для ўсяго народу, для кожнага чалавека. Гэта тыя магчымасьці, што рэальна зьявіліся ў нашых дзяцей, у новых пакаленьняў палякаў. Шансы ўплываць на сваё жыцьцё й жыцьцё ўласнай краіны, быць незалежным народам і будаваць узаемавыгодныя стасункі зь іншымі народамі такім спосабам, які толькі ад нас залежыць — праз кантакты й узаемадзеяньне, узаемапавагу й працу дзеля лепшае будучыні.

Вельмі цяжка мець свабоду й навучыцца быць сапраўды вольнымі. Але яшчэ цяжэй, мы гэта добра ве-

даем, назаўсёды пазбавіцца свабоды ў абмен на пачуцьцё бясьпекі, якую можа нехта гарантаваць на тэрыторыі абмежаванай свабоды — на „зоне”. Таму, хто жыве ў гэткай „зоне” ня трэба надта думаць як правесьці час. У такой „зоне”, у такім ладзе, жыцьцё ідзе па вызначаным не табою раскладзе, там атрымліваюць ежу, ёсьць дах над галавою...

І гэта бясьпечна й проста, няма асаблівых праблемаў. Але няма й жыцьця — ёсьць існаваньне.

Упэўнены, найважнейшае тое, што палякі сёньня атрымалі рэальную ўладу над сваім уласным жыцьцём. Самі вырашаюць, што для іх важна й што ім неабходна рабіць.

У прынцыпе — усё магчымае. Зьявіліся шырокія магчымасьці.

Дачка на вакацыі вырашыла зьезьдзіць папрацаваць за мяжу. Узяла пашпарт і паехала. Я свой пашпарт атрымаў даўно, але тады я ня меў такіх простых чалавечых магчымасьцяў. Цяжка кудысьці паехаць — з камуністычнае „зоны”. Працаваць можна было-б, канешне, і ў Польшчы. Але самае галоўнае ў тым, што кожны зараз сам вырашае й мае ўласны выбар. Гэта вельмі важнае пачуцьцё, што твой лёс належыць толькі табе. Ты — гаспадар самаго сябе й можаш зрабіць са сваім жыцьцём, што захочаш. Але ў гэтым — і вялікая адказнасьць. Трэба навучыцца карыстацца ўласнай свабодаю.

Атрымліваецца так, што новы стан грамадзтва ў Польшчы, адкрытыя дзьверы, свабодныя дарогі, марудны працэс псыхалягічнае рэабілітацыі й паступовых мэнтальных зьменаў пасьля пакіданьня „зоны”, неабходнасьць самастойна прыймаць уласныя рашэньні й навучыцца быць сабою — патрабуюць адпаведнай адукацыі й адпаведных навучальных праграмаў.

Відавочна, што большасьць людзей, усё грамадзтва, яшчэ мусім прайсьці гэтым шляхам — навучыцца быць свабоднымі й жыць у свабодзе.

## Сустрэча з доктарам Пятром Сітнеўскім з Вышэйшай Школы Публічнай Адміністрацыі ў Беластоку

Сустрача з доктарам Пятром Сітнеўскім, на якой ён вызначыў свае прыярытэты, расставіў пэўныя акцэнты ў гэткай шырокай тэме як сыстэмныя трансфармацыі ў Польшчы за апошнія 15 гадоў, была ў пэўнай ступені й пацьверджаньнем мінулых высноваў і адкрыцьцём новага, я-б сказаў, лібэральнага погляду на сытуацыю.

Так, відавочна, погляд прыхільніка Дональда Туска й ягонай партыі Грамадзянская Плятформа была цікавай, тым больш, што гэта была пазыцыя навукоўцы й выкладчыка, прафэсіянала вышэйшага рангу. Што-ж, на ягоную думку, было пасьпяховым, станоўчым, а што адмоўным у гэтым працэсе?

Найважнейшымі вынікамі сыстэмнае трансфармацыі, якая адбылася ў Польшчы за апошнія 15 год, доктар Пятро Сітнеўскі бачыць у рэформе мясцовага самакіраваньня, дэцэнтралізацыі й рэальным падзеле ўлады.

**1) Рэформа мясцовага самакіраваньня й дэцэнтралізацыя ўлады.**

Рэформа адбывалася ў два этапы. У 1990 годзе зьявіліся гміны, ніжэйшыя мясцовыя адміністрацыйныя адзінкі, нізавая база самакіраваньня ў Польшчы.

У 1998 г. зьявіліся паветы й ваяводзтвы, якія мелі ўласныя бюджэты й мусілі былі вырашаць лякальныя пытаньні функцыяваньня й разьвіцьця ўсёй мясцовай інфраструктуры.

Самадэцэнтралізацыя ўлады зь юрыдычнага пункту гледжаньня — вельмі добрая зьява. Але, нават у гэтым станоўчым пераўтварэньні ёсьць свае практычныя пытаньні, якія ўзьнімае жыцьцё й якія, з пункту гледжаньня людзей, трэба дапрацоўваць і ўдасканальваць. Сыстэма мусіць быць гнуткай і ўлічваць зваротную сувязь з грамадзтвам і рэальныя ўмовы функцываньня.

**2) Празрыстасьць улады й новая якасьць права.**

Польшча жыве сёньня з новым асноўным законам. За гады сыстэмных трансфармацыяў тут адбылася рэальная канстытуцыйная рэформа. Пасьля адмены камуністычнай канстытуцыі да моманту прыняцьця новай, краіна існавала ва ўмовах пераходнага пэрыяду, калі дзейнічала малая канстытуцыя РП.

У 1997 г. на канстытуцыйным рэфэрэндуме палякі прынялі свой новы асноўны закон, які замацаваў пазытыўныя перамены й вызначыў галоўныя прынцыпы, па якіх сёньня жыве краіна, у межах якіх працуе ейнае асноўнае прававое поле.

Новай канстытуцыяй Польшчы забараняюцца партыі й арганізацыі, што маюць у праграмах зварот да таталітарных мэтадаў і практыкі дзейнасьці нацызму, фашызму й камунізму, а таксама забараняецца расавая й нацыянальная нянавісьць, ужываньне гвалту з мэтаю захопу ўлады альбо ўплыву на палітыку дзяржавы, засакрэчваньне адпаведных забароненых арганізацыйных структураў і іхняга сяброўства.

У 2002 г. быў прыняты закон, адпаведна якому ўся інфармацыя, што тычыцца кіраўніцтва ўсіх узроўняў улады адкрытая для грамадзтва. Любы чалавек можа запрасіць гэтую інфармацыю, карыстаючыся правам выбарніка. Любы карыстальнік пэрсанальга кампутара можа атрымаць зь Інтэрнэту афіцыйныя зьвесткі пра кіраўніцтва адміністрацыі любога места й любога ўзроўню.

Пры гэтым з 1998 г. законам дакладна вызначана чаго нельга рабіць і што не павінна быць у кіраўніка ўлады й яговых блізкіх, дакладна рэглямэнтаваныя й прапісаныя ўсе забароны. Закон выключае практычна ўсе розначытаньні й магчымыя парушэньні альбо злоўжываньні палажэньнямі заканадаўства.

І гэта — абсалютна новая якасьць права. Законамі вызначаецца тое, што нельга рабіць. Усё астатняе — не забаронена. Але жыцьцё заўсёды ўносіць свае карэктывы й людзкі фактар тут застаецца вызначальным. Пра-

цэс патрабуе часу й пастаянных пазытыўных намаганьняў грамадзтва.

Але ўжо сёньня бачна, што нягледзячы на зразумелыя складанасьці й праблемы, краіна дасягнула неабходных дэмакратычных стандартаў, упэўнена й рашуча ўвайшла ў дэмакратычную эўрапэйскую прастору.

**3) Незалежная судовая сыстэма, магчымасьць судовай абароны правоў чалавека.**

Вельмі важна, што закон пачаў дзейнічаць і суды, як незалежная галіна ўлады, пачалі выконваць свае натуральныя функцыі. Праз судовую сыстэму рэальным стаў грамадзянскі й праўны кантроль мясцовае адміністрацыі на любым узроўні.

Так, гэты важкі аспэкт права зьдзяйсьняе Адміністратыўны Суд па правах чалавека ў дачыненьнях грамадзянаў з адміністрацыямі. Існуе два ўзроўні: Ваяводзкі Адміністратыўны Суд і Касацыйная інстанцыя для абскарджваньня прынятых ніжэй рашэньняў. Падобная структура існавала з 1981 года, але яна рэальна проста не працавала. І 15-гадовы пэрыяд прайшоў не дарэмна — сыстэма падзелу ўладаў і незалежны суд сёньня працуюць рэальна.

**4) Свабода асацыяцыяў і стымулы разьвіцьця адкрытай грамадзянскай супольнасьці.**

Грамадзтва закрытага аўтарытарна-каманднага тыпу пераўтварылася ў свабоднае й адкрытае грамадзтва дэмакратычнага тыпу. Грамадзянская супольнасьць атрымала імпульс для разьвіцьця й удасканаленьня, няўрадавы сэктар атрымаў дэмакратычную заканадаўчую базу, якая дазваляе сёньня скарыстоўваць грамадзянскую ініцыятыву ў карысьць дзяржавы, найменшымі выдаткамі супольна працаваць над вострымі сацыяльнымі праблемамі, рухаць краіну наперад, да дэмаратчных стандартаў і дабрабыту.

Свабода асацыяцыяў робіць магчымым артыкуляцыю самых складаных і актуальных праблемаў, данясеньне

праз незалежныя СМІ інфармацыі аб існуючых праграмах і пазыцыях, ініцыюе актыўнасьць на супольную рэалізацыю гэтых праграмаў дзеля пазытыўнага вырашэньня наяўных праблемаў у грамадзтве.

Так, законам 1990 г. аб НДА (недзяржаўных арганізацыях) вызначана, што для стварэнья грамадзкай арганізацыі дастаткова тры чалавекі. Для таго, каб утварыць юрыдычную асобу, дастаткова пятнаццаць чалавек.

З 2003 г. у Польшчы зьявіўся дадатковы стымул для разьвіцьця грамадзкага сэктару, дадатковага фінансаваньня грамадзянскіх ініцыятываў і НДА. Закон вызначыў, што кожны суб'ект падаткаабкладаньня, прыватнік, бізнэсовец, просты грамадзнянін можа пералічыць 1% з сумы ўласных падаходных падаткаў непасрэдна на статутную дзейнасьць любой няўрадавай арганізацыі. І гэта актыўна пачало дзейнічаць. Грамадзянскія ініцыятывы атрымалі дадатковыя матэрыяльныя стымулы й падтрымку.

Пятро Сітнеўскі прывёў як прыклад, што ён асабіста ў гэтым годзе ахвяраваў вызначаную суму на карысьць вядомай грамадзкай арганізацыі „Госпіс", якая займаецца лекаваньнем хворых на рак дзяцей.

Для таго, каб зарэгістраваць няўрадавую арганізацыю трэба падаць дакладна вызначаны прасьцейшы пакет дакумэнтаў у суд, зрабіць пры неабходнасьці некаторыя фармальныя праўкі й дачакацца самога акту рэгістрацыі, які робіцца без затрымак і практычна аўтаматычна ў выпадку адсутнасьці памылак. Калі арганізацыя мае жаданьне атрымліваць грашовую дапамогу ад любых грамадзянаў, яна дадаткова мусіць выканаць яшчэ некалькі нескладаных фармальнасьцяў.

**5) Свабода СМІ як важнейшы інструмэт разьвіцьця адкрытай грамадзянскай супольнасьці. Асьвятленьне актуальных праблемаў грамадзтва.**

Незалежная прэса атрымала таксама рэальны сэнс і разьвіцьцё. СМІ ў Польшчы сёньня — рэальная й вялікая сіла.

Зыходзячы з наяўнасьці гэтых асноўных фактараў у грамадзтве, Польшча мае сёньня ўсе асноўныя інструмэнты для барацьбы з такой складанай праблемай як карупцыя. Вельмі паказальным для польскага грамадзтва быў ініцыяваны свабоднымі СМІ працэс пад назовам „Рывінгэйт".

Распачала гэты працэс „Gazeta Wyborcza", якая надрукавала інфармацыю пра тое, як адзін з вышэйшых уладных чыноўнікаў (Леў Рывін) за зьмену аднаго слова ў законе патрабаваў хабар памерам у 17 млн. даляраў. Па выніках гэтага артыкула была ўтворана парлямэнцкая камісія, якая дасьледвала сытуацыю напрацягу аднаго года. У выніку высакапастаўлены карупцыянер трапіў за краты.

І за гэтым сачыла, гэта бачыла, усё грамадзтва. Падобны адкрыты працэс — вельмі станоўчы сыгнал і практычны доказ таго, што сыстэма ўзаемных стрымак і раўнавагаў, усе інструмэнты дэмакратычнага грамадзтва дзейнічаюць належным чынам. Яны можа й не прынесьлі пакуль відавочных вынікаў, але новая сыстэма пачынае даваць канкрэтныя вынікі, няўхільна разьвіваць і ўдасканальваць дэмакратычныя мэханізмы ў грамадзтве.

Заканадаўства сёньня дае магчымасьць палякам не баяцца судовай адказнасьці ў тым выпадку, калі яны робяць заяву аб тым, што былі вымушаныя даваць хабар і пазначаюць асобу карупцыянера. Адказваць па законе ў выпадку судовага разьбіральніцтва будзе толькі той, хто атрымліваў грошы. І гэтая, далёка не бясспрэчная пазыцыя заканадаўства, аднак, можа адыграць сваю станоўчую ролю ў барацьбе з карупцыяй.

**6) Мэнтальны стан грамадзтва — глябальная праблема ў часе дынамічнага разьвіцьця краіны, трансфармацыі асноваў старой камуністычнай сыстэмы.**

Патрэбен час для пэўных зьменаў мэнталітэту, разбурэньня адмоўных стэрэатыпаў старога мысьленьня й заганных звычак аўтарытарнага мінулага. Патрэбен час

і неабыякавасьць грамадзтва да гэтае складанейшае праблематыкі.

І тут галоўны акцэнт грамадзтва мусіць скіраваць, безумоўна, на працу з маладым пакаленьнем. Адукацыйныя праграмы й стажы, стыпендыі для малазабясьпечаных студэнтаў, атрыманьне станоўчага міжнароднага досьведу — мае самы першы прыярытэт. Для Беларусі, якая імкнецца да пераменаў, на думку Пятра Сітнэўскага, гэтае пытаньне зьяўляецца таксама вельмі актуальным, у тым ліку й для барацьбы з дыктатарскім лукашэнкаўскім рэжымам.

**7) Непасрэдны спосаб абраньня кіраўніцтва ўсіх галінаў улады.**

З 2002 г. Польшча атрымала магчымасьці непасрэднага абраньня ўсіх кіраўнікоў на ўсіх узроўнях дэцэнтралізаванае выканаўчае ўлады. 10-12 гадоў існаваў прынцып, калі дэпутаты абіралі мэра са свайго складу. Сёньня гэта робіцца непасрэдна ўсімі мясцовымі выбарнікамі. Як мы бачылі, выбары ў мясцовыя ўрады выклікаюць у грамадзянаў найбольшую актыўнасьць і жывую зацікаўленасьць.

І гэта — рэальны інструмэнт грамадзянскага ўплыву на рашэньні мясцовай адміністрацыі, спосаб кантролю за дзейнасьцю непасрэдна абраных кіраўнікоў (войта, бурмістра й прэзыдэнта), выкананьне імі як бы зацьверджаных выбарнікамі перадвыбарчых праграмаў мясцовага разьвіцьця ў рэгіёнах.

Але, разам зь вельмі станоўчым аспэктам гэтае бясспрэчна пазытыўнае зьявы, часам, узьнікаюць і некаторыя нэгатыўныя праявы. Так, напрыклад, вельмі папулярнага ў лякальнай мясцовасьці войта, пры пэўных нэгатыўных абставінах (пры немагчымасьці належнага выкананьня ім неабходных функцыяў, сыстэматычным парушэньні правілаў паводзінаў і ўжываньні алькаголю ...), да чаго праяўляюць абыякавасьць выбарнікі, становіцца даволі цяжка адклікаць з займаемай пасады.

Акрамя таго, на самых нізкіх узроўнях мясцовае ўлады, на думку спадара Пятра Сітнеўскага, адміністрацыя — надта палітызаваная. Для функцыянаваньня адміністрацыяў робіцца наём супрацоўнікаў і гэта адбываецца не заўсёды зыходзячы з прафэсійных якасьцяў кандыдатуры. Але, безумоўна, існуе пераважная большасьць адваротных, станоўчых і, нават, паказальных прыкладаў.

Пасьля перамогі новага кіраўніка мясцовага самакіраваньня ў г. Каліш, у складзе мясцовае адміністрацыі зьмяніліся толькі два чалавекі. Астатнія спэцыялісты засталіся працаваць адзінай камандай, бо зьяўляюцца добрымі прафэсіяналамі. І гэта залежыла ад таго, што асноўным жаданьнем новай кіраўніцы адміністрацыі была рэалізацыя ўласнай перадвыбарчай праграмы, дасягненьне пастаўленых мэтаў, выкананьне канкрэтных задачаў разьвіцьця гміны.

Такім чынам, можна канстатаваць, што няма ідэальных сыстэмаў. Заўсёды можна знайсьці адмоўныя прыклады й выключэньні. Усё — адносна. Але, на прыкладзе суседняе Польшчы, пры параўнаньні цяперашняе й мінулае аўтарытарнае сыстэмы, безумоўна, мясцовае самакіраваньне ёсьць бясспрэчным вялікім плюсам. Сыстэма эфэктыўная й мае вялікія патэнцыі. Яна будзе ўдасканальвацца й працаваць на дабрабыт усяго грамадзтва, кожнага чалавека. У дэмакратыі сёньня няма вартай альтэрнатывы. Ёсьць толькі спосабы й інструмэнты разьвіцьця й удасканаленьня гэтае сыстэмы.

**8) Фінансавыя праблемы й складаная сыстэма падаткаабкладаньня.**

Пры гэтым, немагчыма не сказаць пра цяжкасьці ў фінасавай сыстэме краіны.

Доктар Пятро Сітнеўскі прыводзіў прыклады вельмі складанай сыстэмыналічэньня падаткаў, у якой нават адукаванаму чалавеку вельмі цяжка разабрацца. Спрашчэньне сыстэмы падаткаабкладаньня, за якое выступаў у сваёй праграме Дональд Туск ад партыі Грамядзян-

ская Плятформа, на думку доктара Сітнэўскага аздаравіла-б фінансавую сыстэму, ажывіла прадпрымальніцкую ініцыятыву й давала-б дадатковыя бюджэтныя паступленьні. Прапановы былі па стварэньні простай і яснай формулы падаткаабкладаньня — 15/15/15. Гэта выплаты адпаведна: ад фізычнай асобы, ад фірмы й падатак ПДВ (падатак ад тавараў і паслуг, які закладаецца ў кошце кожнага вырабленага прадукту). Але, Дональд Туск набраў толькі 46% на выбарах прэзыдэнта Польшчы. Перамог прадстаўнік ПіС (партыі Права й Справядлівасьць) Лех Качынскі, які нічога не зьбіраўся мяняць у падаткавай сыстэме. Ці будзе што-небудзь рабіцца ўрадам Казімежа Марцінкевіча ў гэтай галіне — пакажа час.

**9) Цяжкасьці незавершанасьці працэсу дэкамунізацыі ў краіне.**

Асобным адмоўным фактарам і тормазам на шляху станоўчых пераўтварэньняў у краіне доктар Пятро Сітнеўскі адзначыў нявырашаную праблему з працэсам дэкамунізацыі. Гэтая праблема заўсёды нагадвае пра сябе ў часе новых выбарчых кампаніяў. Ён лічыць, што, магчыма, у мінулым была зроблена сур'ёзная памылка, калі ня быў прынятым закон „Аб люстрацыі”, які-б забараняў займаць адказныя пасады былым актыўным удзельнікам камуністычнае партыі ў Польшчы.

Такім чынам, не была праведзена рэальная дэкамунізацыя на ўсіх узроўнях кадравай лесьвіцы, што сёньня нэгатыўна ўплывае на працэсы ўдасканальваньня новай сыстэмы й далейшага разьвіцьця грамадзтва.

Прыклад праведзенай люстарыці ў Чэхіі Пятро Сітнеўскі лічыць паказальна станоўчым фактарам, які ў далейшым пазбаўляе грамадзтва ад даволі складаных нэгатыўных праяваў і праблемаў.

Ягоныя меркаваньні па гэтым пытаньні знайшлі неадназначную рэакцыю ішых суразмоўцаў. Пытаньне люстрацыі падавалася ім цяжкім з пункту гледжаньня тэхнічнай і беспамылковай рэалізацыі на практы-

цы, дзе кожны памылковы крок адбіваўся-б на лёсе канкрэтных людзей.

**Сустрэча з дэпутатам Робэртам Тышкевічам**

Мяне цікавіў погляд новаабранага дэпутата парлямэнту Польшчы ад партыі Грамадзянская Плятформа Робэрта Тышкевіча, дырэктара выдавецкае фірмы „Публікатар" на тыя зьмены, што адбыліся за апошнія 15 гадоў. Пры гэтым, хацелася засярodзіць увагу на выніках эканамічнай рэформы, сыстэмы самакіраваньня ў краіне.

Дагэтуль шырыня пытаньня дазваляла кожнаму суразмоўцу як бы вызначыць для сябе найбольш важкія прыярытэты й зрабіць акцэнты на тых аспэктах разглядаемай тэмы, якія для яго зьяўляюцца самымі важкімі й значынымі.

Пасол Сойма Робэрт Тышкевіч адразу падзяліў гэтае вялікае пытаньне на некалькі.

Першае, што ён адзначыў, тычылася стратэгічнай бясьпекі й новага базавага ўзроўню дэмакратыі.

— Ёсьць такі стандартны адказ на пытаньне пра „асноўныя вынікі 15-годзьдзя незалежнасьці й трансфармацыі ў Польшчы". Галоўным ёсьць тое, што мы сёньня знаходзімся ў НАТА й у Эўрапэйскім Зьвязе. То-бок, мы маем бясьпеку й жывем у сям'і вольных эўрапэйскіх народаў, дзе замацаваныя высокія цывілізацыйныя стандарты: праўныя, канстытуцыйныя, адміністрацыйныя й эканамічныя. Такія стандарты, якія дзейнічаюць у шэрагу найбольш разьвітых краінаў Эўропы.

Такі стандартны адказ — палітчыны.

І ёсьць яшчэ адзін адказ, які паказвае вынікі трансфармацыяў з пункту гледжаньня гэткіх канкрэтных, вельмі відавочных абставінаў альбо жыцьцёвых прыкладаў.

Можна задацца шэрагам пытаньняў. Напрыклад, як Польшчы ўдалося выкарыстаць гэтыя 15 гадоў для зьмены грамадзтва? Як зьмяніліся дзяржаўныя інстытуты? Як зьмянілася структура грамадзтва й самі грамадзяне? Ці жывецца палякам сёньня лепей, чым пры

мінулым камуністычным рэжыме? І каму сёньня жывецца лепей?

І гэта ўжо, сапраўды, вельмі вялікае пытаньне.

Што я бачыў бы ў гэтых рэформах удалым у Польшчы. У першую чаргу гэта эканамічная рэформа, якая была спраектаваная й праведзеная Лешкам Бальцаровічам. Як кажуць экспэрты, гэтая рэформа ёсьць узорам мадэлі пераходу ад гаспадаркі цэнтральна скіраванай плянавасацыялістычнай да мадэлі гаспадаркі капіталістычнай. Дагэтуль працягваюцца дыскусіі ў Польшчы наконт таго ці маглі быць меншымі альбо больш справядлівымі выдаткі грамадзтва ў той сыстэмнай трансфармацыі? Ці можна было-б выбраць спосаб менш адчувальны для большасьці грамадзянаў?

Дарэчы, сам Бальцаровіч казаў, што калі-б ён меў досьвед і веды, якія атрымаў на працягу апошніх гадоў, дык зрабіў-бы ўсё пэўна трохі іначай.

Так, цягам рэформы адбыліся відавочныя станоўчыя зьмены, ажывіўся гандаль, спынілася інфляцыя, была гарантаваная гаспадарчая свабода, якая на працягу некалькіх гадоў прывяла да таго, што прыватныя прадпрыемствы пачалі выпрабляць большасьць ВУП (валавога ўнутранага прадукту) і сталі сапраўды дамінуючай формай гаспадараньня ў Польшчы.

Калі казаць пра тое, што не ўдалося зрабіць у часе праведзеньня эканамічнай рэформы дык гэта тое, што не ўдалося захаваць запал і энэргію палякаў да прадпрымальніцтва. Бо на пачатку амаль кожны меў жаданьне мець свой уласны бізнэс. Але захаваліся й працягваюць існаваць, з пункту гледжаньня лібэралаў, складанасьці, зьвязаныя са складанай падаткавай сыстэмай і пэўнымі адміністрацыйнымі цяжкасьцямі пры стварэньні новых прадпрыемстваў і фірмаў.

Высокімі застаюцца падаткі й узносы ў розныя фонды (парападаткі), якія складаюць 80% ад кожнага заробленага грошыка. Напрыклад, калі заробак супрацоў-

ніка фірмы складае 1000 зл., фірма абавязаная дадаткова зрабіць адлічэньні 800 зл. у выглядзе розных падаткаў і ўзносаў.

Такім чынам, звыш высокія пазапрацоўныя кошты працы, зьвязаныя з адпаведным узроўнем падаткаў і ўзносаў, сёньня зьяўляюцца найважнейшай праблемаю польскай эканомікі пасьля праблемы высокага беспрацоўя ў Польшчы.

Складаная сыстэма падаткаабкладаньня, якая выклікае розначытаньні й блытаніну ў налічэньні й выплаце падаткаў, выклікае шматлікія сытуацыі, калі падаткаплацельшчыкі ня ведаюць ці правільна яны налічылі й заплацілі падаткі.

У Польшчы ёсьць асноўны падатак ПДВ — 22% (гэта не падатак ад даходу, але падатак ад тавараў і паслуг — ён закладаецца ў кошце кожнага выробленага прадукту).

Спрашчэньне падаткавае сыстэмы, увядзеньне простых падаткаў дазволіла-б прадпрымальнікам мецць ашчаджэньні на коштах абслугі сваіх фірмаў (аўдытарска-кансалтынгавым і юрыдычным забесьпячэньні). А дзяржава атрымала-б магчымасьць атрымаць дадатковы даход за кошт скарачэньня бугалтарскага апарату.

Прыклад суседніх краінаў (Славакія, Латвія, Літва) паказвае, што спрашчэньне й зьніжэньне падаткаў выклікае павелічэньне бюджэтных паступленьняў. І гэта — аксыёма.

Звышвысокія пазапрацоўныя кошты працы ў Польшчы ёсьць сур’ёзным бар’ерам для далейшага дынамічнага разьвіцьця ўсёй польскай эканомікі.

Інвэстыцыі прыходзяць туды, дзе найлепшыя фінансавыя ўмовы, ніжэйшыя падаткі.

Як лічыць Роберт Тышкевіч, сёньня Польшча падышла да такога этапу, калі эканоміка краіны патрабуе моцнай і сьмелай, генэральнай рэформы дзяржаўнай фінансавай сыстэмы. І гэта патрэбна, каб ажывіць эканоміку, прыцягнуць інвэстыцыі й упэўнена рухацца далей.

Бюджэт краіны сёньня мае два ўзроўні. Дзяржаўны (цэнтральны) і мясцовыя бюджэты структураў самакіраваньня. Частка падаткаў трапляе непасрэдна ў мясцовыя бюджэты, а частка ў дзяржбюджэт. Мясцовыя бюджэты таксама атрымліваюць датацыі альбо субвэнцыі з дзяржбюджэту на рэалізацыю дзяржаўна значных праграмаў, замаўляемых зьверху. І як заўсёды, гэтыя субвэнцыі не пакрываюць увесь кошт гэтых праграмаў. Мясцовыя ўлады шукаюць гэтыя дадатковыя сродкі самі.

І гэта ёсьць іхным найважнейшым функцыянальным абавязкам — пошук і прыцягненьне інвэстыцыяў для стварэньня новых працоўных месцаў, павелічэньня дабрабыту грамадзянаў і выкананьня стратэгічных праграмаў разьвіцьця мясцовае інфраструктуры.

Мясцовае самакіраваньне ў Польшчы — гэта відавочны плюс.

У Польшчы ёсьць такое меркаваньне, што найлепш за ўсё тут удалася менавіта рэформа мясцовага самакіраваньня.

Мясцовыя ўрады з пункту гледжаньня ашчаднасьці больш эканамічныя, бо яны скіраваныя на адпаведныя лякальныя праблемы, яны іх ведаюць і разумеюць, ведаюць найлепшыя спосабы іх вырашэньня, прыстасаваныя да рэальных лякальных патрэбаў.

У выніку тое, чаго дасягнула рэформа мясцовага самакіраваньня — гэта рэальнае прыцягненьне грамадзянаў у справы сваіх лякальных супольнасьцяў.

Якраз з гэтага й вынікае ўжо вядомы факт, што мясцовыя выбары карыстаюцца найбольшай папулярнасьцю ў палякаў. Безумоўна, найвялікшым дасягненьнем стала тое, што тры гады назад зьявілася магчымасьць непасрэднага абраньня грамадзянамі кіраўнікоў мясцовых адміністрацыяў: войта, бурмістра й прэзыдэнта.

І баланс плюсаў і мінусаў рэформы самакіраваньня, безумоўна, дадатны.

Менавіта ад актыўнасьці й крэатыўнасьці мясцовага кіраўніцтва залежыць шмат чаго ў пляне прыцягненьня інвэстыцыяў, бо роля мясцовых уладаў — пошук інвэстараў. Не дзяржава прыцягвае інвэстыцыі, але самаўрады складаюць афэрты. Яны, канешне, карыстаюцца пасрэдніцкімі паслугамі міністэрства эканомікі ці агенцыяў, што абслугоўваюць замежных інвэстараў. Але толькі ад актыўнасьці самой гміны цалкам залежыць ці зьявіцца на ейнай тэрыторыі, напрыклад, папяровая фабрыка й ці прыйдзе сюды чаканы інвэстар. Шмат чаго ў выніку будзе залежыць ад створанай інфраструктуры, наяўнасьці неабходных кадраў у гэтай канкрэтнай мясцовасьці.

Польская новая канстытуцыя ёсьць гарантам грамадзянскіх і палітычных свабодаў.

Гарантавана свабода асацыяцыяў, стварэньня й дзейнасьці партыяў і НА, свабода выбару прадстаўнікоў і кіраўніцтва на ўсіх узроўнях улады да самага нізавога ўзроўню мясцовага самакіраваньня, свабоды слова ў выглядзе незалежных СМІ й выдавецкіх свабодаў. У асноўным законе замацаваны рэальны падзел і балянс заканадаўчай, выканаўчай і судовай уладаў. Працуе сыстэма ўзаемных раўнавагаў розных галінаў улады. Канстытуцыйны Трыбунал пільнуе адпаведнасьць асноўнаму закону новых, прыймаемых парлямэнтам законаў.

Сапраўды кажучы, размовы й непасрэдныя назіраньні аўтара паказалі, што зараз выбарчая сыстэма ў Польшчы дзейсна працуе. Яна забясьпечвае галоўнае палітычнае права палякаў на свабоду выбару. Праз непасрэдны ўдзел у працы выбарчых камісіяў партыі могуць непасрэдна кантраляваць аб’ектыўнасьць выбарчых кампаніяў і працэсу галасаваньня. Таму ўсе суб’екты палітычнага поля, у тым ліку грамадзяне, упэўненыя, што мэханізм дэмакратычнага выбару ў краіне безадказна й надзейна працуе. І гэта ёсьць вялікім стабілізуючым фактарам ува ўсім польскім грамадзтве. Бо незадаволенасьць людзей мае магчымасьць праявіцца ў канкрэт-

ным і непасрэдным выбары, празь які людзі практычна маюць магчымасьць кіраваць уласнай краінай, уплываць на значныя для грамадзтва рашэньні, скіроўваць уласную энэргію на перамены ў рэальна працуючым эфэктыўным канстытуцыйным рэчышчы. І гэта для сёньняшняе Польшчы ўжо ёсьць відавочным і вельмі асягальным, рэальным здабыткам.

**Эканоміка Польшчы на новым этапе патрабуе ажыўленьня й мадэрнізацыі.**

Галоўнымі задачамі для сучаснае Польшчы, на думку парлямэнтарыя Робэрта Тышкевіча, ёсьць ажыўленьне фінансавай сыстэмы й стварэньне новых працоўных месцаў (ліквідацыя высокага ўзроўню беспрацоўя).

Заданьнем № 1 ёсьць неабходнасьць паскорыць зьмяншэньне залежнасьці Польшчы ад заможных краінаў Эўрапейскага Зьвязу. Правесьці мадэрнізацыю ўсёй польскай эканомікі. І важна, каб гэты працэс займаў не 20 гадоў але 5-7 гадоў максымум — на працягу аднаго пакаленьня. Для гэтага неабходна шмат чаго зрабіць, каб вывесьці краіну на значна больш высокі канкурэнцыйны ўзровень, на агульнаэўрапейскія стандарты па сацыяльным забесьпячэньні й узроўні жыцьця. Гэта дазволіць дасягнуць найлепшых умоваў для разьвіцьця й функцыянаваньня ўсёй польскай эканомікі ў канкурэнцыі з заможнымі краінамі Аб'яднанай Эўропы.

Адносна нізкі ўзровень актыўнасьці на апошніх выбарах у парлямэнт і на прэзыдэнта краіны сьведчаць аб наяўнасьці пэўнай праблемы, зьвязанай зь якасьцю палітычнага спэктру й даверам да канкрэтных палітыкаў у краіне. Палякі спадзяюцца на дзейсны кабінэт міністраў і рашучыя зьмены ў галіне працазанятасьці, барацьбе з адносна высокай карупцыяй. Дарэчы, апошняя бумэрангам б'е па аўтарытэце разнастайных палітыкаў і прадстаўнікоў улады.

Для вырашэньня гэтых праблемаў тут насьпела рэальная неабходнасьць наступных рашучых крокаў па эка-

намічнай рэформе, спрашчэньні падаткавай сыстэмы й прыцягненьня капіталу для стварэньня новых працоўных месцаў і пашырэньня рынкаў збыту.

Якасна новы этап вымагае сацыяльна-эканамічнай мадэрнізацыі, рэформы падаткавай і фінансавай сыстэмаў, у выніку чаго магчымае дасягненьне высокіх паказчыкаў вытворчасьці й росту даходаў, дасягненьне адпаведных стандартаў у дабрабыце.

Так, нягледзячы на праблемы й цяжкасьці, за апошнія 15 гадоў Польшча крочыла з аўтарытарнай палітычнай сыстэмы, цэнтралізаванай эканомікі й закрытага тыпу грамадзтва ў якасна новыя варункі разьвіцьця дэмакратычных інстытутаў і рынкавай эканомікі, выйшла на мяжу новых пазытыўных пераўтварэньняў на якасна новым этапе, які патрабуе далейшых крокаў па мадэрнізацыі нацыянальнай эканомікі, падаткавай і фінансавай сыстэмаў, ажыўленьня прытоку эўраінвэстыцыяў у інфраструктурныя зьмены й стварэньне новых працоўных месцаў, эфэктыўных праграмаў у выкарыстаньні энэрганосьбітаў і пашырэньня цеплазьберагальных тэхналёгіяў, разьвіцьцё пляцежаздольных рынкаў збыту, рашучым зьмяншэньні наяўных ўзроўняў карупцыі, правядзеньні паступовага эвалюцыйнага працэсу мэнтальных зьменаў у грамадзтве дзеля замацаваньня пазытыўных здабыткаў грамадзтва, правядзеньня інтэнсыўнай адукацыйнай і асьветнай праграмы для моладзі й тых катэгорыяў насельніцтва, якія здольныя рухаць грамадзтва наперад, практычна выкарыстоўваць тыя бліскучыя па сваіх вартасьцях дэмакратычныя інструмэнты (незалежныя суды, свабоду асацыяцыяў і СМІ), якімі рэальна валодае польскае грамадзтва, вольнае ад ідэалягічнага дыктату, манаполіі ўлады і... страху, таго страху, праз які сёньня аўтарытарная машына ў Беларусі кіруе, на якім пабудаваная ўся стратэгія захаваньня сёньняшняга рэжыму, які як самы галоўны аргумэнт прымушае шмат каго зь беларусаў альбо апускаць рукі, альбо пакідаць Бацькаўшчыну.

**Грамадзтва рашуча пазбавілася ад страху**

У палякаў здаўна даволі моцна прысутнічае хрысьціянская культурная традыцыя. А вера й страх — несумяшчальныя рэчы.

Пазбаўленьне ад страху дае велізарны наплыў энэргіі, якая мусіць быць скарыстаная для дынамічнага разьвіцьця краіны праз шырокія магчымасьці адкрытага грамадзтва, дэцэнтралізацыю ўлады, свабоду асацыяцыяў і ініцыятываў, незалежныя суды й СМІ, магчымасьці для грамадзянаў рэальна выбіраць і ўплываць на прыймаемыя рашэньні на ўсіх узроўнях улады, праз рынкавыя свабоды, дабрачынную й прадпрымальніцкую ініцыятыву.

Грамдзтва, якое не закрывае вочы на ўласныя праблемы, здольнае да паступовага разьвіцьця й удасканаленьня — здаровае грамадзтва. Сучасная Польшча, якая прайшла шляхам сыстэмнае трансфармацыі ад закрытае аўтарытарна-каманднае сыстэмы да эўрапейскіх стандартаў адкрытага грамадзтва, мае сёньня ўсе інструмэнты, якія здольныя вырашаць любыя, самыя складаныя задачы разьвіцьця краіны, пачынаючы ад працаўладкаваньня й самазанятасьці насельніцтва да лекаваньня агульнасусьветнай хваробы карупцыі, а таксама недахопаў ці то ў фінансавай, ці ў падаткавай, ці яшчэ ў якой-кольвек сацыяльна-эканамічнай альбо грамадзка-палітычнай сфэры.

**Прыярытэты адукацыі й новай якасьці ведаў для паскарэньня працэсу мэнтальных зьменаў і росту дабрабыту ў краіне.**

Для дзейнасьці ў новых варунках спатрэбяцца добра адукаваныя, ініцыятыўныя й пазытыўна скіраваныя людзі. Прадстаўляючы практычныя мэханізмы для самарэгуляцыі грамадзтва, інструмэнты грамадзкага маніторынгу, выяўленьня й вырашэньня праблемаў, свабоднага абмену інфармацыяй, судовага ўзьдзеяньня й праваабарончага кантролю... — сытуацыя вымагае неабходнасьці адэкватнага пашырэньня й распаўсюду пазытыўнага

досьведу выкарыстаньня гэтых інструмэнтаў у межах грамадзкай супольнасьці.

Калі ты атрымаў вуду, то мусіш ведаць, як ёй эфэктыўна карыстацца, каб налавіць рыбы. Тым больш, што побач можа раптоўна зьявіцца „нехта заўсёды правільны”, хто будзе пастаянна казаць, што гэта марная справа, што цябе падманулі. Кідай, маўляў, дурную задуму й пайшлі „абратна”, там ёсьць „правільны разьмеркавальнік” і калі там паміраюць, дык гэта дакладна, што не ад „галадухі”.

Але палякі поўны амбіцыяў і стваральнага запалу. Яны зьбіраюцца жыць. І жыць ня горш за „самых крутых” эўрапэйцаў. Застаецца толькі зразумець, што для гэтага трэба канчаткова зьмяніць спосаб мысьленьня, не чакаць „манны зь нябёсаў”, але дзейнічаць, актыўна далучацца да стваральнага цывілізацыйнага працэсу і, усьведамляючы законы дэмакратычнага разьвіцьця й свабоднага рынку, працаваць на ўласную будучыню, будучыню сваіх дзяцей і сваёй краіны. У Польшчы зайздросныя пэрспэктывы й скарыстаць іх дзеля свайго дабрабыту краіна павінна абавязкова. Грамадзяне мусяць ведаць пра ўсе магчымасьці й перавагі адкрытага грамадзтва й рынкавай эканомікі, эфэктыўна карыстацца гэтымі перавагамі.

Працэс мэнтальных зьменаў, які можа зацягнуцца яшчэ на 10 гадоў, мусіць канчаткова замацаваць вынікі ўсёй папярэдняй сыстэмнай трансфармацыі ў Польшчы з улікам будучай і неабходнай мадэрнізацыі, на парозе якой краіна знаходзіцца сёньня.

Досьвед суседкі паказвае, што дзеля таго, каб вывесьці грамадзтва на якасна новы ўзровень дабрабыту й грамадзянскіх свабодаў, бясьпекі й паступальнага, незваротнага разьвіцьця мала пазбавіцца ад бачных атрыбутаў таталітарна-аўтарытарнай сыстэмы й выпрацаваць эфэктыўныя інструмэнты дэмакратычнага самарэгуляваньня грамадзтвам. Трэба найлепшым чынам скарыстаць час для правядзеньня адукацыйна-асьветнай працы, зьмя-

ніць састарэлыя стэрэатыпы мысьленьня, якія фармаваліся й замацоўваліся ва ўмовах аўтарытарнай цэнтралізавана-разьмеркавальнай сыстэмы. І гэтыя зьмены могуць прыйсьці толькі з часам і зьменаю пакаленьняў.

**Фактар стабільнасьці й бясьпекі, незваротнасьці працэсу ўмацаваньня дзяржаўнай незалежнасьці краіны й пераменаў да лепшага.**

Так, безумоўна, падобныя зьмены ў грамадзтве вельмі складаныя й патрабуюць часу. Яны патрабуюць адпаведных умоваў і грамадзка-палітчынай стабільнасьці. Таму, фактар далучэньня Польшчы да Эўрапейскага Зьвязу й НАТА дае краіне гарантыі незваротнасьці працэсу ўмацаваньня дзяржаўнай незалежнасьці, дэмакратычных пераўтварэньняў і адкрывае пэрспэктывы спакойнага разьвіцьця грамадзтва на абшарах агульнаэўрапейскай і сусьветнай цывілізаванай прасторы.

І гэта падаецца галоўным агульным альбо палітычным вынікам той сыстэмнай трансфармацыі, якая адбылася ў суседняй краіне за апошні час.

Рэальная дэцэнтралізацыя ўлады, перадача шматлікіх функцыяў і адпаведных паўнамоцтваў мясцовым урадам і органам самакіраваньня, дэмакратызацыя выбарчых мэханізмаў ва ўмовах рэальнай свабоды СМІ й дзейснай незалежнай судовай сыстэмы — велізарныя дасягненьні Польшчы за апошнія 15 год, вартасьць якіх цяжка пераацаніць.

Адбыўшыеся сустрэчы зь цікавейшымі й аўтарытэтнымі людзьмі ў Беластоку толькі пацьвердзілі гэтыя высновы. Тая зацікаўленасьць, якую яны праявілі да тэмы вынікаў сыстэмнай трансфармацыі за апошніх 15 гадоў сьведчыць пра іхную неабыякавасьць да лёсу ўласнай краіны, да таго, што думаюць і кажуць пра Польшчу ў суседняе Беларусі.

Як дырэктар дэлегатуры Цэнтральнага Выбарчага Бюро ў Беластоку Марк Рыбнік, гэтак і доктар Пятро Сітнеўскі з Вышэйшай Школы Публічнай Адміністрацыі, стар-

шыня праўленьня выдавецтва („Gazeta Współczesna" й „Kurier Poranny"), непасрэдны ўдзельнік працэсу пераменаў і „Салідарнасьці" Кшыштаф Палінскі, старшыня праўленьня выдавецтва „Публікатар", дэпутат новага складу польскага парлямэнту ад партыі Грамадзянская Плятформа Робэрт Тышкевіч ды й Тадэуш Арлуковіч, прэсавы сакратар дзейснага прэзыдэнта Беластока Рышарда Тура, — усе яны мелі ўласныя пазыцыі й погляды на рэчаіснасьць, адзначалі цікавасьць і аб'ёмнасьць тэмату, але зыходзіліся ў адным.

Яны разам зь іншымі палякамі, аднадумцамі альбо апанэнтамі, усе разам маюць сёньня якасна новы стан грамадзтва, грамадзтва шматлікіх дэмакратычных свабодаў, канстытуцыйнага права, рэальнага выбару й шырокіх магчымасьцяў. Яны ды іхныя дзеці, будучыя пакаленьні палякаў, маюць сёньня найлепшы пляцдарм для самарэалізацыі ўласных амбіцыяў, здольнасьцяў і імпэту, наўпрост адчуваюць, літаральна „трымаюць за руку" сваю прыватную й адзіную для ўсіх грамадзянаў Польшчы надзею на свабодную й заможную будучыню.

Сучаснае польскае грамадзтва выйшла на якасна новую „эўрапэйскую магістраль" разьвіцьця. Яно сёньня мае рэальную пэрспэктыву й магчымасьці, базавы ўзровень агульнадэмакратычных стандартаў адкрытага грамадзтва й рынкавай эканомікі, гарантаваны дзяржаўнай стабільнасьці й бясьпекі, якія адкрываюць для Польшчы самыя шырокія пэрспэктывы.

Краіна пакінула ў мінулым цяжар дзяржаўнай прыгнечанасьці й несвабоды, савецкага аўтарытарызму й ідэалягічнага дыктату, плянава-разьмеркавальнай сыстэмы ў эканоміцы, здолела выйсьці са становішча стагнацыі й застою, апатыі й пэсымізму, нейкага суцэльнага грамадзка-палітчынага трансу. Яна здолела пазбавіцца ганебнага стану закладніка ў чужой „халоднай вайне", у дзікунскім „жалезным падзеле Эўропы" й вар'яцкай „гонцы ўзбраеньняў", прайшла складаны пэрыяд неста-

більнасьці й шляхам рэвалюцыйных пераўтварэньняў ды сыстэмных трансфармацыяў крочыла за мяжу незваротных зьменаў і свабоднага разьвіцьця грамадзтва, выйшла на якаснановы этап мадэрнізацыі нацыянальнай эканомікі для дасягненьня ў недалёкім будучым самых высокіх стандартаў эўрапейскага дабрабыту.

**АБРАТНА Ў ЗОНУ ... !?**

**Вызваляючыся ад кайданоў мінулага**

**Ў імкненьні да Праўды, Любові й Свабоды ...**

**Вяртаньне абратна ў праблемы й незавершаныя справы, у мітусьню штодзённага змаганьня за права быць беларусам у Беларусі й крок за крокам адваёўваць прастору ўласнае чалавечае свабоды для сябе й сваіх дзяцей, для сваіх сяброў, простых людзей, запалоханых і прыгнечаных абразьлівым станам безальтэрнатыўна ганебнага існаваньня ў створанай з усяе краіны адміністратыўна-каманднай ЗОНЕ,**

**вяртаньне абратна, быццам у мінулае, з магчымай і цалкам верагоднай, але ня блізкай для Беларусі будучыні,**

**выклікала нейкі мэдытатыўны стан нерухомага й сканцэнтраванага судакрананьня зь бязконцым і ўсюдыісным велізарным унутраным спакоем, які можна назваць станам непасрэднага мэнтальнага альбо духоўнага адзінства з тым велізарным сьвятлом, якое аб’ядноўвае ўсё навокал, усе праявы ў сьвеце, народы й краіны, якое надае сілы, падсьвядома скіроўвае й вядзе, рухае наперад да адзіна магчымага, натуральнага для кожнага чалавека стану — да ПРАЎДЫ, ЛЮБОВІ й СВАБОДЫ,**

**да гэткай чаканай, бясконца далёкай, але насамрэч, незвычайна блізкай, асабістай УНУТРАНАЙ і агульнай для ўсіх людзей веры й нязломнае волі, передвызначанай ня намі, але намі ствараемай штодня й няспынна набліжаемай НАШАЙ СЬВЕТЛАЙ І РАДАСНАЙ — БУДУЧАЙ ПЕРАМОГІ.**

**14.12.2005**

**Уладзімір Хільмановіч**

# Польская сыстэма мясцовага самакіраваньня

**(пасьля рэфармаваньня апошніх пятнаццаці гадоў)**

Польская рэформа самакіраваньня распачалася ў 1990 годзе — у сакавіку 1990 году Сойм (пасьля папярэдняй зьмены Канстытуцыі) прыняў „Закон пра самакіраваньне". 27 траўня таго-ж году пасьля пяцідзесяцігадовага перапынку, зьвязанага з сацыялістычным шляхам „разьвіцьця", адбыліся першыя дэмакратычныя мясцовыя выбары. У час з 1990-га па 1998-ы год **гміна** (польская муніцыпальная адзінка) была адзінай структурай самакіраваньня. 1 студзеня 1999 году былі ўтвораны розныя адзінкі мясцовай ўлады. Акрамя гмінаў дадатковым роўнем мясцовай улады сталі **паветы**. Былі створаны таксама **ваяводзтвы** — рэгіянальная ўлада.

**Гміны**

Найбольшую цікавасьць выклікае функцыянаваньне гміны. Разабраўшыся ў гэтым, можна зразумець сутнасьць польскага мясцовага самакіраваньня. Сёньня



kamunikat.org

ў Польшчы ўтворана 2 489 гмінаў. 894 зь іх маюць статус гораду ці гарадзкой мясцовасьці, астатнія 1595 ёсьць сельскімі. Асаблівы спэцыфічны статус мае Варшава. Яна складаецца з 11 непадзельных муніцыпальных акругаў, якія аб’яднаныя спэцыфічнымі агульнымі заданьнямі.

Рады гмінаў (мясцовыя распарадчыя й кантрольныя органы) абіраюцца наўпростым галасаваньнем грамадзян — насельнікаў данай тэрытарыяльнай адзінкі. Цягам трох тэрмінаў выканаўчыя органы — кіраўнік муніцыпальнай адзінкі й гмінная ўправа (па-іншаму назву гэтага органу можна перакласьці на беларускую мову як „праўленьне” ці „мясцовы ўрад”) абіраліся радай гміны. Цяпер гэтая працэдура зьменена — прадугледжана наўпроставае галасаваньне грамадзян. На чале гмінных управаў стаяць войты (у сельскіх гмінах), бурмістры (у гарадах з насельніцтвам да 100 тысяч чалавек) і прэзыдэнты (у вялікіх гарадах).

У сыстэме польскай дзяржавы гміне адведзена асаблівая роля. Гміна ёсьць асноўнай адзінкай тэрытарыяльнага самакіраваньня й зыходнай адзінкай адміністрацыйнага падзелу краіны. Гміна выступае як незалежная юрыдычная асоба, якая мае:

— арганізацыйную самастойнасьць (свае органы й структуры);

— адміністрацыйную самастойнасьць (кампэтэнцыя, якая акрэсьлена законам, прыняцьцё сваіх актаў);

— эканамічную самастойнасьць (гаспадарчыя й фінансавыя рэсурсы);

— палітычную самастойнасьць (незалежныя выбары й грамадзкі кантроль над дзейнасьцю).

Заданьні гміны найперш палягаюць у забесьпячэньні агульных патрэбаў мясцовай супольнасьці. Спэктар гэтых патрэбаў досыць шырокі — ад уладкаваньня й распараджэньня землямі й аховай асяродзьдзя да сацыяльнага, мэдыцынскага й праўнага забесьпячэньня цяжар-

ных кабет. Усе заданьні гміны можна падзяліць на некалькі групаў:

— заданьні тэхнічнай інфраструктуры гміны (гмінныя дарогі, вуліцы, масты, каналізацыя, пляцы, прыбіраньне тэрыторыі, пільнаваньне санітарных нормаў, камунальнае будаваньне жытла, мясцовы грамадзкі транспарт, энэрга- і цеплярэсурсы, месцы гандлю й г.д.);

— сацыяльныя заданьні (ахова здароўя, культура, асьвета, сацыяльная дапамога);

— заданьні грамадзкага парадку й бясьпекі (арганізацыя дарожнага руху, грамадзкі парадак, санітарная бясьпека, супрацьпажарная ахова);

— заданьні экалягічнага й ляндшафтнага забесьпячэньня (плянаваньне ляндшафту, распараджэньне землямі, ахова навакольнага асяроддзя).

Адпаведна ўсе гэтыя заданьні канкрэтызаваныя ў галіновых законах.

Гміна самастойна вядзе гаспадараньне на падставе свайго бюджэту, які прымаецца на каляндарны год. Праект бюджэту рыхтуе ўправа, з улікам прынцыпаў бюджэтнага заканадаўства й паправак рады гміны. Праект бюджэту ўправа перадае радзе й перасылае яго для экспэртызы рэгіянальнай лічыльнай палаце. Працэдуру ўхваленьня бюджэту вызначае рада. Цікава, што ў разе, калі бюджэт ня будзе ўхвалены ў адпаведны тэрмін, яго зацьвярджае рэгіянальная лічыльная палата.

Каб зразумець, як фармуецца бюджэт гміны, трэба спыніцца на крыніцах прыбыткаў. Да прыбыткаў гміны прыналежаць падаткі, аплаты й іншыя паступленьні, акрэсьленыя асобнымі палажэньнямі як прыбыткі гміны; прыбыткі ад маёмасьці гміны, а таксама агульная датацыя зь дзяржаўнага бюджэту. Акрамя таго, яе даходамі могуць быць і мэтавыя датацыі на рэалізацыю даручаных заданьняў, а таксама дафінансаваньне ўласных заданьняў, паступленьні ад самаападаткаваньняў жыхароў, спадчыны, ахвяраваньняў, дарэньняў і інш. У кожным

разе трэба памятаць пра асноўны прынцып бюджэтнага права, які можна сфармуляваць так: фінансавыя абавязаньніцтвы гміны мусяць прадугледжваць заўжды знаходжаньне крыніц даходаў, якія маглі забяьпечыць выкананьне гэтых абавязаньніцтваў.

Такім чынам гміны маюць даволі шырокі спэктар функцый. Поўны даход гмінаў складаў у 2000 г. 20,1% усіх дзяржаўных фінансаў (лічачы мясцовыя сродкі, рэгіянальныя, а таксама дзяржаўны бюджэт). 65 гарадоў з правамі паветаў атрымалі поўны даход у памеры 12,7% дзяржаўных фінансаў. Цягам апошніх гадоў перад гмінамі былі акрэсьленыя дадатковыя заданьні, але пры гэтым фінансаваньне не павялічылася. Такая сытуацыя пагражае зьменшыць станоўчыя вынікі рэформы мясцовых уладаў у Польшчы. У выніку гэта прыводзіць да памяншэньня інвэставаньняў на роўні мясцовых уладаў (прыкладам, з 26% у 1996 г. да 20% у 2000 г.). Зараз ідзе змаганьне мясцовай улады з цэнтральнай за тое, каб пакідаць у мясцовым бюджэце большы працэнт падаткаў.

**Паветы**

Гмінныя й павятовыя структуры складаюць у Польшчы лякальны ровень улады. Самакіраваньне на роўні павету было ўведзена „Законам пра павятовае самакіраваньне” ад 5 чэрвеня 1998 году. Жыхары павету ў адпаведнасьці з законам (аналягічна як і з гмінай) ствараюць самакіравальную супольнасьць. Такім чынам, павет — гэта мясцовая самакіравальная супольнасьць і адпаведная тэрыторыя, якая ўжыцьцяўляе вызначаныя законам агульнаграмадзкія заданьні ад свайго імя й на ўласную адказнасьць.

Уладкаваньне павету вызначаецца яго статутам. Як асноўная адзінка тэрытарыяльнага падзелу, павет агортвае ўсю тэрыторыю сумежных гмінаў (так званы земскі павет) альбо ўсю тэрыторыю гораду на правах павету. У сярэднім у склад павету ўходзіць каля 6 гмінаў. Уся-

го ў Польшчы 274 паветы. Рады паветаў таксама абіраюцца жыхарамі гмінаў, што складаюць павет. На чале павятовых упраўаў стаяць старасты. Самае галоўнае тое, што пры разьвязаньні пытаньняў, якія ёсьць кампэтэнцыяй гмінаў, павятовыя ўлады ня могуць мець вырашальнага голасу.

Павет выконвае агульнаграмадзкія заданьні, што вызначаныя законам, якія маюць надгмінны характар. Да іх адносяцца заданьні са сфэры дзяржаўнай адукацыі, дабрачыннасьці й аховы здароўя, сацыяльнай дапамогі, сямейнай палітыкі, падтрымкі асобаў з розумавымі адхіленьнямі, транспарту й шляхоў зносін, культуры й аховы культурных каштоўнасьцяў, фізычнай культуры й турызму. Акрамя таго, павет можа заключаць пагадненьні з органамі ўрадавай адміністрацыі для выкананьня дзяржаўных заданьняў са сфэры ўрадавай адміністрацыі, а таксама выконваць заданьні, даручаныя ім гэтымі органамі, зьвязаныя зь ліквідацыяй пагроз для бясьпекі й грамадзкага парадку, а таксама з абароназдольнасьцю. Самае важнае, што заданьні павету ня мусяць пярэчыць заданьням, якія тычацца сфэры дзейнасьці гміны.

Жыхары павету, як і гміны прымаюць рашэньні шляхам усеагульнага галасаваньня — у час выбараў альбо павятовага рэфэрэндуму.

Нагляд за дзейнасьцю павету ўжыцьцяўляе старшыня Рады Міністраў, а таксама ваявода, а ў сфэры фінансавых справаў — рэгіянальная лічыльная палата. Гэтак-жа, як і ў гміне, ужыцьцяўляюцца працэдуры нагляду й абароны асобаў, правы якіх былі парушаны пастановай, прынятай якім-небудзь органам павету. Трэба ўдакладніць, што „горад на правах павету” — гэта горад, які налічвае больш за 100 тысяч жыхароў, а таксама горад, які пасьля 31 сьнежня 1998 году перастаў быць рэзыдэнцыяй ваяводы. Хоць былыя ваяводзкія цэнтры маглі й адмовіцца ад такой мажлівасьці, застаўшыся земскім паветам.

### Ваяводзтвы

Рэгіянальны ровень улады й самакіраваньня — ваяводзтвы, якія складаюцца ў сярэднім з больш чым зь дзесяці паветаў. Усяго ў Польшчы пасьля адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы, якая была скіраваная на ўзбуйненьне, засталося 16 ваяводзтваў. Новы адміністрацыйны падзел быў уведзены з 1 студзеня 1999 году.

Галоўнае, што ваяводзтва, па-першае, гэта адзінка тэрытарыяльнага самакіраваньня — рэгіянальная самакіруемая супольнасьць, па-другое, найбуйнейшая адзінка асноўнага тэрытарыяльнага падзелу дзяржавы, утвораная з мэтай ужыцьцяўленьня функцый дзяржаўнай адміністрацыі. Ваяводзкае самакіраваньне выконвае агульнаграмадзкія заданьні ваяводзкага роўню, ня вызначаныя законамі як абавязкі органаў урадавай адміністрацыі. Сфэра дзейнасьці ваяводзкага самакіраваньня не парушае самастойнасьці павету й гміны. У адрозьненьне, скажам, ад абласных органаў у сёньняшняй Беларусі, ваяводзкія органы ў Польшчы ня ёсьць у дачыненьні да павету й гміны органамі вышэйшай інстанцыі ў адміністрацыйнай герархіі.

Ваяводзкае самакіраваньне ў Польшчы мае шлях толькі ў 7 год. Кожнае ваяводзтва мае свой соймік і ваяводзкую ўправу. На чале выканаўчай улады стаіць маршалак ваяводзтва. Улады мясцовага самакіраваньня ў ваяводзтве ёсьць незалежнымі ад прэзыдэнта й ураду краіны, а самі сваім парадкам ня могуць дыктаваць сваю волю ні павятовым, ні гмінным уладам. Для параўнаньня можна сказаць, што адпаведнікамі польскіх самакіравальных ваяводзтваў ёсьць францускія дэпартаманты, ангельскія графствы ці нямецкія лянды (землі).

Ваяводзкі соймік ёсьць сталым і кантрольным органам, кадэнцыя якога цягнецца 4 гады. У склад, прыкладам, сойміку Падляшскага ваяводзтва ўваходзяць 30 радных, якія абраныя ў наўпроставых выбарах. Прын-

цыпы й спосаб правядзеньня выбараў у соймік вызначаны законам ад 16 ліпеня 1998 году.

Выканаўчым органам ваяводзтва ёсьць ваяводзкая ўправа. У яе складзе 5 чалавек — маршалак як кіраўнік, яго намесьнік — віцэ-маршалак альбо два віцэ-маршалкі й іншыя сябры. Апошнім часам значная частка ваяводзкіх заданьняў перайшла да ваяводзкага самакіраваньня. А адным з галоўных заданьняў стаў пошук сродкаў з Эўразьвязу.

У цэлым польская сыстэма мясцовага самакіраваньня за апошнія 15 гадоў зазнала істотную трансфармацыю. Можна спрачацца сёньня пра дэталі ўкараненьня яе ў жыцьцё. Тая-ж адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа была праведзена не бяз хібаў. Але ў агульным стратэгія разьвіцьця, якая складалася ў адпаведнасьці з Эўрапэйскай хартыяй мясцовага самакіраваньня, была правільнай. Сёньняшняя сыстэма мясцовага самакіраваньня ў краіне мае досыць устойлівы характар, які мала залежыць ад зьмены палітычнай кан’юнктуры, а ўгрунтаваны пераважна на гаспадарчых дачыненьнях.

KAMUNIKAT.org

**Валеры Шчукін**

# Выбарчая сыстэма Беларусі й Польшчы

**(параўнаўчы аналіз спэцыяліста)**

Беларускія дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі парлямэнцкія й прэзыдэнцкія выбары ў Польшчы 2005 года называлі недэмакратычнымі. Дадзены тэзіс падмацоўваўся тэлекадрамі інтэрвію зь беларускімі пасольска-сэнатарскімі чыноўнікамі, якія назіралі за пройдзенымі выбарамі, і з польскімі грамадзянамі.

Магчымасьць наведаць Рэспубліку Польшча й самому ўнікнуць у тонкасьці выбарчага працэсу выдалася толькі пасьля выбараў. Зь вялікім задавальненьнем я скарыстаў выпадак. Тым больш, напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў, да аб'яўленьня якіх засталося менш за тры месяцы.

Адрозьненьне паміж выбарчымі сыстэмамі нашых дзяржаваў — прынцыповае. І ня толькі тым, што ў Польшчы выбарчыя працэдуры выкладзеныя ў чатырох законах аб выбарах: прэзыдэнта, парлямэнту, мясцовых органаў улады, рэфэрэндуму, а ў Беларусі зьве-

дзены ў адзіны дакумэнт — выбарчы кодэкс. Кадыфікацыя законаў — зьява станоўчая. Адрозьненьне — у сутнасьці асноўных выбарчых працэдур, прычым адрозьненьні такія, што „чыя-б карова мычала, абы беларуская Мілка маўчала”...

Беларускія дзяржаўныя СМІ ў якасьці галоўнага элемэнту „недэмакратычнасьці” выбараў у Польшчы называлі адсутнасьць у гэтай краіне інстытуту назіральнікаў. У той час, як, маўляў, у Беларусі прадугледжаны й унутраныя, і міжнародныя назіральнікі.

Сапраўды, міжнародныя назіральнікі ў Беларусі могуць быць. Аднак якія? Толькі тыя, якія запрошаны кіраўніком дзяржавы, парлямэнтам, Саветам Міністраў, Міністэрствам Замежных Справаў, Цэнтральнай Выбарчай Камісіяй.

Аднак дадзеныя структуры запрашаюць для назіраньня выбарчай кампаніі, за рэдкасным выключэньнем, толькі асобаў ляяльных да беларускага таталітарнага рэжыму. Назіральнікам з дэмакратычнымі поглядамі папросту адмаўляюць ва ўязной візе. Эўрапэйцы, у тым ліку й грамадзяне Польшчы, сутыкаліся з гэтым неаднаразова.

Выбарчы кодэкс Беларусі не прадугледжвае для палітычных партыяў, грамадзкіх арганізацыяў, кандыдатаў на выбарчыя пасады й іншых удзельнікаў выбарчага працэсу магчымасьці запрасіць міжнародных назіральнікаў самім.

Свайго роду „візавы” рэжым устаноўлены ў Беларусі й для назіральнікаў унутраных. Так, выбарчы кодэкс дэкляруе палітычным партыям, грамадзкім аб’яднаньням і проста грамадзянам права накіроўваць на выбары назіральнікаў. Аднак-жа выкарыстаць гэтую норму дэмакратычным (па тэрміналёгіі кіраўніка ўлады — „нячэсным”) суб’ектам выбарчай кампаніі вельмі праблематычна.

Дэмакратычных назіральнікаў участковыя выбарчыя камісіі не рэгіструюць. Вобразна кажучы, адмаўляюць, як і дэмакратычным міжнародным назіральнікам, ва

„ўязной візе". Толькі ўжо робіць гэта не Міністэрства Замежных Справаў, а мясцовыя органы вэртыкалі ўлады, якім цалкам падначалены прызначаныя ўчастковыя выбарчыя камісіі (без права выбаршчыкаў абскардзіць у судзе пэрсанальны склад прызначэнцаў).

Акрамя таго, наглядчык ад вэртыкалі (прэзыдэнцкіх структур кіраваньня) прысутнічае ў кожнай участковай камісіі, у тым ліку й пры падліку галасоў. І ня толькі прысутнічае: наглядчык ад вэртыкалі — лялькавод участковай камісіі.

У многіх беларускіх участковых выбарчых камісіях ад назіральнікаў аж уваччу рабаціць: ад саюзу моладзі „Лукамол" (БРСМ), дзяржаўнага прафсаюза „Козік" (ФПБ), мясцовага органа вэртыкалі, спэцслужб дзяржавы, прапрэзыдэнцкіх арганізацыяў вэтэранаў, афіцэраў, жанчын... У выніку ў памяшканьнях для галасаваньня, забітых пад завязку „чэснымі" назіральнікамі, „нячэсным" назіральнікам аказваецца ўжо не застаецца месца. Нават для назіраньня стоячы.

Калі ў Беларусі дэмакратычнаму назіральніку й удалося праравацца скрозь „візавае" сіта, то гэта зусім ня значыць, што яму дазволяць паназіраць за працэдурай падліку галасоў. Пры найменшай заўвазе, выказанай „нячэсным" назіральнікам, пад надуманнай ці справакаванай падставай дэмакратычнага назіральніка пазбавяць акрэдытацыі пры ўчастковай камісіі.

Нават калі дэмакратычны назіральнік і рота не раскрые, усё роўна працэдуры падліку галасоў ня ўбачыць.

Па-першае, падліку галасоў, у прамым значэньні гэтага слова, на выбарах у Беларусі ня робіцца. Лічаць шэптам, а сумуюць увогуле моўчкі, за асобным сталом, нават за межамі памяшканьня для галасаваньня й падліку галасоў.

Па-другое, атрад супрацоўнікаў міліцыі, які прыбывае ў памяшканьне для галасаваньня й падліку галасоў, і на „гарматны стрэл" не падпусьціць да стала зь бюле-

тэнямі ні дэмакратычнага назіральніка, ні даверaную асобу кандыдата. У Польшчы давераная асоба кандыдата (а гэта па сутнасці назіральнік) можа стаяць непасрэдна за сьпіной у членаў камісіі, а знаходжаньне паліцыі ўнутры выбарчага ўчастка забаронена.

Па-трэцяе, асабліва прасунутага назіральніка могуць, як паступілі з аўтарам гэтых радкоў на рэфэрэндуме 2004 года ў горадзе Віцебску, вынесьці з памяшканьня для падліку галасоў, увогуле без аніякага тлумачэньня.

Ня дзіўна, што Польшча ў назіральніках „беларускага ўзору” ня мае патрэбы. Насамрэч, навошта назіральнікі за дэмакратычнымі выбарчымі камісіямі ў краіне, дзе склад участковай камісіі да дзесяці чалавек, а дзевяць зь якіх вызначаюцца шляхам галоснай жараб’ёўкі зь ліку прадстаўнікоў партый, грамадзкіх арганізацыяў, груп грамадзянаў?

Толькі адзін член камісіі прызначаецца ад органа ўлады, ды й толькі як спэцыяліст у пытаньнях выбарчага права й ва ўзаемаадносінах з мэрыяй.

Навошта назіраць за камісіяй, члены якой не падначалены адзін аднаму па працы ці службе? Гэта толькі ў Беларусі старшыня ўчастковай камісіі — дырэктар (альбо намесьнік) якой-небудзь установы, арганізацыі, прадпрыемства, а члены камісіі — яго падначаленыя з гадавым кантрактам па працы ці па службе. Такі член камісіі рота не раскрые, каб запярэчыць, інакш застанецца бяз працы.

Беларускія дзяржаўныя СМІ даводзяць да чытачоў, гледачоў, слухачоў відавочна скажоную інфармацыю. Так, гэта праўда, што польскія выбарчыя законы не прадугледжваюць інстытут назіральнікаў. Так жа-ж і не забараняюць! Для прыкладу, беларускаму „сэнатару” (члену Савета Рэспублікі) Мікалаю Чаргінцу назіраць за выбарамі не перашкаджалі. Гэтаму самаму заканадаўцу, які пасьля з экрана Беларускага Тэлебачаньня паўпраўду выдаваў за праўду. У прыватнасьці, пра пасіўнасьць паля-

каў, пра вельмі нізкую яўку выбаршчыкаў на ўчасткі для галасаваньня.

Сапраўды, польскія лічбы яўкі выбаршчыкаў (па Беластоку) у параўнаньні зь беларускімі, відавочна ніжэйшыя: на парлямэнцкіх — 39, на прэзыдэнцкіх (другі тур) — 47 працэнтаў. Але гэта сярэднія лічбы. Мінімальныя ў Беластоцкім ваяводзтве — 31-33 працэнты. Прычым мінімальныя лічбы былі на ўчастках для галасаваньня, дзе пражываюць этнічныя беларусы. Беларускі заканадаўца Чаргінец настолькі павальную пасіўнасць на выбарах менавіта беларусаў „не заўважыў”.

Больш чым дзесяцігадовы вопыт удзелу ў выбарчых кампаніях дае мне падставу меркаваць, што было-б у Беларусі галасаваньне добраахвотнае, то лічбы яўкі на выбарчыя ўчасткі былі-б ніжэйшыя за польскія. Але-ж беларускіх выбаршчыкаў гоняць на выбары прымусова, пад пагрозай пазбаўленьня працы, месца ў інтэрнаце й т.п.

Гэта — у горадзе. У калгасна-саўгаснай беларускай вёсцы яшчэ страшней: ня пойдзеш галасаваць — жывёла застанецца бяз корму. А ў многіх сельскіх выбаршчыкаў заробку й на кавалак хлеба не хапае. Гэтага ня скажаш пра даходы „некалектывізаваных” польскіх сяльчанаў.

Прычым гнаць на ўчасткі для галасаваньня паднявольных беларускіх выбаршчыкаў пачынаюць ужо за тыдзень да нядзельных выбараў (з аўторка). Польскія выбаршчыкі ў гэтых адносінах цалкам свабодныя. У Польшчы няма датэрміновых выбараў. Няма й галасаваньня дома. Галасуюць толькі на выбарчым участку й толькі адзін дзень. Галасаваньне па-за межамі выбарчага ўчастка дапускаецца толькі ў шпіталях і сацыяльных установах (дом вэтэранаў і т.п.). Аднак і тут вельмі важнае адрозьненьне: галасаваньне выбаршчыка, прыкаванага да ложка, адбываецца ў папярэдне агавораны час, сам участак для галасаваньня на гэты пэрыяд зачыняецца, а выбарчая камісія не камплектуецца зь ліку работнікаў адміністрацыі гэтай установы. Выключэньне па часе галасаваньня было

зроблена на рэфэрэндуме 2003 года па ўступленьні Польшчы ў Эўразьвяз: тады галасавалі два дні. Але гэта рабілася па спэцыяльнаму закону. На астатніх рэфэрэндумах галасаваньне працягваецца ўсяго адзін дзень.

Увогуле ў Польшчы рэфэрэндумамі не захапляюцца. Папярэдні праводзілі ў 1997 годзе, аналягічна беларускаму рэфэрэндуму 1996 года па канстытуцыі. Аднак падабенства на гэтым канчаецца. Палякі добраахвотна галасавалі на рэфэрэндуме за праект Канстытуцыі, разгледжаны ў парлямэнце па кожным артыкуле.

Беларусаў прымусілі галасаваць за канстытуцыю з дыктатарскімі паўнамоцтвамі кіраўніка дзяржавы, напісаную ананімным аўтарам, без папярэдняга разгляду заканадаўцамі.

Галасаваньне пад прымусам — відавочнае сьведчаньне антыдэмакратычнасьці кіруючага рэжыму. Ды нават пад прымусам беларусам не даюць галасаваць за „сэнатараў" (членаў верхняй палаты парлямэнту). Польскія выбаршчыкі маюць магчымасьць абіраць іх пэрсанальна.

Беларускія выбаршчыкі такой магчымасьці пазбаўлены начыста. Нават кандыдатаў у верхнюю палату вылучаюць прэзыдэнцкія структуры ўлады. А частку „сэнатараў" кіраўнік беларускай улады прызначае асабіста. У першую чаргу — старшыню верхняй палаты.

Не абраны, а прызначаны „сэнатарам" таксама вышэйзгаданы Мікалай Чаргінец. Таму ўсё, што гучыць з вуснаў гэтага беларускага назіральніка, ня можа супярэчыць меркаваньню кіраўніка беларускай улады.

Галасаваньне пад прымусам можа выклікаць бунт. Беларускія ўлады, каб пазьбегнуць гэтага, завозяць на выбарчыя ўчасткі (а гэта, як і ў Польшчы, у асноўным школы) спіртное, якое прадаюць на разьліў. У Польшчы такое недапушчальна. Тут на выбарчых участках увогуле буфэта няма.

Натуральна, адносіны да свайго волевыяўленьня цьвярозага польскага выбаршчыка некалькі адрозьніваецца

ад пафіговага галасаваньня „астаграмленага” на выбарчым участку беларуса.

У Беларусі шмат кажуць пра фальсыфікацыю вынікаў галасаваньня. Выбарчыя камісіі Польшчы дагодліва падтасоўваць вынікі волевыяўленьня народа асьцерагаюцца, таму што за гэта прыцягваюць да крымінальнай адказнасьці, чаго ня скажаш пра Беларусь, дзе за ўсе тры тэрміны (12 гадоў) знаходжаньня пры ўладзе цяперашняга кіраўніка ні адзін член выбарчай камісіі, выкрыты ў парушэньні выбарчага закону, да крымінальнай адказнасьці не прыцягнуты.

Беларускі выбарчы кодэкс не прадугледжвае нават магчымасьці ўзбуджэньня крымінальнай справы ў дачыненьні да членаў выбарчай камісіі.

Адрозьненьне выбарчых сістэм ёсьць і ў фінансаваньні выбараў. Кандыдаты й партыі Польшчы, якія ўдзельнічаюць у выбарах, бяруць на выбарчую кампанію банкаўскі крэдыт, які пасьля выбараў вяртаецца. Ня ўсім, праўда, а толькі тым, хто набраў больш за тры працэнты галасоў. Не вяртаюцца затраты кандыдатаў і на мясцовых выбарах.

На мой погляд, відавочна лепш за беларускі варыянт.

Дадзены артыкул не зьяўляецца поўнамаштабным аналізам выбарчых сістэм Беларусі й Польшчы. Прааналізаваны, да й то не ў поўным аб’ёме, тэарэтычна, без праверкі на практыцы толькі асобныя моманты. Аднак ужо гэтага дастаткова, каб убачыць дэмакратычнасьць выбарчай сыстэмы Польшчы ў параўнаньні зь беларускай.

**Зьміцер Дрыгайла**

# Самі сабе кааліцыя

**(аналіз 90 дзён кіраваньня ПіС зь Беларусі)**

Хутка скончацца першыя тры месяцы, падчас якіх у Польшчы валадарыць адна партыя, а фактычна — два браты-блізьняты, што стаялі ля вытокаў гэтай партыі. Права й Справядлівасьць (ПіС) усё ўзяла сабе, перамогшы на парлямэнцкіх, а затым — і на прэзыдэнцкіх выбарах. Спроба кааліцыі з Грамадзянскай Плятформай (ГП) сарвалася. Фармальна ўтварыўся ўрад меншасьці. Фактычна-ж — урад адной партыі — партыі братоў Качынскіх Права й Справядлівасьць. Ва ўрадзе толькі некалькі пазыцыяў (напрыклад, МЗС ці ахова здароўя) не належаць ПіСу.

Нагадаем, правыя партыі атрымалі пераканаўчую перамогу й на парлямэнцкіх выбарах у Польшчы. З тых 460 месцаў, якія ёсьць у польскім Сойме, 322 атрымалі тры правыя партыі — кансэрватыўная Права й Справядлівасьць (155), якая зьяўляецца партнэрскай партыяй БНФ „Адраджэньне”, лібэральная Грамадзянская Плятформа (133) і ўльтракаталіцкая Ліга Польскіх Сем’яў (34).



kamunikat.org

У 2005 годзе ў Польшчы ўпершыню склалася так, што ў адзін год абіралі й прэзыдэнта, і абедзьве палаты парлямэнту — Сойм (460 дэпутатаў па прапарцыйнай сыстэме) і Сэнат (100 дэпутатаў — аднамандатнікаў). Паўнамоцтвы прэзыдэнта доўжацца 5 гадоў, парлямэнту — 4, то-бок раз на 20 гадоў такое цяпер будзе адбывацца (адлік ідзе зь 1989 году, калі адбыліся першыя адносна свабодныя выбары). У 1990 годзе першым прэзыдэнтам III Рэчы Паспалітай стаў кандыдат „Салідарнасьці" Лэх Валэнса, у 1995 г., а затым і ў 2000 г. перамогу сьвяткаваў прадстаўнік посткамуністаў Аляксандар Кваснеўскі. Зараз перамогу ізноў атрымаў правы кандыдат.

Такім чынам, канфігурацыя для ПіС стабільная. ПіС — маналіт, кіраваны жалезнай рукой Яраслава Качынскага — сапраўднага майстра палітычных гульняў. Зараз ён камбінуе, спрабуючы прыбраць з палітычнай сцэны партыі-сатэліты, сваіх „малодшых палітчыных канкурэнтаў", і стварыць стабільную двухпартыйную сыстэму, у якой ПіС выступае правобразам Рэспубліканскай Партыі ЗША ці Кансэрватыўнай Партыі Вялікай Брытаніі. Зараз ПіС трымае такім чынам „за горла" Лігу Польскіх Сем'яў (ЛПС), а таксама сацыялістаў з Саюзу Лявіцы Дэмакратычнай (СЛД). Адзінае, каго перапапулізаваць цяжкавата — гэта лідэра Самаабароны Анджэя Лепэра. Яго зараз спрабуюць „сьпіхнуць на маргінэс", а з Грамадзянскай Плятформы зрабіць левалібэралаў.

Як гэта магчыма? 23 сьнежня ўступіў у свае правы Лех Качынскі. Парлямэнт працуе без вялікіх скандалаў. І калі пасьля выбараў казалі, што ўрад меншасьці доўга не пратрывае, дык зараз, хіба, большасьць разумее, што ПіС — гэта ўсур'ёз і надоўга. Партыя дагэтуль нічога ня страціла ў сваіх пазыцыях, нават дадаўшы да сабе 5-7% прыхільнікаў. А наступныя выбары адбудуцца толькі восеньню 2006 года — у мясцовыя органы ўлады. Існуе, праўда, варыянт датэрміновых парлямэнцкіх выбараў. Ідучы на гешэфты з ЛПС і іншымі дробнымі

партыямі, ПіС адцягвае іх электарат да сабе. Займаючы пасады ва ўрадзе й парлямэнце, Самаабарона і ЛПС адначасова й непазьбежна трацяць свой электарат, зьліваючыся зь ПіС (электарат меншых распушчаецца ў электарацe большых), і калі-б выбары адбываліся сёньня, дык ПіС атрымаў бы 43% . Зразумела, што лібэральным асяродкам, блізкім да Плятформы, гэтыя гульні рэзка не падабаюцца, але яны нічога зрабіць ня ў стане, бо пасьля прэзыдэнцкіх выбараў сваімі рукамі адсеклі сябе ад рэальнай палітыкі, не пагадзіўшыся ўвайсьці ва ўрад (ПіС прапаноўваў парытэт 8 + 8) і зацягнуўшы гандаль з кіраўніцтвам парлямэнту. Вось і двухпартыйная сыстэма. Так што ініцыятыва Качынскага — „разваліць” астатнія партыі.

Дарэчы, сёньняшняя палітычная канфігурацыя на правым флянгу польскай палітыкі паўстала ў 2001 годзе, пасьля паразы правых на парлямэнцкіх выбарах. Грамадзянская Плятформа — нашчадак правалібэральнай партыі Вунія Свабоды, часткі кааліцыі Акцыя Выборча Салідарнасьць. А партыя Права й Справядлівасьць — выключна праект братоў Качынскіх. Яны на пачатку 1990-х гадоў былі паплечнікамі Валэнсы, а потым часова пайшлі ў цень. Але-ж напрыканцы 1990-х гадоў нечакана прэм’ер Ежы Бузэк прапаноўвае Леху Качынскаму пасаду міністра юстыцыі і той, дзякуючы сваёй радыкальнай, рэзкай, агрэсіўнай рыторыцы (шмат хто са знаўцаў польскага „палітычнага рынку” ў Беларусі кажа пра Качынскага, што гэта — такі сабе „польскі Зянон Пазьняк”) становіцца досыць папулярным на фоне агульнага заняпаду даверу грамадзкасьці да ўраду Бузка.

Гэнкім парадкам, ПіС доўга фармуе ўрад, адміністратыўны апарат дагэтуль не сфармаваны, бо ПіСаўцы рэзонна не давяраюць большасьці адміністратыўнага апарату па краіне, які застаўся ад лявіцы. Пакрысе адбываецца замена супрацоўнікаў у міністэрствах і ведамствах. У канцылярыі Рады Міністраў 400 супрацоўнікаў і фак-

тычна людзей няма, усе ў працэсе. Лявіца, дарэчы, досыць спакойна прымерыла да сябе адзеньне апазыцыі і заняла вельмі зручнае — суцэльна крытычнае — стаўленьне. Такая пазыцыя, лічаць стратэгі сацыял-дэмакратаў, у пэрспэктыве толькі дадасьць ім галасоў. Ад пачатку такі сцэнарый прапанаваў нядаўні лідар левых Уладзімеж Цімашэвіч заявіўшы, што пасьля ўласнага сыходу з прэзыдэнцкай кампаніі ён ня будзе галасаваць увогуле з прычыны „нябачнасьці дастойных кандыдатаў". Такім чынам, уся праца лявіцы зараз зводзіцца да наступнага: крытычны маніторынг крокаў ПіСу й Плятформы; адсочваньне іх праграмы й зьменаў у ёй, аб'яднаньне ўсіх левых сілаў з пэрспэктывай поўнага паяднаньня да мясцовых выбараў; атрыманьне максымуму месцаў у гмінах, паветах і ваяводзтвах; пазыцыянаваньне сябе як патэнцыйнага сябра чалавека ва ўладзе. Плюс канцэпцыя абнаўленьня, якую ўвасабляе сабой новы малады лідар — Януш Аляйнічак.

Эканамічную праграму ПіС левыя амаль не крытыкуюць. Бо, як ні дзіўна, у Права й Справядлівасьці левацэнтрысцкая эканамічная плятформа: па-першае, ПіС выступае не за лінейны, а за прапарцыйны падаходны падатак. Калі сказаць коратка, дык кіраўнікі ПіСу лічаць, што „багатыя павінны плаціць у бюджэт болей", па-другое, яны выступаюць за падатковыя ільготы й дзяржаўную дапамогу бедным, і па-трэцяе, не зьбіраюцца адмаўляцца ад польскага злотага (лібэральная Грамадзянская Плятформа, наадварот, агітавала за памяншэньне ролі дзяржавы, увядзеньне эўра й адзінай стаўкі падатку ў 15% для ўсіх).

Грамадзянская Плятформа пасьля выбараў стаяла на мяжы расколу. Асноўны канфлікт быў паміж Дональдам Тускам і Янам Ракітам. На Туска склалася адказнасьць за тое, што здарылася. Зараз яны распрацавалі эканамічную праграму, стварылі ценевы кабінэт на чалезь Янам Ракітам. Такое сабе „якой магла-б быць экана-

мічная праграма, калі-б ГП прыйшла да ўлады". І адначасова гэтая праграма была прапанаваная ПіСу — маўляў, бярыце, карыстайцеся: у ПіСу-ж эканамічная плятформа відавочна слабейшая за Плятформу з-за нашмат меншай колькасьці абазнаных эканамістаў.

А што-ж сам ПіС? Рэзанансных скандаляў за гэтыя тры месяцы не адбылося. За гэты пэрыяд было анансавана некалькі ініцыятываў. Першая зь іх — люстрацыя (прадстаўнікоў, што працавалі на польскую дзяржаву часоў ПНР), скасаваньне люстрацыйнага суду й перадача гэтай галіны ў Інстытут Нацыянальнай Памяці. Пайшлі чысткі ў органах унутраных справаў і спэцслужбаў, якія працавалі ў часы ПНР, але не на ўрадавым, а на ведамасным узроўні. Таксама была агучана громкая ініцыятыва сумесна з ЛПС пра выплату дапамог пры нараджэньні дзіцяці — роўных і аднолькавых. Фактычна, праўда яна (часова?) сышла на „не", бо ў тым выглядзе, у якім яна прапаноўвалася — гэта 500 злотых на дзіця (недзе па 165 даляраў) і то толькі ў тых сем'ях, дзе даход вельмі малы.

У прынцыпе-ж здарылася тое, што й абяцалі прадстаўнікі Права й Справядлівасьці ў першую чаргу — ачышчэньне грамадзтва, падтрымка сям'і й прасямейная палітыка. У праекце бюджэту на наступны год закладзеныя значна большыя сродкі на культуру, музэі.

У дачыненьні да нацыянальных меншасьцяў згодна з законам зьменаў не было прадугледжана. Але неафіцыйна ПіСаўскі ўрад хоча дамовіцца зь беларускай меншасьцю, якая традыцыйна левая, пра тое, каб паспрабаваць перацягнуць яе на свой бок — цераз зносіны з правымі коламі беларускай меншасьці, што з большага знаходзіцца пад дахам Саюза Беларусаў Польшчы (арганізацыяй кіруе Яўген Вапа). Скажам, даводзілася чуць плётку, што прэм'ер-міністар Казімеж Марцінкевіч пляуе прыехаць ці ў Бельск, ці ў Гайнаўку пад праваслаўнае Божае Нараджэньне й выступіць з прабе-

ларускай прамовай. Магчыма, нарэшце адбудуцца пэўныя пазытыўныя зрухі са справай „Нівы” — газэты беларусаў Польшчы, якую некалькі месяцаў таму абвінавацілі ў фінансавых махінацыях. Магчыма, ад урадавых колаў Польшчы паступіць прапанова яе перагледзець. Адначасова на Беласточчыне ў цэрквах сталі прамаўляць казаньні па-польску (раней было па-расейску). Пытаньні-ж адкрыцьця ў Варшаве „Беларускага дому” так і падвісьлі ў паветры.

Такім чынам, магчымасьць новых парлямэнцкіх выбараў ужо ўвесну 2006 года зараз ня выключана, калі гэта ўпісваецца ў доўгатэрміновыя стратэгіі Яраслава Качынскага. Прычына — на паверхні: немагчымасьць зацьвярджэньня бюджэту. А парлямэнцкія выбары могуць быць толькі, калі Сойм тэрмінова ня ўхваліць бюджэту і давядзецца распускаць альбо ўрад, альбо Сойм. У парлямэнце зараз утварылася „нефармальная” большасьць у складзе ПіС, ЛПС, Самаабароны. Праўда, як гэта будзе выглядаць, калі зь ініцыятывы ПіС не зацьвярджаецца бюджэт, які сам-жа ПіС і распрацаваў. У кожным разе бюджэт на 2006 год будуць разглядаць у студзені і зараз магчымыя любыя варыянты. Чакаем.

KAMUNIKAT.org

# грамадзтва

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

Алена Сіневіч

# Падляшша пад знакам эўра

**Бізнэс высокіх тэналёгіяў замяніў гандаль „на дыванку”**

З уваходам Польшчы ў Эўразьвяз бізнэс у гэтай краіне падзяліўся на дзьве часткі. „Слабыя мусяць загінуць, а моцныя —ісьці далей”, — гавораць на Падляшшы, у бліжэйшым да Беларусі ваяводзтве.

Гарадзенцы выдатна памятаюць тыя часы, калі пачала разьвівацца прадпрымальніцкая ініцыятыва ў часы постперабудовы. Шчыльнымі шэрагамі палякі рушылі праз усходнюю мяжу прапаноўваць згаладалым па шыр-спажыве беларусам шмоткі, жуйкі й іншую дробязь. Беларусы-ж, сваім парадкам, гандлявалі ў Польшчы бытавымі электравырабамі, тэлевізарамі ды іншым.

**Палякі больш не гандлююць джынсамі**

Супрацоўнік рэспэктабельнай арганізацыі зь Беластоку Падляшскі Фонд Рэгіянальнага Разьвіцьця (Podlaska Fundacja Rozwoju Regionalnego) Адам Камінскі гаворыць, што сам некалі ездзіў за бацькамі на рынак у Гародню падпрацаваць „гандлем на дыванку”, значыць, дробным ган-

длем проста на зямлі, падсцяліўшы пад тавар дыванок альбо кавалак тканіны. Да 90 адсоткаў малога бізнэсу памежжа было такім „гандлем на дыванку".

— Дэфолт у 1998 годзе, увод візавага рэжыму зь Беларусьсю й пераарыентацыя эканамічных сувязяў на Захад прывялі да таго, што кошты на прадукты, адзеньне, бытавую хімію й іншыя тавары па абодва бакі мяжі выраўняліся, — гаворыць Адам. — У выніку дробныя гандляры, у тым ліку й наша сям'я, кінулі гандляваць джынсамі ў Гародні.

Сотні дробных фірмаў на Падляшшы тады збанкрутавалі. Буйныя баяліся гандляваць ва ўсходнім кірунку, бо асцерагаліся няўстойлівага эканамічнага становішча. Аднак, з адкрыцьцём усходняй мяжы Польшчы прыйшлі новыя інструманты падтрымкі дзелавой актыўнасьці.

**Мільённыя інвэстыцыі з Захаду**

У Польшчу прыйшлі вялікія інвэстыцыі. Некалькі дзясяткаў мільёнаў эўра інвэставалі структуры Эўразьвязу ў Падляшскае ваяводзтва цягам апошніх год. Бальшыня фінансавых плыняў ідзе праз Падляшскі Фонд Рэгіянальнага Разьвіцьця (ПФРР). Як распавёў экспэрт датацыйных кантрактаў ПФРР Кшыштаф Урвановіч, фонд дае чатыры тыпы дапамогі для прадпрымальнікаў: кансультацыі, інфармацыйнае забесьпячэньне, навучальныя праграмы й фінансаваньне бізнэс-праектаў. Што тычыцца фінансаваньня, то кожная фірма можа атрымаць датацыю на закуп абсталяваньня, субсыдыі й забесьпячэньне банкаўскага крэдыту. Лякальныя праграмы PHARE, што працавалі з 2000 да 2003 году, дазволілі прафінансаваць больш за 800 прадпрымальнікаў на больш чым дзесяць мільёнаў даляраў. Праграмы Эўразьвязу SPO-WKP 2.3, што стартавалі ў 2004 годзе, могуць прынесьці ў якасьці інвэстыцыяў у бізнэс на Падляшша каля 1,4 мільярда злотых. Аднак грошы будуць накіраваныя толькі моцным, высокатэхналягічным фірмам. Слабыя ня могуць разьлічваць на фінансавыя ўліваньні.

Цяпер бізнэс польскага памежжа разьвіваецца шляхам інтэграцыі ў Эўропу. Ільвіную долю эканомікі займаюць турызм і агратурызм, а таксама харчовая вытворчасьць. Каўбасныя заводзікі, малочныя фэрмы, пякарні штогод павялічваюць абароты. Да 16 адсоткаў продажу малака ў Польшчы забясьпечвае Падляшскае ваяводзтва. Попыт на гэты прадукт у краінах Эўразьвязу такі вялікі, што квоты паставак польскіх малочных прадуктаў у 2005 годзе павялічыліся на 10 адсоткаў. Хуткімі тэмпамі ідзе разьвіцьцё машыннай электронікі, новых тэхналёгій, дрэваапрацоўчай прамысловасьці. „Гаспадары збанкрутаваных невялічкіх фірмаў і былыя дробныя гандляры сталі спачатку беспрацоўнымі, — гаворыць Кшыштаф Урвановіч. — Але цяпер яны пайшлі працаваць у буйныя пасьпяховыя кампаніі, у выніку чаго беспрацоўе ў рэгіёне зьменшылася на чатыры адсоткі й цяпер складае 14%”.

Акрамя таго адсутнасць візавага рэжыму дазваляе палякам прапаноўваць свае будаўнічыя паслугі ў Бэльгіі, Францыі, Нямеччыне. Пяць-дзесяць тысячаў жыхароў Падляшша штогод знаходзяць працу ў краінах Эўропы. Да слова, калі за адну гадзіну працы будаўнік у Польшчы атрымае 6-7 злотых, то за заходняй мяжой — ужо 6-9 эўра.

Камэрцыйная фірма SALAG з Сувалак працуе ў свабоднай эканамічнай зоне, падобнай на беларускую СЭЗ „Гроднаінвэст”. Да нядаўняга часу яна экспартавала большую частку прадукцыі, у ліку якой і мэбля, у Беларусь. Аднак цяпер з 40 адсоткаў экспартнай прадукцыі ў Беларусь ідзе вельмі невялікая яе колькасьць і толькі тое, што не выпрабляецца там. Інвэстыцыя Эўразьвязу ў гэтае прадпрыемства склала 750 тысяч злотых, што дазволіла прыдбаць цалкам мэханізаваную лінію па вытворчасьці спэцыяльных плінтусаў для ізаляцыі сеткавых кабеляў і электраправадоў. За ноў-хаў фірма атрымала нядаўна „Мэдаль вынаходніцтва” ад бэльгійскай каралевы.

### Пачатак паклала Брытанія

Пачатак на шляху эўрапэйскіх інвэстыцыяў у Польшчу паклала ў 1989 годзе Вялікая Брытанія. Як расказвае старшыня савета ПФРР Анджэй Парафінюк, менавіта ў гэты час багатыя эўрапэйскія краіны арганізавалі фонд стабілізацыі злотага, уклаўшы 1 мільярд даляраў. Злоты ўтрымаўся, мільярд застаўся цэлым. За дзесяць год сума вырасла да 20 мільярдаў даляраў. Гэтыя грошы пастанавілі скіраваць на разьвіцьцё бізнэсу ў двух польскіх ваяводзтвах з цэнтрамі ў Беластоку й Любліне. Беластоку дасталося пакуль што 9,5 мільёна.

У Беластоку й яго ваколіцах куды ні кінь вокам — паўсюдна сустракаеш бэнэфіцыянтаў эўразьвязаўскіх датацый. Па дарозе на мэблевую фабрыку Анджэя Пракопчыка, што ў мястэчку Васількаў, у некалькіх кілямэтрах ад Беластока, Кшыштаф Урвановіч цэлы час ня мог утрымацца, каб не пахваліцца: „А то наш бэнэфіцыянт… й то тэж!” І праўда, за 15 хвілін язды нас абагнаў грузавічок прыватнай камунальнай службы, мы мінулі завод па перапрацоўцы сьмецьця, дылера „Нісана”, некалькі пякарняў і шэраг іншых прадпрымальніцкіх структур са значкамі Эўразьвязу.

### Бар’еры на шляху мэблі

„Zakład Stolarski — Andrzej Prokopczyk” некалі пачынаў справу сумесна з адным з найбуйнейшых прыватных мэблевых вытворцаў у Гародні. Схема простая: мы ім — драўніну, яны нам — мэблю й пліту. Супрацоўнічалі зь імі й дробныя мэбляры, што завозілі ў Гародню дэталі для кухняў і зьбіралі гарнітуры на кватэрах. Цяпер усё зьмянілася. „Мы зацікаўленыя ў кантактах зь Беларусьсю, — гаворыць уласнік мэблевай фабрыкі Анджэй Пракопчык. — Аднак вазіць мэблю альбо сыравіну мы ня можам з-за высокіх мытных пошлін. Тры эўра з кілаграма — такая плата робіць сумесны бізнэс нерэнтабельным”.

Зь ліку 30 машын на фабрыцы чатыры набылі за эўрапэйскія грошы. Адзін супэрсучасны фрэзер каштуе 200

тысяч эўра. Яго абслугоўваюць толькі два чалавекі. Як заўважыла кіраўніца вытворчасьці Эва Яроцка, закуп сучаснага абсталяваньня дазволіў павялічыць продаж мэблі на 20-30 адсоткаў. „Зьніклі памежныя бар’еры з Эўропай, — гаворыць яна. — У нас практычна няма канкурэнтаў за мяжой. 95 адсоткаў сёньня ідзе на экспарт у краіны Балтыі — Летуву, Латвію, Эстонію. Штодзень фірма вырабляе 75 кухняў”.

Галоўныя цяжкасьці на шляху выхаду на эўрапэйскі рынак для польскіх прадпрымальнікаў — гэта неабходнасьць атрымаць эўрапэйскія сэртыфікаты якасьці. Толькі наяўнасьць значкоў НАССР, ІСО, СЕ даюць права прадаваць прадукцыю на Захадзе. Цяпер большыня польскіх вытворцаў ужо атрымалі гэтыя сэртыфікаты, пасля чаго экспарт значна ўзрос. Аде расходы на сэртыфікацыю й пастаянны кантроль якасьці пад сілу толькі буйным і моцным фірмам.

KAMUNIKAT.org

**Аляксандар Дварэцкаў**

# Стан польскага турызму

**(на прыкладзе Падляшскага ваяводзтва)**

У апошнія гады турыстычная галіна стала набываць усё больш важнае значэньне для польскай гаспадаркі, а ў некаторых рэгіёнах краіны нават і стратэгічна важнае значэньне. Прыкладам гэтага можа быць Падляшскае ваяводзтва, якое, ня маючы вялікіх прамысловых рэсурсаў, зрабіла акцэнт на разьвіцьцё турызму ў рэгіёне.

**Зьмены ў Польшчы**

Пасля 1989 году, калі Польшча ступіла на капіталістычны шлях, у краіне адбылося вельмі шмат зьменаў, якія, канешне-ж, закранулі й турыстычную гаспадарку. Перш за ўсё зьмянілася само стаўленьне да турызму з боку ўладаў. У Польшчы зразумелі, што дзякуючы гэтай галіне можна ня толькі штогод значна папаўняць бюджэт, але й ствараць новыя працоўныя месцы, разьвіваць інфраструктуру й нават прамаваць краіну ў сьвеце. Як грыбы пасьля дажджу сталі паўставаць новыя аб'екты турыстычнай інфраструктуры (гатэлі, пансіянаты, прыватныя агратурыстычныя гаспадаркі, рэстарацыі, кавярні й г.д.). Пры гэтым якасьць паслуг увесь

час падвышаецца. Адначасова ў краіне значна ўзрасла колькасьць розных культурна-забаўляльных мерапрыемстваў (фэстываляў, кірмашоў народных майстроў і г.д.), у заданьне якіх таксама ўваходзіць прыцягненьне турыстаў. Зьмянілася таксама й стаўленьне да турызму з боку простых палякаў. Замест працяглых выездаў на мора ці звычайных групавых аўтобусных экскурсіяў яны цяпер усё больш выбіраюць кароткія (пераважна па ўік-эндах), але частыя падарожжы ў іншыя рэгіёны краіны, а таксама актыўны адпачынак у выглядзе роварвых ці пешых рэйдаў і паходаў на байдарках.

**Прамаваньне турызму**

Прамаваньне турызму па сутнасьці й стала галоўнай прычынай зьменаў у турыстычнай галіне. У 90-ыя гады ў Польшчы былі ўтвораны шэраг агульнакраёвых турыстычных арганізацыяў (прыкладам Польская Турыстычная Палата ці Польская Турыстычная Арганізацыя), якія мелі за заданьне разьвіваць турыстычную гаспадарку ў краіне й прамаваць у сьвеце яе турыстычныя атракцыі. Акрамя таго ў кожным ваяводзтве былі створаны рэгіянальныя турыстычныя арганізацыі, а пры органах мясцовага самакіраваньня ўтварыліся аддзелы прамаваньня рэгіёну. Дзякуючы плённай працы гэтых структур Польшча была „адкрыта” сьвету, былі ўтвораны й выпрамаваны агульнапольскі турыстычны прадукт і вялікае мноства рэгіянальных і лякальных прадуктаў. Заходнія турысты, а стаўка была зроблена якраз на іх, даведаліся, што краіна мае мноства разнастайных атракцый. Акцэнт быў пастаўлены на прыроду — лясы, горы, рэкі й азёры. Для іх прамаваньня ў сьвеце Польская Турыстычная Арганізацыя адкрыла 11 сваіх прадстаўніцтваў у Эўропе, а таксама па аднаму ў Японіі й Злучаных Штатах Амэрыкі.

Па словах Ядвігі Дамброўскай, кіраўніцы аддзела турызму Дэпартаманта Турызму й Спорту Маршалкоўскай Упарвы Падляшскага Ваяводзтва, кожны год у працы над стварэньнем пляну прамаваньня рэгіянальных ат-

ракцый бяруць удзел усе зацікаўленыя суб’екты, у тым ліку й прыватныя фірмы. Партнэрскія адносіны паміж імі захоўваюцца й падчас шматлікіх турыстычных таргоў, калі ўсе суб’екты турыстычнай гаспадаркі рэгіёну працуюць на адну агульную мэту — прывабіць турыста ў дадзеную мясцовасьць.

Мясцовыя ўлады зразумелі таксама, што на турызьме можна зарабіць толькі ўклаўшы ў яго грошы. Таму ўвесь час растуць выдаткі на рэклямныя матэрыялы, якія, дарэчы, выдаюцца на сямі мовах. Прыкладам, у гэтым годзе на розныя выданьні (агульныя й тэматычныя ўлёткі, буклеты, каталёгі, інфарматары й г.д.) і сувэнірную прадукцыю (асадкі, календары, торбы й г.д.), што распаўсюджваюцца абсалютна задарма, зь бюджэту Маршалкоўскай Управы Падляшскага Ваяводзтва было выдаткавана каля 70 тысяч даляраў. Калі да гэтай лічбы дадаць выдаткі на прамоцыю іншых дзяржаўных і недзяржаўных структур і турыстычных бюро, то атрымаецца значная сума. Да таго-ж актыўна выкарыстоўваюцца сродкі з Эўразьвязу. За эўрапэйскія грошы ў ваколіцах Сувалак будуецца цэнтар зімовых відаў спорту „Шэльмэнт”, а ў бліжэйшым часе распачнецца будова Падляшскай Опэры ў Беластоку. У плянах таксама значыцца пабудова за сродкі Эўразьвязу аэрапорту.

Адным з эфэктыўных спосабаў прамаваньня Падляшша ёсьць таксама студыйныя візыты замежных журналістаў, якія пішуць артыкулы ці здымаюць рэпартажы на агульныя ці спэцыялізаваныя (прыкладам, прырода рэгіёну, драўляная архітэктура ці мясцовая кухня) тэмы. Усе выдаткі пры гэтым аплачвае Дэпартамант Турызму й Спорту, што й так для яго значна таньней, чым замаўляць артыкулы ў заходняй прэсе. І гэта прыносіць свой плён. У 2003 і 2004 гг. Падляшскае ваяводзтва наведвала штогод больш за 1 мільён замежных турыстаў і крыху менш за 2 мільёны польскіх турыстаў. Таму там даходы ў бюджэт ад турыстычнай галіны займаюць да-

волі высокае месца — у падляшскім бюджэце гэта сёмая па велічыні крыніца прыбыткаў.

Акрамя таго ў польскіх гарадах і папулярных турыстычных мясцовасьцях створаны цэнтры турыстычнай інфармацыі, якія служаць пераважна індывідуальным турыстам. У іх, як на месцы, так і праз тэлефон ці электронную пошту можна атрымаць асноўную інфармацыю аб рэгіёне: дзе лепей пераначаваць, якія варта ўбачыць турыстычныя атракцыі ў мясцовасьці, дзе зьесьці абед ці адпачыць, а дзе вечарам і пабавіцца.

**Турыстычная інфраструктура Падляшша й навучаньне кадраў**

Каб прымаць штогод каля трох мільёнаў турыстаў, трэба канешне-ж мець і турыстычную інфраструктуру на высокім роўні. А яна на Падляшшы кожны год становіцца ўсё больш якаснай. У ваяводзтве, паводле статыстычнага камітэту ў Беластоку, у 2004 годзе было створана 12 581 месца для начлегу (зь іх 6 053 даступныя ўвесь год). Пры гэтым каля трох тысяч месцаў знаходзіцца ў гатэлях і аб’ектах гатэльнага пляну. Абавязкам кожнага з гэтых аб’ектаў ёсьць наяўнасьць у іх сваіх рэстарацыяў, што не стварае турыстам дадатковых праблем. Акрамя іх начлегам у рэгіёне могуць забясьпечыць шматлікія вакацыйныя й адукацыйна-адпачынковыя цэнтры, кемпінгі й г.д.

Аднак найбольшай папулярнасьцю апошнім часам сталі карыстацца прыватныя агратурыстычныя гаспадаркі, на Падляшшы на сёньняшні дзень налічваецца 719 кватэр. І вабяць яны турыстаў ня столькі невысокімі коштамі (а яны сапраўды нізкія — ад 5 да 15 даляраў за начлег) колькі тым, што даюць магчымасьць для пераважна жыхароў вялікіх гарадоў актыўна адпачыць на сьвежым паветры, пазнаёміцца з новымі мясцовасьцямі, сялянскай культурай і кухняй, атрымаць новыя ўражаньні. Як правіла, агратурыстычныя паслугі прапануюцца малымі сямейнымі прадпрыемствамі для невялі-

кай колькасьці турыстаў як дадатковая крыніца прыбыткаў. Пры гэтым агратурыстычныя гаспадаркі таксама зарабляюць на продажы турыстам прадуктаў з уласнай гаспадаркі (без пасярэднікаў і транспартных выдаткаў), продажы вырабаў мастацкіх рамёстваў, пракаце абсталяваньня, коней, ровараў, байдарак, транспартных і экскурсійных паслугах і г.д. Такім чынам на турызьме зарабляюць ня толькі тыя, хто непасрэдна займаецца абслугоўваньнем гасьцей, але таксама й уладальнікі крамаў, бэнзакалёнак, пазычальні турыстычнага рыштунку, рамесьнікі й іншыя, для каго турысты становяцца новымі кліентамі. Як правіла, усе прыватныя агратурыстычныя гаспадаркі ўваходзяць у агратурыстычныя таварыствы, якія служаць ім крыніцай інфармацыі — прававой і адукацыйнай. Кожнае з гэтых таварыстваў, а іх на Падляшшы існуе сем, штогод выдае інфарматары з рэклямай гаспадарак. Каб спрыяць іх разьвіцьцю, у рэгіёне праводзяцца разнастайныя агратурыстычныя конкурсы, прыкладам „Зялёнае лета” па дзьвюх катэгорыях: найлепшая агратурыстычная гаспадарка з сельскагаспадарчай дзейнасьцю й пансіянат.

Таксама ў Польшчы зразумелі, што якасна даваць турыстычныя паслугі нельга без кваліфікаваных кадраў. Таму вялікая ўвага надаецца навучаньню пэрсаналу для гэтай галіны. На гэты момант у Падляшскім ваяводзтве тры вышэйшыя навучальныя ўстановы (у Беластоку, Супраслі й Ломжы) навучаюць будучы кіраўнічы пэрсанал турыстычных фірмаў і гатэляў. Акрамя таго ў рэгіёне дзейнічаюць каля паўтара дзесятка сярэдніх навучальных устаноў (тэхнікумы, прафэсійна-тэхнічныя вучэльні, пасляліцэйныя курсы й інш.) з турыстычным, гатэльным і гастранамічным профілямі.

Самай вялікай праблемай для турыстаў на Падляшшы, як па сутнасьці й ва ўсёй Польшчы, ёсць стан польскіх дарог, якія лічацца найгоршымі ў Эўразьвязе. Асабліва ў краіне не стае аўтастрадаў, размовы пра будаваньне якіх

вядуцца ўжо гадоў трыццаць. Апошім часам, дзякуючы розным праграмам, усё больш рамантуецца лякальных дарог за эўрапэйскія грошы, аднак да агульнаэўрапэйскіх стандартаў польскім дарогам яшчэ вельмі далёка.

**Турыстычныя атракцыі Падляшша**

Падляшскае ваяводзтва вельмі багатае на разнастайныя турыстычныя атракцыі (гістарычныя, архітэктурныя, культурныя й г.д.), але найбольшай папулярнасьцю карыстаюцца атракцыі прыродныя, якія прыцягваюць турыстаў з усяго сьвету. Можна нават адзначыць, што турысты кожнай нацыянальнасьці па-рознаму актыўна адпачываюць у рэгіёне: немцы часьцей выбіраюць роваравыя рэйды, італьянцы, якіх з кожным годам усё больш наведвае паўночна-ўсходнюю Польшчу, цікавяцца белавескімі зубрамі й арніталягічнымі мясьцінамі, нідэрляндцаў вабяць азёры, а палякі выбіраюць паходы на байдарках. Турысты-ж Усходу (беларусы й расейцы) пераважна абмяжоўваюцца экскурсіямі й наведваньнем аквапарку ў 4-зоркавым беластоцкім гатэлі „Галамбеўскі”.

Падляшша літаральна нашпігавана прыроднымі атракцыямі: паўночную частку ваяводзтва займаюць азёры й пагоркі Сувальскага паазер’я зь лясамі Аўгустоўскай пушчы, у цэнтральнай частцы выразна зазначаюцца даліны рэк Бебжа й Нараў з комплексамі балот і Кнышынская пушча, а на поўдні дамінуе Белавеская пушча з далінай Бугу. У рэгіёне знаходзяцца 4 нацыянальныя паркі: Вігерскі, Бебжанскі, Нарвянскі й найкаштоўнейшы ў краіне прыродны аб’ект — Белавескі нацыянальны парк. Менавіта па гэтых мясьцінах праходзяць шматлікія роваравыя, пешыя, байдаркавыя, конныя й дарожныя трасы. У рэгіёне азнакавана больш за 100 пешых і каля паўсотні роваравых трасаў. Сярод іх ёсьць і фрагмэнты агульнаэўрапэйскіх шляхоў і свае фірмовыя, як прыкладам „Падляшскі бусловы шлях”, „Роваравы пярсьцёнак Сувальшчыны”, „Шлях праваслаўных сьвятыняў” ці „Крэсавыя вандроўкі”. Увогуле, агульная велі-

чыня добраазнакаваных турыстычных шляхоў на Падляшшы складае больш за 3 000 км.

Падляшша ёсьць памежным рэгіёнам, які спрадвеку зазнаў уплыў розных краінаў, культураў і рэлігіяў. Акрамя палякаў там жывуць беларусы, летувісы, украінцы, расейцы, цыганы й татары, а да другой сусветнай вайны багата было жыдоў і немцаў. Шмат дзе ў рэгіёне яшчэ культывуюцца народныя традыцыі. Прыкладам, каля Саколкі й Янава папулярнае народнае ткацтва, а на паўночным захадзе Кнышынскай пушчы — кавальства, ганчарства й выраб лыжак. Яшчэ адной атракцыяй рэгіёну ёсьць традыцыйная драўляная архітэктура (сакральная й жыльлёвая), найцікаўшыя аб’екты якой можна спаткаць у скансэнах у Навагродзе, Цеханоўцы й Юроўцах.

Багатая Падляшская зямля й на разнастайныя культурна-забаўляльныя імпрэзы. Толькі традыцыйных штогадовых мерапрыемстваў адбываецца каля 70. Сярод іх і спартова-турыстычныя (шматлікія байдаркавыя, роваравыя, лыжныя рэйды, а таксама такія экзатычныя як чэмпіянат Польшчы ў плаваньні на абы-чым „Што мусіць плаваць, тое не патоне”) і вялікі спэктар культурных (музычныя, тэатральныя, фальклёрныя, народныя, гастранамічныя, кірмашы).

KAMUNIKAT.org

**Сьвятлана Станкевіч**

# Фонд роўных магчымасьцяў

Апошнім часам грамадзтва стараецца не заўважаць гэтае слова, прыдумаўшы для яго шэраг сінонімаў, дзеля таго, каб не абразіць пэўную катэгорыю людзей. Абыходзяць слова „інвалід" увагай і недзяржаўныя арганізацыі, і толькі афіцыйныя дакумэнты накшталт Закону Рэспублікі Беларусь „Аб папярэджаньні інваліднасьці й рэабілітацыі інвалідаў" не даюць яму перайсьці ў катэгорыю архаізмаў. Не зусім зразумела, што менавіта зняважлівага знайшло грамадзтва ў гэтым кампактным, ёмістым слове, якое мае даволі канкрэтнае лексічнае значэньне.

Падчас журналісцкай стажыроўкі ў Польшчы ў мяне адбылося некалькі сустрэч зь людзьмі, якія займаюцца рэабілітацыяй інвалідаў. І ні ў адной размове гэтае слова не было агучана. Палякі аддаюць перавагу словазлучэньню „особа непэлносправна". Паколькі ў беларускім грамадзтве пакуль не знайшлося добрага адпаведніка, акрамя груваcткага „людзі з абмежаванымі фізычнымі магчымасьцямі", прапаноўваю ў артыкуле звыклы для ўсіх варыянт, тым больш, што ніякай абразы ў гэтым слове ня бачу.

Даволі часта знаёмыя, наведаўшы краіны Эўразьвязу, зьвяртаюць увагу на колькасьць інвалідаў у эўрапэйскіх гарадах і, вярнуўшыся, дзівяцца: маўляў, ня ўсё так добра ў „іх”, у Беларусі маштабы гэтай праблемы значна меншыя... Аднак не, не меншыя, адваротна — яшчэ большыя з-за таго, што не знаходзяцца навідавоку. Для інвалідаў наша асяродзьдзе не прыстасаванае, таму й ня бачым іх на гарадзкіх вуліцах, у крамах, установах.

Польскія ўлады зьвярнулі на гэта ўвагу ў канцы васьмідзесятых гадоў мінулага стагодзьдзя, а яшчэ праз некаторы час, дзякуючы Закону „Аб працы й прафэсійнай рэабілітацыі інвалідаў”, 9 траўня 1991 году зьявіўся PFRON — Дзяржаўны Фонд Рэабілітацыі Інвалідаў (ДФРІ). У 1997 годзе ў Беластоку таксама быў створаны аддзел Фонду, што дало штуршок для актывізацыі грамадзкіх арганізацыяў гэтага рэгіёну.

— Мэтай стварэньня Фонду Рэабілітацыі была падтрымка ініцыятывы аб’яднаньняў інвалідаў, прыстасаваньне ўмоў жыцьця для гэтай катэгорыі грамадзтва, разьвязаньне праблемаў з працаўладкаваньнем, — распавядае **Тэрэса Лешчыньска**, старэйшы спэцыяліст Дзяржаўнага Фонду Рэабілітацыі Інвалідаў у аддзеле Падляшскага ваяводзтва.

— Якім чынам было вырашана пытанне з матэрыяльнай базай Фонду?

— Галоўная база бюджэту ўстановы — складчыны, якія зьяўляюцца абавязковымі для працадаўцаў, якія забясьпечваюць працай як мінімум 25 чалавек за пэўны адрэзак часу, а паказьнік працаўладкаваньня інвалідаў у канкрэтнай установе тым часам ніжэйшы за 6% . Разьвязаньнем гэтых пытаньняў займаецца Аддзел Абавязковых Складчын. Акрамя таго існуюць добраахвотныя складчыны, дывідэнды, даходы з гаспадарчай дзейнасьці й г.д. Нельга сказаць, што гэтага дастаткова, але на дадзены момант Фонд у стане фінансаваць 15 недзяржаўных арганізацый Падляшскага рэгіёну. Чым мы й займаемся.

Хоспіс, Аб’яднаньне Глухіх, Таварыства Псыхіятрычнай Рэабілітацыі, Спартыўнае Таварыства „Старт”, арганізацыя „Nike”, Аб’яднаньне Хворых на Дыябет — гэта толькі невялікая частка арганізацый Падляшскага рэгіёну, зь якімі супрацуе Фонд Рэабілітацыі.

З моманту стварэння Дзяржаўнага Фонду Рэабілатацыі Інвалідаў значна пашырыліся абшары мэтаў фінансаваньня. Калі раней асаблівая роля надавалася прафэсійнай рэабілітацыі, то цяпер сродкі Фонду ідуць і на мэдыцынскую, і на сацыяльную дапамогу. На гэта выдаткоўваецца 35% ад матэрыяльнай базы Фонду Рэабілітацыі.

**Беласток без бар’ераў**

Акцыя пад такой назвай была распачата Фондам Рэабілітацыі ў 2000 годзе. Узяўшы за ўзор мерапрыемствы гэтага кшталту, якія прайшлі ў Варшаве, Гдыні, Кракаве, валянтэры Падляшша зрабілі дасьледаваньні архітэктурных аб’ектаў рэгіёну. У выніку выявілася, што на амаль 300-тысячны горад толькі восем аб’ектаў маюць неабходнае для інвалідаў абсталяваньне. Сярод іх былі толькі адна крама, адзін банк, адзін гатэль. Астатнія будынкі ў горадзе аказаліся недаступнымі для інвалідаў.

Дасьледаваньні-анкеты ўлучалі ў сябе сьпіс даных, незаўважных для звычайнага чалавека, але значных для інвалідаў: вышыня паліц у крамах, наяўнасьць адмысловых прыбіральняў, тэлефонаў з прыладай для ўзмацненьня званка...

Такая невялікая колькасць мадэрнізаваных будынкаў на той момант была прычынай слабой актыўнасьці аб’яднаньняў інвалідаў, якія з-за адсутнасьці ініцыятывы ня мелі ўплыву на мясцовыя ўлады.

„Кожны будынак для грамадзкага ўжываньня мусіць быць даступным для ўсіх адзінак грамадзтва”, — гэты закон выйшаў у Польшчы ў дзевяностых гадах мінулага стагодзьдзя, але доўгі час заставаўся без увагі. Дзякуючы акцыі, у рэгіёне адбылася мадэрнізацыя многіх архітэктурных будынкаў: шпіталяў, хоспіса, будынка Га-

радской Рады ў Цеханоўцы, школьна-выхаваўчага цэнтра ў Сувалках, дамоў сацыяльнай дапамогі й інш.

Фонд Рэабілітацыі грае асноўную ролю ў фінансаваньні мадэрнізацыі будынкаў, але кожная ўстанова, якой гэты будынак належыць, мусіць прыняць асабісты ўдзел у справе й выдаткаваць на гэтыя мэты пэўную суму.

**Партнёрства з НДА**

У 2000 годзе Фондам Рэабілітацыі была распачата праграма „Партнэр", скіраваная на недзяржаўныя арганізацыі, якія займаюцца праблемамі рэабілітацыі інвалідаў. Мэта — падвышэньне прафэсійнай і сацыяльнай актыўнасьці інвалідаў. Арганізацыя паўдзённых заняткаў, інтэграцыйныя мерапрыемствы, вучоба — на гэтыя справы выдаткаваны сродкі данай праграмы. Арганізацыя, якая разьлічвае на сродкі праграмы, мусіць мець 20% ад гадавой матэрыяльнай базы, астатнія 80% выдаткоўваюцца Фондам Рэабілітацыі. З 2001 года, прыкладам, такім чынам фінансуецца таварыства „Nike", якое праз розныя віды творчасьці аб'ядноўвае інвалідаў Падляшскага ваяводзтва. Арганізацыя ладзіць марафоны, выставы, конкурсы, мастацкія й паэтычныя сустрэчы, пленэры, як агульнапольскія, так і міжнародныя, выпускае каляровы часопіс-штоквартальнік пра грамадзтва й культуру, прысвечаны творчасьці інвалідаў. Даход ад дзейнасьці арганізацыі ідзе на дапамогу творцам-інвалідам.

Праект разлічаны на чатыры гады, таму з 2006 года на ўдзел могуць прэтэндаваць іншыя недзяржаўныя арганізацыі Падляшскага рэгіёну.

**Канкурэнтаздольнасць на рынку працы**

Гэта адна з асноўных праблем інвалідаў у сучаснасьці. Больш за 850 тысячаў інвалідаў у Польшчы ёсьць працаздольнымі, але працуе зь іх толькі 240 тысячаў. У 2002 годзе Фонд Рэабілітацыі паспрабаваў дапамагчы зьмяніць сытуацыю. Так была распачата праграма „Студэнт", разлічаная на шэсць год, у рамках якой кожны інвалід можа атрымаць вышэйшую адукацыю й такім

чынам стаць канкурэнтаздольным спэцыялістам на адкрытым рынку працы.

Фонд Рэабілітацыі ўзяў на сябе абавязкі фінансаваньня ўсяго працэсу навучаньня: аплата вучобы, пражываньня, праезду, неабходнага абсталяваньня, у тым ліку й кампутарнага.

На цяперашні момант толькі 4% інвалідаў у Польшчы маюць вышэйшую адукацыю. 2006 год пакажа плёны праграмы і, магчыма, зьменіць статыстыку.

### На службе грамадзтву

Прафэсійная актывізацыя беспрацоўных інвалідаў — такая мэта праграмы „Інваліды ў грамадзкай службе", якая ўлучала ў сябе як пошук працы, так і абсталяванне працоўных месцаў згодна з патрэбамі й магчымасьцямі асобы, і арганізацыю спэцыяльных заняткаў.

Фонд Рэабілітацыі Інвалідаў заключаў дамовы з арганізацыямі, якія меліся ўладкаваць на працу пэўную колькасьць інвалідаў. Так, прыкладам, у выніку шматгадовай супрацы ДФРІ і паліцыі больш тысячы інвалідаў знайшлі працу ў структурах апошняй. Для гэтага былі створаны новыя месцы працы, а існыя атрымалі неабходнае прыстасаваньне. Акрамя таго, Дзяржаўны Фонд Рэабілітацыі ўзяў на сябе абавязкі цягам трох год аплачваць 50% заробку інвалідаў. Пераважна інваліды працуюць у паліцыі на пасадах, зьвязаных з увядзеньнем даных у паліцэйскія картатэкі.

### Адукацыя для дзяцей і моладзі

Дзеці-інваліды звычайна навучаюцца ў спэцыяльных установах з кругласутачнай апекай. Але не заўсёды такія ўстановы маюць патрэбнае абсталяваньне. Для падвышэньня ўмоў жыцьця дзяцей і моладзі, якасьці адукацыі да роўня агульнаадукацыйных школ 19 ліпеня 2005 году Фонд Рэабілітацыі распачаў праграму пад назвай „Адукацыя", разьлічаную на дзяцей і моладзь.

Дзякуючы праекту спэцыяльныя адукацыйныя ўстановы атрымалі патрэбнае абсталяваньне для побыту

й навучаньня, адкрылі рэабілітацыйныя, тэлевізійныя клясы, мадэрнізавалі будынкі адпаведна патрэбам дзяцей-інвалідаў.

**Крэдыты без працэнтаў**

Фонд Рэабілітацыі мае некалькі пректаў па выдаваньні крэдытаў на куплю неабходнага для інвалідаў абсталяваньня. Так, праграма „Пегас" скіравана на ліквідацыю транспартных бар'ераў, беспрацэнтны крэдыт выдаецца на куплю аўтамабіля.

Праект „Кампутар для Гамэра" — магчымасьць атрыманьня крэдыту на кампутарнае абсталяваньне.

Нягледзячы на колькасьць адпаведных праектаў, на тое, што грамадзтва стараецца быць талерантным да інвалідаў, усё-ж ёсць значная праблема з працаўладкаваньнем. Мае месца дыскрымінацыя гэтай катэгорыі людзей на цяперашнім рынку працы. Разьвязаньнем такіх праблемаў займаюцца ўстановы ашчаднай працы, якіх сёньня на тэрыторыі Беласточчыны больш за 50.

Статус установы ашчаднай працы прадпрыемству можа прысудзіць ваявода. Для гэтага ёсць пэўныя ўмовы: неабходна атрымаць дазволы санэпідэмстанцыі й дзяржаўнай інспэкцыі працы. Такая ўстанова мусіць працаўладкоўваць як мінімум 40% інвалідаў ад колькасці ўсіх работнікаў, а ўмовы працы павінны быць прыстасаванымі да патрэбаў працаўнікоў. Такое прадпрыемства, акрамя вызваленьня ад падаткаў, атрымоўвае падтрымку Дзяржаўнага Фонду Рэабілітацыі Інвалідаў, які дапамагае выплаціць апрацэнтаваныя банкаўскія крэдыты на мадэрнізацыю будынка, часткова сплачвае прэміі для працаўнікоў.

Кірункі дзейнасьці ўстаноў ашчаднай працы могуць быць розныя. Прадпрыемства „Будучыня", што месьціцца ў Бельску-Падляшскім, прыкладам, як і адмысловы кааператыў працы „Падляска", займаюцца паліграфіяй, „Эўрапрагрэс" — шыцьцём рабочай вопраткі, каапэратыў „Свабода" з Драгічына — сталярнай справай і г.д.

Сярод інвалідаў ёсць і такія людзі, якія з-за асаблівасьцяў сваёй хваробы маюць праблемы з выкананьнем самых простых функцый самаабслугоўваньня і, такім чынам, ня могуць працаваць на звычайных прадпрыемствах. Дзеля патрэбаў такіх людзей узьніклі майстэрні заняткавай тэрапіі, якія займаюцца рэабілітацыяй інвалідаў у штодзённым жыцьці й праводзяць заняткі па авалоданьні пэўных прафэсій. Цяпер у Падляшскім ваяводзтве дзейнічае 15 майстэрняў заняткавай тэрапіі. Майстэрні працуюць пры грамадзкіх аб'яднаньнях інвалідаў, пры ўстановах ашчаднай працы й на 100% фінансуюцца праз Дзяржаўны Фонд Рэабілітацыі Інвалідаў.

Фінансаваньне спорту, культуры, турызму, адпачынку, датацыі прадпрыемствам, якія выпускаюць прадукцыю, патрэбную для рэабілітацыі інвалідаў, выданьне інфармацыйных матэрыялаў, навучаньне — вось далёка ня ўвесь сьпіс кірункаў дзейнасьці Дзяржаўнага Фонду Рэабілітацыі Інвалідаў.

Рэабілітацыя немагчымая без актыўнага ўдзелу дзяржавы. У пункце 1 „Стандартных правілаў забесьпячэньня роўных магчымасьцяў для інвалідаў" 48 Рэзалюцыі ААН гаворыцца: „Дзяржавы павінны прыняць меры для паглыбленьня разуменьня ў грамадзтве становішча інвалідаў, іх правоў, патрэбаў, магчымасьцяў". Менавіта гэтым займаецца Фонд Рэабілітацыі. За восем год існаваньня аддзела ДФРІ Падляшскага ваяводства зроблена нямала, з кожным годам працы становіцца яшчэ больш. З усім гэтым спраўляюцца 17 супрацоўнікаў аддзелу, якія не разглядаюць сваю дзейнасьць як нейкую ласку для інвалідаў, а аддаюць ім тое, што па праве належыць.

**Алесь Бяляцкі**

# Ад астрогу няма перасьцярогу

Стан месцаў зьняволеньня, праца паліцыі й вышуку, пэнітэнцыярная сытэма ў Польшчы гэта тая тэма, якая цікавіць мяне. Бо тут, у Беларусі, мы маем кантакты з нашымі палітычнымі зьняволенымі, самі ўдзельнічаем у розных грамадзкіх акцыях, і цікава параўнаць, што-ж адбылося ў нашых суседзяў за гады пасьля зьмены ўлады ў Польшчы ў 1989 годзе. У Гародні мы купляем квіткі на Беласток і проста ў аўтобусе знаёмімся з Аляксандрам Васільевым, нядаўнім палітычным вязьнем нашых калёніяў, асуджаным па „антыпрэзідэнцкім артыкуле", а таксама за арганізацыю масавых беспарадкаў, які дзесяць месяцаў (а атрымаў два гады калёніі, ды выпусьціла амністыя) адсядзеў у Гародні, Менску ды Воршы. Мы былі знаёмыя толькі завочна. Ён едзе туды сама, куды й мы. Спадар Васільеў вызваліўся толькі ў ліпені й ягоныя сьвежыя турэмныя ўспаміны цікавыя для параўнаньня ўмоваў утрыманьня беларускіх і польскіх вязьняў.



kamunikat.org

Пакуль едзем, Васільеў расказвае, што служыў у савецкім яшчэ войску, у 1990 годзе звольніўся ў Барысаве ў адстаўку са званьнем падпалкоўніка, і хаця сам русак, але паехаў жыць у Гародню, бо там давалі жытло. А тут ужо з Валерыем Леванеўскім, які яшчэ сядзіць, разам арганізоўвалі дробных прадпрымальнікаў на рынках, спрабавалі бараніць іхнія правы, за што й пацярпелі.

„І вось, глядзі, што атрымліваецца, — працягвае, — кажуць, што адстаўнікі ў Беларусі — самая рэакцыйная сіла, прачытаў нядаўна пра гэта ў нейкім допісе ў „Народную Волю”, а хто зараз у Беларусі за палітыку сядзіць: Статкевіч — падпалкоўнік, Шчукін — капітан другога рангу, таксама на арышце сядзеў, я — афіцэр, і нават Клімаў пажарную вучэльню скончыў, амаль што вайскоўцам быў. І якая-ж гэта рэакцыйная сіла, калі стольківарцоў за дэмакратыю дала? Я — рускі, я ня супраць беларускай дзяржавы, мовы, але я змагаюся за дэмакратыю, тады ўсім, і беларусам, і рускім будзе добра”.

У Беластоку позьняя восень. На двары шэрыя дні, голыя шкілеты засынаючых на зіму дрэваў, вялікія чароды качак у гарадзкіх каналах. Тут заўсёды на пару градусаў цяплей чым у Менску, прыкладна так як і ў Гародні. Прыяжджаючы ў Беласток, заўсёды адчуваю сябе як дома. Мэнтальнасьць беластачанаў, значная частка якіх — тутэйшыя праваслаўныя й каталікі, вельмі падобная на беларускую. Гэта, мяркую — спадчына гісторыі. Некалі Беласток уваходзіў у Вялікае Княства Літоўскае, Пагоня на гербе Беластоку сьведчыць пра гэта. Сталін пасьля вайны пасьля падзелу Рэчы Паспалітай па змове з Гітлерам, стварыў Беластоцкую вобласьць і прыяднаў яе да Беларусі. А пасьля вайны, па змове з Чэрчылем і Рузвэльтам, аддаў семнаццаць паветаў назад, кажуць, узамен за Калінінградскую вобласьць. Такім чынам, будучы разьменнай манэтай у руках імпэрскіх палітыкаў, у Польшчы засталася беларуская нацыянальная меншасьць, застаўся там і Беласток.

Гістарычна ён заўсёды быў бліжэй да Гродна й Віленскага Краю, таму шмат палякаў Гарадзеншчыны й Віленшчыны пасьля вайны пасялілася тут. Мабыць, па іхняй ініцыятыве ў Беластоку адносна нядаўна пабудаваны касьцёл, які бачны з вакна майго пакою ў гатэлі, у традыцыйным раскошным стылі віленскага барока.

Назаўтра першая сустрэча ў нас праходзіць у адным з будынкаў гарадзкой мэрыі з Янам Кулешам, нядаўнім былым ваяводзкім камэндантам паліцыі. Маладжавы, гадоў пад пяцьдзесят, даволі падцягнуты, высокі дзядзька адкрыта пасьміхаецца нам, кажа, што нарадзіўся зусім каля мяжы, у вёсцы, кілямэтраў пятнаццаць ад Гродна, і што ягоны дзед заўсёды езьдзіў на гродзенскі кірмаш прадаваць сялянскія прысмакі й гандляваць коньмі. Ён служыў яшчэ ў міліцыі за камунай. Апавядае пра тыя часы, калі сяброў Польскай Аб'яднанай Працоўнай Партыі ў дзяржаве было аж тры мільёны, і тады міліцыя, як і служба бясьпекі (нашае КГБ) былі часткай партыйнага апарату. Ён пералічвае аддзелы СБ, якія былі на той час: 2-гі — контрвыведка, 3-ці — інтэлігенцыяй займаўся, 4-ы — ксяндзамі.

Амаль як у нас зараз, думаю я, і ў нас сёньня ў КГБ ёсьць упраўленьне па абароне канстытуцыі, гэта тое, якое палітыкамі й грамадзкімі дзеячамі, мусіць, займаецца, і контрвыведка, і сьледчае ўпраўленьне. Нічога не памянялася. А, улічваючы, што апошнія рэпрэсіўныя законы, накіраваныя на абмежаваньне грамадзкай актыўнасьці, прадстаўляліся ў палатку старшынём КГБ Сухарэнкам, такое адчуваньне, што з васьмідзесятых гадоў не памяняліся й мазгі.

Былы начальнік СІЗА № 1 г. Мінска Алег Алкаеў, які зараз, седзячы ў Нямеччыне, можа спакойна казаць усё, што ён думае, напісаў у „Народнай Волі": „Мяне цікавіць працэс узьнікненьня самой ідэі вяртаньня ў сярэднявечча. У чыёй зачумленай галаве яна зарадзілася? Сёньня ўжо няважна ў якую абгортку загорнутая гэтая

цукерка з г..., якая называецца папраўкамі ў Крымінальны кодэкс краіны”.

Гэта пытаньне. Як быццам бы нашыя кэгэбісты пераседзелі, праспалі ў летаргічным сьне ўсе гэтыя неспакойныя 1990-я гады ў цёплым акопе, вылезьлі, смачна пазяхнулі, намацалі на пагонах большыя зоркі, плюнулі, рыгнулі, адлілі, а затым дасталі свае пратаколы й статуты, і пайшла пісаць кантора: Краіна ў небясьпецы! Паўсюль ворагі! Моладзь навучаецца страляць на натаўскіх базах у Літве!

Вось як бывае, такая часавая амнэзія цэлай структуры.

Я працягваю слухаць Яна Кулеша далей. За камунай у паветах служба бясьпекі знаходзілася пры міліцыі. Камэндант міліцыі меў намесьніка з СБ. І ў ваяводзтве было тое самае. І калі СБ займалася сачэньнем, інфільтрацыяй колаў правых, зборам інфармацыі пра добранадзейнасьць грамадзянаў, дык міліцыя — ахавай парадку, барацьбой са злачынствам, і — абавязак, у выпадку неабходнасьці — інфармаваць СБ па пытаньнях, якія цікаваць эсбэкаў.

Было яшчэ ЗОМО — гэта як у нас АМОН. Яны мусілі назіраць за ахавай парадку падчас дэманстрацыяў ці страйкаў, разганяць іх і затрымліваць удзельнікаў.

Пасьля 1989 году адбылася вэрыфікацыя функцыянэраў СБ. За тры месяцы 90% былі звольненыя згодна з законам, прынятым Соймам. У Беластоцкім ваяводзтве ў СБ тады служала каля 700 асобаў. А да гэтага часу ў АБВ (Агенцыі Ўнутранай Бясьпекі) засталіся толькі лічаныя адзінкі.

„А куды яны дзеліся?” — пытаюся я.

„Тыя, хто мелі выслугу 15 гадоў — атрымалі пэнсіі, а да пятнаццаці гадоў — пазвальнялі бяз пэнсіі, — тлумачыць Ян Кулеш. — Паўладкоўваліся пераважна ў ахоўныя фірмы, пайшлі ў бізнэс, па-рознаму. Можа гэта й нядобра, што маладзейшых пазвальнялі, яны ўсё-ж былі спэцыялістамі. Можна было пакінуць іх і яны

добра-б служылі. А так новай уладзе прыйшлося пачынаць амаль з нуля”.

О, не, думаю я, у такіх службах лепей няхай сістэма будзе менш эфэктыўнай на першых парах, але мусяць прыйсьці новыя людзі з новымі мазгамі. Інакш нічога ня будзе, не адбудзецца ніякіх зьменаў, а пры першай магчымасьці старыя кадры возьмуць рэванш. І ўсё пойдзе па новай. Цікава, якое званьне на пачатку дзевяностых меў Сухарэнка, можа якім капітанам быў. Таксама маладым спэцыялістам, мабыць, лічыўся.

„І калі раней мэты ў міліцыі былі, — працягвае Ян Кулеш, — вяртаньне парушанага ладу й парадку, дык зараз місыя паліцыі — служэньне грамадзтву, кантакт зь людзьмі, інфільтрацыя злачынцаў. Раней міліцыя была — улада, зараз паліцыя — не.

Грамадзтва сёньня ставіцца пазытыўна да паліцыі. 63% людзей па апытваньнях сёньня задаволеныя працай паліцыі. Колькасьць паліцыянтаў у Падляшскім ваяводзтве зараз тры тысячы адна асоба й яшчэ адна тысяча чатыры асобы цывільных, якія працуюць на дапаможных пасадах кіроўцаў машынаў, сакратароў і гэтак далей.

Што да ЗОМО, дык яны пасьля зьмены ўлады былі рэарганізаваныя ў аддзел прэвэнцыі. І калі раней іхняя галоўная задача была біць апазыцыю й разганяць мітынгі, дык зараз — прафіляктычнае патруляваньне на вуліцах, забесьпячэньне парадку падчас спартовых гульняў ці канцэртаў, ахова правядзеньня публічных акцыяў, забесьпячэньне парадку пры афіцыйных візытах.

„Яны могуць забараніць дэманстрацыю ці нейкую акцыю?” — пытаюся я.

„Не — на гэта дае дазвол управа”.

„А ці былі за апошнія гады ўправаю забароненыя хоць якія акцыі ў Беластоку?” — працягваю дапытвацца я.

„Не, — адказвае спадар Кулеш, — паліцыя падчас дэманстрацыяў ці пікетаў прысутнічае толькі дзеля таго, каб не дапусьціць сутычак паміж рознымі групамі дэ-

манстрантаў. Вось зараз у нас ідуць у розных гарадох Польшчы выступы геяў і лесьбіянак. Часткаю грамадзтва такія дэманстрацыі ў каталіцкай Польшчы ўспрымаюцца неадназначна, таму паліцыя фактычна ахоўвае іхнія акцыі, каб іх не пабілі радыкальныя групоўкі".

Мы з Васільевым пераглядаемся й нявесела пасьміхаемся. У нас-жа зусім іншая сытуацыя. Нашыя пікеты ды дэманстрацыі выклікаюць нэрвовую рэакцыю адно толькі ў беларускіх уладаў. Таму атрымаць дазвол на акцыю, якая закранала-б набалелыя пытаньні нашага грамадзкага жыцьця, амаль немагчыма. Адным з крымінальных абвінавачваньняў супраць спадара Васільева й было якраз правядзеньне першамайскага мітынгу, арганізаванага гарадзенскімі дробнымі прадпрымальнікамі. А змагаліся-ж яны за свае эканамічныя правы, за магчымасьць зарабляць на кавалак хлеба для сваіх сем'яў.

„А што наконт заробкаў? — пытаюся я, — калі параўнаць ранейшыя часы й сёньняшнія".

Спадар Ян Кулеш на секунду замаўкае, дапытліва глядзіць на мяне, потым кажа праўду: „За камунай нам плацілі болей. Радавы міліцыянт атрымліваў як дырэктар, бо мы былі адной з апораў тагачаснай улады. А зараз — не. Зараз у паліцыі іншыя задачы, таму плацяць меней. Ёсьць закон аб паліцыі, дзе запісана, што паліцыя — па-за палітыкай. Кожны мае права мець свой погляд, свае палітычныя сімпатыі, але ня можа быць сябрам палітычнай партыі. Тым ня меней праца лічыцца вельмі прэстыжнай. З васьмісот жадаючых апошнім часам было адабрана толькі сто пяцьдзесят. Абітурыенты праходзяць спэцыяльныя тэсты, у тым ліку й псыхалягічныя. Нават выпрабаваньне на „апараце хлусьні". Многія з жадаючых служыць ужо маюць вышэйшую адукацыю".

Міліцыя — памочнік дэмакратыі й апірышча рэжыму, факт, думаю я. Таму ў Беларусі гэтак непамерна раздутыя атрады АМОНу, а ў Менску сёлета значна павялічылі колькасьць гэтых „касманаўтаў" з дубінкамі й рэарга-

нізавалі АМОН у спэцыяльны міліцэйскі полк. Баяцца страціць уладу, любым коштам жадаюць захаваць яе.

Назаўтра мы наведваем сьледчы камітэт Ваяводзкай Камэндатуры Паліцыі, які арганізоўвае працу расьследаваньня злачынстваў у Падляшскім ваяводзтве, наглядае за працай камісарыятаў і займаецца найбольш цяжкімі й складанымі расьследаваньнямі. Пабудаваны ўжо пасьля вайны ў чыста „міліцэйскім" стылі будынак зь вялікімі калідорамі, радамі кабінэтных дзьвярэй, кратамі, якія перагароджваюць паверхі, прапускной сістэмай, зараз рамантуецца. Мы сустракаемся з галоўным сьледчым, на стале ў якога стаіць толькі ноўтбук. Ён распавядае працэдуру затрыманьня злачынцаў.

Задача супрацоўнікаў камітэту — затрымаць падазронага, права на арышт мае толькі суд. Камітэт праводзіць адно толькі дазнаньні й сьледзтва. Мы просім, каб ён параўнаў цяперашнюю сытуацыю з тым, што было за камунай. Сьледчы кажа, што цяпер людзі атрымалі больш правоў, перасталі баяцца паліцыі ў сэнсе гвалту, бо цяпер проста немагчыма, каб ужываліся недазволеныя сродкі й мэтады падчас сьледзтва. Увесь час за сьледзтвам назірае пракуратура, куды падазроны ў злачынстве можа зьвярнуцца зь любой нагоды, і пракуратура абавязаная дэталёва дасьледваць ягоныя скаргі й звароты.

Раней нам было працаваць лягчэй, шчыра прызнаецца ён, але цяпер людзі пачуваюцца больш абароненымі, таму меней памылак у сьледзтве.

Мы распавядаем яму пра полацкага сэрыйнага забойцу Генадзя Міхасевіча, які з 1971 па 1984 год забіў 36 жанчынаў. Да таго, як яго выкрылі, за гэтыя забойствы было асуджана 14 асобаў. Зь імі так „добра" папрацавалі сьледчыя зь міліцыі падчас сьледзтва, што ўсе яны прызналіся ў гэтых забойствах. Аднаго зь нявінна асуджаных расстралялі, яшчэ адзін адсядзеў дзесяць гадоў, яшчэ адзін пасьля шасьці гадоў зьняволеньня стаў сьляпым, а наступны спрабаваў павесіцца.

І зараз, нават па тых судовых працэсах супраць міліцыянтаў, якія праводзяць у краіне й пра якія часам скупа й неахвотна піша беларуская афіцыйная прэса відаць, што ў сьледчых органах падчас сьледзтва яшчэ бывае што ўжываюцца фізычныя й псыхалягічныя катаваньні. Асабліва інтэнсіўна спрабуюць „выбіць” паказаньні адразу пасьля затрыманьня. Маштабу гэтых парушэньняў ня ведае ніхто.

Урэшце, і ў Польшчы падчас затрыманьня й адразу пасьля яго адбываецца хіба што не найбольшая колькасьць зафіксаваных парушэньняў з боку паліцыянтаў. Учора ўвечары па тэлевізары распавядалі гісторыю пра тое, як Марціну М. у Вроцлаве паліцыянты адбілі селязёнку, падазраючы яго ў кражы нейкай рэчы коштам за 30 злотых (прыкладна 20 тысячаў беларускіх рублёў). Яму зрабілі апэрацыю. Ён напісаў скаргу й двух паліцыянтаў, якія зьбівалі яго, затрымалі пакуль на тры месяцы. Само сьледзтва можа ісьці да трох гадоў. Кара, якая пагражае паліцыянтам — да 8 гадоў зьняволеньня. Пацярпелы будзе дабівацца ад паліцыі кампэнсацыі за пашкоджаньне свайго здароўя.

Адрозьненьне ад Беларусі — гэты факт абмяркоўваецца адкрыта, галосна, польскае грамадзтва асуджае яго, ніхто, мабыць, не хацеў-бы апынуцца на месцы Марціна. І прэсінг на паліцыю па захаваньні элемэнтарных правоў затрыманых імі асобаў даволі моцны й жорсткі. У нас-жа гэтую гісторыю вельмі лёгка маглі-б замяць. Беларуская міліцыя імкнецца не выносіць сьмецьце са сваёй хаты й вельмі часта ёй у гэтым дапамагае й пракуратура, і суды, і мясцовыя ўлады.

Паказальным можа быць выпадак у Рэчыцы, якім займалася „Вясна” яшчэ маючы рэгістрацыю. Там п’яны капітан ДАІ на машыне зьбіў чалавека, у выніку чаго той атрымаў сур’ёзную траўму галавы й стаў недзеяздольным. Гады два крымінальная справа па гэтым выпадку то ўзбуджалася, то спынялася пракуратурай. Яе кідалі то ў гомельскую абласную пракуратуру, то адсы-

лалі назад, у Рэчыцу, то чакалі такога самага надвор’я для правядзеньня экспэртызы. Капітана яўна адмазвалі, нават ня звольнілі, а проста перавялі на другую работу. Урэшце ўдалося толькі выставіць зыск на кампэнсацыю маральнай шкоды й такім чынам дабіцца хоць нейкага адшкадаваньня для пакалечанага чалавека.

Мы пытаемся пра рост злачынства ў Польшчы. Нам адказваюць, што значны рост злачынстваў адбываўся ў дзевяностыя гады, калі перабудоўвалася ўся сістэма польскай дзяржавы, але зараз адбылася стабілізацыя й колькасьць злачынстваў прынамсі не павялічваецца.

Апошняе нашае пытаньне датычыцца правоў саміх паліцыянтаў. Галоўны сьледчы адказвае, што для гэтага існуюць незалежныя прафсаюзы польскай паліцыі, а ўвогуле, у паліцыі зьявілася выразнае адчуваньне чалавечнасьці ў іхняй працы, адпаведна й адчуваньне волі.

Увечары па тэлевізіі ізноў паказваюць сюжэт, які ўстурбаваў літаральна ўсю Польшчу. Ужо перад самым адыходам з пасады прэзыдэнт Польшчы Аляксандар Кваснеўскі ўласкавіў трох асобаў, былых дэпутатаў парлямэнту ад СЛД, польскай лявіцы, зь якой ён паходзіў і сам. Ёсьць у прэзыдэнта, згодна закону, такое права на дараваньне злачынцам. І ўсё-б нічога, калі-б гэтыя людзі не былі замешаныя ў буйным скандале, зьвязаным з уцечкай інфармацыі аб правядзеньні паліцыяй апэрацыі супраць мафіі ў адным з гарадоў Польшчы. Дэпутат Анджэй Ягела па тэлефоне праінфармаваў сваіх калегаў зь лякальнай арганізацыі СЛД, што супраць іх і маючых сувязі зь імі мафіёзі паліцыя плянуе апэрацыю. Такім чынам пад пагрозай для жыцьця апынуліся паліцыянты, якія бралі ўдзел у гэтай апэрацыі. У выніку аказалася, што гэтую інфармацыю ад камэнданта паліцыі атрымаў яшчэ адзін дэпутат і намесьнік міністра Зьбігнеў Суботка, які й перадаў яе сваім аднапартыйцам. Дэпутаты былі пазбаўленыя недатыкальнасьці й асуджаныя. У прыватнасьці, Зьбігнеў Суботка атрымаў тры з паловай гады зьняволеньня.

Фармальна прэзыдэнт нічога не парушыў, але польскія журналісты й большасьць палітыкаў адзінагалосна асуджае гэтае дараваньне прэзыдэнта. У камэнтарах гавораць пра тое, што гэтым крокам Кваснеўскі перакрэсьліў свой аўтарытэт незаангажаванага й маральнага палітыка. Справядлівасьць — вось чаго чакае й дабіваецца польскае грамадзтва ад сваіх палітычных лідараў.

Назаўтра мы ідзем у сьледчы арышт, што адпавядае беларускаму сьледчаму ізалятару. Будынак арышту стары, тут разьмяшчалася яшчэ царская турма, затым польская, затым савецкая, падчас вайны — нямецкая, а зараз ізноў — польская. За саветамі, немцамі й народнай Польшчай тут катавалі й забівалі людзей, пра што сьведчыць памятная дошка на мурах арышту.

Мы заходзім у прыёмны пакой, тут спраўджваюць нашыя пашпарты, забіраюць мабільныя тэлефоны, мы ў адміністратыўным будынку. Сьцены пафарбаваныя ў сьветлы колер, у калідорах вісяць нейкія карціны. Мы праходзім у кабінэт дырэктара арышту. Той сустракае нас у цывільнай вопратцы. Абстаноўка кабінэту далёкая ад афіцыйнай, хутчэй нагадвае кабінэт бізнэсоўца. Стаіць звычайная цывільная мэбля, а з музычнага цэнтру ціха гучыць клясычная музыка. І гэта хіба што найбольш незвычайна, такое адчуваньне, што знаходзішся ў кабінэце псыхааналітыка.

Мы пытаемся пра ўмовы ўтрыманьня зьняволеных. Дырэктар распавядае, што сутачная норма ежы разьлічваецца з кошту ў 5 злотых 20 грошай удзень, гэта прыкладна паўтары даляра. Калі палічыць, што ежа ў Польшчы каштуе прыкладна столькі, колькі й у Беларусі, дык атрымліваецца лепей чым у нас. Тут галоўнае яшчэ — якасьць і добрасумленнасьць адміністрацыі.

Аляксандар Васільеў распавядае мне й начальніку арышту, што як сядзеў у Аршанскай калёніі, дык там кармілі нейкім такім глёўкім хлебам з адсевак, што зьясі — і цэлы дзень пасьля жывот баліць, як быццам бы ка-

мок цеста ў страўніку ляжыць. А сталоўка — сапраўдная памыйка. Паўсюль — тлустая слізь, усё абкоцанае, замызганае. Кармілі там у асноўным пярлоўкай і супчыкам, звараным з кількі разам з галовамі й хвастамі. Ён для прысмаку дадаваў кубікі „галіны бланкі". У выніку такога харчаваньня шмат у каго зь вязьняў — авітаміноз, яны часта хварэюць, у іх выпадаюць зубы.

„Абмежаваньні якія ёсьць на харчы?" — цікавіцца Васільеў.

Вязьні ў сьледчым арышце маюць права раз на тыдзень закупацца ў мясцовай лаўцы.

„Глядзім толькі, каб не закупалі зашмат харчоў, якія хутка псуюцца, бо лядоўняў у камэрах няма", — адказвае дырэктар.

„А што з хворымі на СНІД? — пытаецца Васільеў. — У нас, у Воршы, яны былі сабраныя ў асобны атрад".

„Гэта доктарская таямніца, — адказвае дырэктар арышту, — пра гэта ведаюць толькі дактары й самі хворыя".

„А што наконт захворваньняў на сухоты?" — працягвае дапытвацца Васільеў.

Дырэктар няўцямна рухае плячыма.

„Больш іх ці меньш, чым на волі?" — удакладняю я.

„Прыкладна столькі сама, — адказвае дырэктар, — як чалавек паступае да нас, праходзіць мэдыцынскае абсьледаваньне, і калі ў яго выяўляецца нейкая хвароба, яго накіроўваюць на лячэньне ці, калі гэта магчыма, лечаць тут".

„Вой, — цяжка ўздыхае Васільеў, — у нас усё па-іншаму. У цэху ў Аршанскай калёніі, дзе плялі драцяную сетку, не было ніякай вэнтыляцыі, у выніку за год сотні зьняволеных захварэлі на сухоты, бо хворыя працавалі разам і заразілі здаровых. А гэтая хвароба — да канца жыцьця, ня кажучы ўжо пра тое, што такі чалавек выходзіць з калёніі й працягвае заражаць людзей ужо на волі. І я ў тым цэху таксама працаваў, абдзіраў

ізаляцыю зь меднага бракаванага дроту, за два месяцы здабыў для краіны амаль трыццаць кіляграмаў медзі…

І вось так, то аднаго нясуць просьцінай прыкрытага, то другога, і ніхто не глядзіць, чаму, як, ад чаго. Усё фармальна. Сьпісваюць людзей як зламаную мэблю. Асабліва калі сваякі адмовіліся, дык увогуле тады жыцьцё чалавека мала каштуе. Так хацелі й зь Міхаілам Марынічам".

Мы тлумачым дырэктару арышту, што Міхаіла Марыніча, былога амбасадара Беларусі ў Латвіі й міністра, які хацеў стартаваць у прэзыдэнцкай кампаніі ў 2001 годзе, пасадзілі за тое, што ён як быццам бы ўкраў ва няўрадавай арганізацыі кампутары, старшынём якой ён і быў сам, нават нягледзячы на тое, што амэрыканская амбасада, якая перадала яму гэтыя кампутары, ня мела да яго ніякіх прэтэнзіяў.

„Калі Міхаілу Марынічу стала кепска, адбыўся інсульт, — працягвае распавядаць Васільеў, — яму забаранілі ўжываць хоць якія лекі. Яго пакінулі й ён проста ляжаў і паміраў. Я напісаў скаргу пракурору, перадаў вестку сваякам. Пракурор прыйшоў: „Чаму ня лечыце? Хто будзе адказваць?" А пад брамаю калёніі ўжо сыны стаяць. Тады толькі пачалі лячыць".

„Як у вас з правамі зьняволеных?" — пытаюся я.

„Мы лічым, што магчымасьць для зьняволенага абараняцца згодна з законам, гэта значыць — пісаць скаргі, заявы, сустракацца з адвакатам, здымае напружанасьць, дазваляе ўнікаць адкрытых канфліктаў асуджанага з адміністрацыяй арышту, таму мы з разуменьнем ставімся да гэтага й ні ў якім выпадку не перашкаджаем, хоць-бы ён пісаў гэтыя скаргі кожны дзень".

Васільеў зноўку ўздыхае, бо ў Івацэвіцкай калёніі зараз сядзіць ягоны „падзельнік" Валеры Леванеўскі, лідэр гарадзенскіх дробных прадпрымальнікаў, асуджаны таксама „за абразу гонару й годнасьці прэзыдэнта", які й там, у калёніі спрабуе дабівацца таго, што яму належыць мець па законе. Піша скаргі, а зараз галадае, ужо

ў пяты раз. Галадоўка цягнецца ўжо чатырнаццаць дзён. Апошні раз яго пазбавілі спатканьня зь сям'ёй, якое ён вельмі чакаў. Сям'я прыехала з Гародні ў Івацэвіцкую калёнію, ня блізкі сьвет, а ім толькі там абвясьцілі, што ён пазбаўлены спатканьня „за парушэньне ўнутранага рэжыму”. Адміністрацыя аказвае на яго моцны псыхалягічны ціск, „каб суцішыўся”.

„Як у вас з разьмяшчэньнем зьняволеных, ці для ўсіх хапае месца”, — далей распытваюся я.

„З гэтым праблема, — адказвае дырэктар, — перанаселенасьць у камэрах на 20% большая за норму. Мы ня маем права адмаўляць у прыёме зьняволеных, таму шукаем магчымасьць, каб больш-менш прыстойна разьмясьціць усіх, хто паступае да нас. Як пойдзеце на агляд, убачыце самі”.

Ён тэлефануе й да нас прыходзіць выхавальнік, мужчына ў цывільным, які вядзе нас напачатку ў свой кабінэт, дзе мы пакідаем торбы, а затым выходзім з адміністратыўнага будынку арышту ва ўнутраны двор.

Ужо пасьля наведваньня сьледчага арышту, вяртаючыся дадому, у газеце „Жэчпасполіта” за 5 сьнежня 2005 г. я прачытаў артыкул Гжэгажа Прачыка пад назваю „Няма дзе сядзець”. Журналіст піша, што ў польскіх калёніях і сьледчых ізалятарах існуе каля 69 тысячаў месцаў для зьняволеных. Але сядзіць на 15 тысячаў болей, а ў чарзе на адсідку чакае яшчэ больш за 40 тысячаў асобаў. Гэта тыя, хто маюць адтэрміноўкі ці перапынкі ў знаходжаньні ў зьняволеньні.

Згодна з польскімі законамі, кожны вязень павінен мець ня менш за тры квадратных мэтры плошчы для разьмяшчэньня, законы Эўразьвязу патрабуюць чатыры мэтры. А на сёньня сярэдняя плошча на аднаго зьняволенага ў Польшчы складае каля 2,5 мэтра.

Да 2009 году плянуецца пабудаваць 15 тысячаў новых месцаў зьняволеньня. Ужо ў наступным годзе павінна быць адчынена 4 тысячы новых месцаў.

Віцэ-міністр юстыцыі Анджэй Гжэляк, камэнтуючы справу, кажа, што пабудова новых камэраў сытуацыі ня выправіць. Ён лічыць, што ўрад мусіць звольніць пэўную лічбу вязьняў. Гэта было-б магчымым пры ўвядзеньні сістэмы электроннага назіраньня. Праект закону ўжо патрапіў у Сойм. У гэтым выпадку 10 тысячаў зьняволеных, асуджаных на невялікія тэрміны, маглі-б пакінуць месцы зьняволеньня. Яны будуць павінныя насіць электронныя бранзалеты, дзякуючы якім можна будзе кантраляваць іхняе месца знаходжаньня.

Пры дзьвярах у двор у закутку ляжыць вялікая нямецкая аўчарка. „Вельмі спакойная, — камэнтуе наш праваднік, — яна працуе па наркотыках”. На нас сабака пазглядае мудрымі вачыма, нават не ўздымаючы галаву. У двары працуе пара зьняволеных, падмазваюць растворам падмурак. Мы праходзім каля тэхнічных памяшканьняў, дзе знаходзіцца сталярная майстэрня й яшчэ нейкія дробныя варштаты. Зьняволеныя могуць працаваць тут. За гэта яны маюць трохі лепшыя ўмовы ўтрыманьня, тлумачыць наш праваднік, і гэта ўлічваецца пры вынясеньні выраку.

У сьледчым арыштце сядзяць як тыя, што чакаюць судовага разьбіральніцтва, так і тыя, што ўжо былі асуджаныя й чакаюць накіраваньня ў „zakład karny”, што адпавядае нашай калёніі.

Найперш мы ідзем у жаночае аддзяленьне. Выхавальніца, маладая дзяўчына, зноў-жа апранутая па-цывільнаму, сядзіць у сваім пакоі, глядзіць тэлевізар. Яна паказвае нам зачытаныя жанчынамі кніжкі, у асноўным гэта любоўныя раманы, якія прыходзіцца падклейваць, бо надта карыстаюцца попытам. Затым мы заходзім у каплічку, дзе побач з каталіцкім крыжам стаіць і праваслаўны, а таксама вісяць праваслаўныя іконы.

„Яна ў нас экумэнічная, тут праходзяць каталіцкія, праваслаўныя й па патрэбе пратэстанцкія службы. Тутжа жанчыны раз на тыдзень могуць прыйсьці да споведзі”, — тлумачыць выхавальніца.

Далей мы аглядаем агульны пакой для адпачынку, дзе стаіць стол для настольнага тэнісу.

„А штрафную камэру паказаць можаце?” — цікавімся мы.

Яна адчыняе пустую камэру з прыкручаным да падлогі ложкам і зэдлікам. Чысты ўмывальнік, адгароджаны туалет. Васільеў падыходзіць да ўмывальніка й дзівіцца: „Няўжо тут ёсьць гарачая вада?” — адкручвае кран, правярае, гарачая вада ёсьць.

Затым мы падымаемся на другі паверх, дзе разьмешчаныя камэры для зьняволеных. На стале ў дзяжурнай стаіць прыгожы букет з разнастайных кветак.

„Для зьняволеных былі арганізаваныя двухтыднёвыя курсы па складаньні букетаў з жывых кветак, — тлумачыць выхавальніца, — дванаццаць зьняволеных кабетаў наведалі яго. Мы імкнемся арганізоўваць нейкія мерапрыемствы, якія-б цікавілі зьняволеных жанчын й рабілі іхняе перабываньне тут не такім нудотным”.

Папярэдне ў камэру зайшла выхавальніца й спыталася дазволу ў кабетаў, ці ня супраць яны таго, каб мы маглі таксама зайсьці й паразмаўляць зь імі. Кабеты пагадзіліся, а чаго-б і не, і мы пераступілі парог жаночай камэры. Там стаялі звычайныя ложкі, тэлевізар, віселі нейкія рэчы, было чыста. Камэра выглядала больш на бальнічны пакой.

„А гэта вам дазваляецца? — спытаўся Васільеў, паказваючы на электрачайнік. — У нас можна толькі кіпяцільнікі”.

„Без праблемаў, — адказаў нам праваднік, — раней і ў нас дазваляліся толькі кіпяцільнікі, але зь імі меншая пажарная бясьпека, таму зараз — чайнікі”.

Мы задалі жанчынам некалькі нязначных пытаньняў.

„Можаце па-руску казаць, — адказала адна са зьняволеных, — я з Украіны”.

„І як вам тут?” — спыталіся мы.

„Вось ужо знаходжуся тут другі год, асуджаная на дзесяць гадоў, так атрымалася, але тут добра. Я кожную ра-

ніцу ўстаю й малюся за нашага прэзыдэнта Ярузэльскага, — яна засьмяялася, — ці як яго... Квасьнеўскага. Больш усяго баюся, калі адправяць дасіджваць на Ўкраіну".

Мы пажадалі жанчынам шчасьця й выйшлі ў калідор.

З калідору нас вывелі на балкон, які знаходзіўся над прагулачнымі дворыкамі. У адным зь іх выхаджвалі па коле дзьве дзяўчыны. У звычайных куртках і нармальных ботах яны, здавалася, выпадкова забеглі сюды з волі. Гэта так непадобна на нашых зьняволеных жанчынаў, якіх паказваюць у куфайках і ці то кірзавых, ці то гумовых ботах, абмотаных хусткамі, як пасьля вайны. Але й тут стаяць і глядзець згары на зьняволеных полек, якія жвава хадзілі па коле, было непрыемна. Мы хутка сышлі, кіўнуўшы ім на разьвітаньне, бо гэта ўсёж ня цырк.

Мы зноў прайшлі праз двор, Васільеў распытваўся ў правадніка пра сацыяльныя падзелы сярод зьняволеных. Той распавядае, што ў сярэдзіне дзевяностых даволі шмат затрыманых было з усходу: рэкеціры, бандыты, угоншчыкі машынаў, якія „паняцьці" з былых саюзных турмаў перацягнулі й сюды. Але сэпарацыя зьняволеных у Польшчы больш уважлівая, хоць гэта й стварае дадатковы клопат для адміністрацыі. Асобна сядзяць тыя, хто патрапіў у зьняволеньне першы раз, асобна рэцыдывісты, асобна непаўнагадовыя, якія ў зьняволеньні лічацца з 21 года, і нават асобна падзеленыя тыя хто паляць і тыя хто не.

„А вось гэта памяшканьне, — ён паказвае нам аднапавярховы будынак, — для аўтарытэтаў. Тут сядзяць кіраўнікі гангстэрскіх бандаў, мафіёзі, іншыя ўплывовыя злодзеі. У іх аднаасабовыя камэры, якія ахоўваюцца з цэнтральнага пульту. Паўсюль відэакамэры, так што кожны крок іх пад назіраньнем. Але ўмовы ўтрыманьня там лепшыя чым у звычайных камэрах, нават ёсьць трэнажорная заля. І зараз злодзейскія „паняцьці" не такія важныя, як раней. Грошы разбурылі сьвет „паняцьцяў".

І гэта праўда. Хто мае грошы, той найлепей можа перажыць зьняволеньне".

„А ці „ганяюць каня" зьняволеныя?" — далей распытваецца Васільеў. „Ганяць коней" — перадаваць цыдулкі з камэры ў камэру праз вокны пры дапамозе спэцыяльных палачак і нітак.

„У нас гэта называецца „хабэты", — тлумачыць правадні́к. Так. Будынкі старыя, вокны камэраў побач адно ад другога, таму, хоць гэта й нельга, інфармацыя ходзіць туды-сюды. Адзінае, што мы пільнуем, дык гэта каб тыя, хто сядзіць да суда й ужо асуджаныя мелі як найменей кантактаў, бо гэта можа перашкодзіць сьледзтву й суду".

Мы заходзім у будынак арышту, дзе ўтрымліваюцца мужчыны. Тут ужо стаіць больш густы мужчынскі дух. Пахне потам і няўлоўнай казёншчынай, якой сьмярдзяць усе вайсковыя казармы, вакзалы й агульныя вагоны. Нам ізноў паказваюць капліцу, дзе стаіць сьвяты Юзаф памаляваны ў зьняволенага, у паласатай робе й барэтцы. Затым нас вядуць у бібліятэку. Два маладыя здаровыя хлопцы сядзяць каля кампутара. Яны ўстаюць, калі мы заходзім, трымаючы рукі па швах. Гэта бібліятэкары. Я гартаю каталёг кніжак, набраны на кампутары й знаходжу штук пяць беларускіх.

Затым мы ідзем на самы верхні паверх, дзе разьмешчаны карантін і зьняволеныя праходзяць мэдагляд. Васільеў распавядае, як па прыбыцьці ў нашых турмах зьняволеных заганяюць у „стакан". Гэта памяшканьне велічынёй прыкладна ў чатыры квадратных мэтры, куды набіваюць да дваццаці чалавек на дзьве-тры гадзіны. Сядзець там няма як, таму ўсе стаяць і паляць…

Мы заходзім у кабінэт да псыхоляга, маладой высокай чарнявай дзяўчыны, якая праводзіць першаснае тэставаньне ўсіх непаўнагадовых і зьняволеных з падазрэньнем на псыхічнае неўраўнаважаньне. Псыхолягі на падставе тэстаў рэкамэндуюць, у якой камэры, з кім павінен сядзець зьняволены. Калі знаходзяць больш сур'ёзныя псыхічныя

апхіленьні, тады накіроўваюць такіх зьняволеных на дадатковае абсьледваньне ўжо да дактароў.

„Як вам тут працуецца са злачынцамі?" — пытаюся я.

„Прызвычаілася, бо працую ўжо шэсьць гадоў", — адказвае міла пасьміхаючыся дзяўчына.

Мы сыходзім ніжэй на паверх і ахоўнік у форме запускае нас у камэру на чатырох асобаў, сядзельцы з якой у гэты час ходзяць на прагулцы. Двух'ярусныя ложкі, выразаныя з часопісаў плякаты з прыгажунямі на сцэнах, красоўкі ў куце ды іншыя шмоткі, разьвешаныя на білах ложкаў. Цеснавата, але даволі прыстойна, на сухоты ў такіх умовах дакладна не захварэць.

„М-да... — працягвае зьдзіўляцца Васільеў, — і ў кожнага зьняволенага ёсьць свой ложак?"

„Так, — тлумачыць праваднік, — у кожнага свой. Калі не хапае месцаў, дастаўляем у камэры дадатковыя ложкі, але кожны мае свой".

„А ў нас бывае, што сьпяць па чарзе ў тры зьмены, столькі народу набіваюць. У гродзенскім СІЗА мяне закінулі ў камэру з асфальтавай падлогай. 19 чалавек там і ўсе паляць, акрамя мяне. Я пачаў задыхацца, потым папрасіў жонку, каб перадала соду й паласкаў горла кожныя дзьве гадзіны".

Мы зазіраем у вочка большай камэры, дзе знаходзіцца чалавек пад дваццаць. Відно, як сядзяць-гамоняць здаровыя накачаныя маладыя хлопцы — рукі ў татуіроўках, чутно як у камэры стаіць ціхі гул.

Затым нам паказваюць штрафную камэру: жалезны ложак, памяшканьне бяз вокнаў.

„Ці магчымыя катаваньні тых, хто не падпарадкоўваецца, ці штосьці парушыў?" — пытаецца Васільеў.

„Не, — кажа праваднік, — зараз нават ужываньне спэцсродкаў супраць тых, хто не падпарадкоўваецца ці буяніць, магчымае толькі ў прысутнасьці кіраўніка аховы з абавязковым запісам на відэакамэру, бо кожны такі выпадак потым разглядаецца асобна".

„А ў нас, — горка пасьміхаецца Васільеў, — што я сам бачыў у Воршы: Ваня быў там, такі недалёкі хлопец, вечна штосьці рабіў на тэрыторыі, аднойчы спазьніўся ў сталоўку, прасіў накарміць, яго адагналі, ён зноўку прасіўся, настойваў. Для такіх людзей ежа — найпершае й найгалаўнейшае. Дык яго ўзялі, „убілі кайданкі" — гэта калі рукі пераціскаюць жалезнымі кайданкамі каля лакця й трымаюць так гадзіну. Рукі становяцца аж чорнымі ад застаялай крыві, а потым кайданкі здымаюць і чалавек аж усцыкаецца ад страшэннага болю. Закінулі яго ў карцэр, патрымалі там два тыдні, пакуль рукі адпухлі, затым выпусьцілі".

Такім самым шляхам праз двор мы вяртаемся назад у адміністратыўны будынак. Адчуваньняў шмат. Жалезныя дзьверы, лязганьне засоваў, звон ключоў і скрогат калідорных кратаў — гэта ўсё моцна дзейнічае на псыхіку нават такіх як мы „экскурсантаў".

Ад астрогу няма перасьцярогу — так казалі нашыя продкі. Туды, тым болей сёньня ў сучаснай Беларусі, можа патрапіць кожны з нас. Польская сістэма зьняволеньня перабудоўваецца згодна з міжнароднымі стандартамі ўтрыманьня вязьняў. Працэс, які пачаўся ў 1989 годзе разам са зьменай камуністычнай улады, пасьпяхова ідзе наперад.

У беларускай пэнітэнцыярнай сістэме засталіся ўсе рысы, закладзеныя ў яе яшчэ ў сталінскія часы, калі жыцьцё чалавека не каштавала нічога, нават і ламанага граша.

У зьняволеньні сядзяць такія самыя людзі як і мы, якія патрабуюць элемэнтарных правоў і ўмоваў існаваньня. Неразуменьне гэтага беларускімі ўладамі моцна б'е па маральнасьці ўсяго грамадзтва.




# беларусы

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

**Андрэй Скурко**

# Маленькая скварачка ў вялікай кашы

Хочаце пабываць у беларускім Залатым Веку? Сядзьце за адзін стол зь пяцьцю беластачанамі й слухайце. Людзі з суседніх мястэчак будуць гаварыць кожны саваёй мовай — як у часы, калі беларушчына не была кадыфікаваная-перакадыфікаваная наркамамі й БТ. Красуе барвістае разнатраўе канчаткаў, іграе вымаўленьне, хвалі інтанацый абмываюць старажытны моўны мацярык, на якім паўсталі нашы Статуты й Біблія. Беларусы зь „вялікай зямлі" часьцей хаваюць свае хатнія мовы, замяняюць іх школьнай навамовай, пазбаўленай водару Залатога Веку. Водару скарынаўскай „рускай" мовы, якой нашы продкі гаварылі з Богам. Ці гучыць цяпер у царкве мова адной з самых старажытных у Эўропе Біблій? І якое яно ўвогуле, непадкантрольнае РПЦ беларускае праваслаўе? Вандроўку па Беласточчыне пачнем з Супрасьльскага манастыра — найбольшай сьвятыні гэтых земляў.

„У вас сьвятарства расслабленае, разьлененае, — кажа настаяцель Супрасьльскага манастыра архімандрыт Гаўрыіл. — А мы тут мусім штодня змагацца. За кожную душу!” Серабрыстае аўто архімандрыта ляціць па шашы з хуткасьцю 80 км/г. Айца Гаўрыіла выклікалі ў Варшаву і абяцанае інтэрвію давялося пакуль адкласьці, задаволіўшыся бліцам між Супрасьлем і Беластокам. „Колькі ў вас манахаў?” — „Ваенная тайна! Скажаш мала — будуць лічыць, слабое праваслаўе, скажаш многа — недругі задумаюцца”. У прымружаных вачах айца Гаўрыіла бліскае іронія: „Вось колькі летась у вас на Гарадзеншчыне новых сьвятароў зьявілася ў прыходах? Ня ведаеш? А мы ведаем! У нас выведка — як у Ватыкану. Іначай тут нельга!..”

Архімандрыт даімчаў мяне да Беластоку за пятнаццаць хвілін. Аўтобусам ехаць хвілінаў сорак. Праўда, палову часу займае дарога праз сам Беласток. Горад запамінаецца мноствам перадвыбарнай рэклямы: сёлета Польшча перажыла прэзыдэнцкую й парлямэнцкую кампаніі. Ды што горад — каляровыя ўлёткі з тварамі кандыдатаў расклееныя нават у лесе на дрэвах. Прынамсі, уздоўж шашы.

Супрасьльскі манастыр стаіць воддаль мястэчка. Музыка старой архітэктуры. Чаму цяпер не будуюць так прыгожа? І адкуль у продкаў была такая яснасьць стылю? Мо папросту „Русское Радио” ня слухалі?

Дыямэнт манастыра, Дабравешчанскую царкву, зьнішчаную ў вайну дазваньня, пачалі адбудоўваць дваццаць гадоў таму. Беларускі ўрад у пачатку 1990-х гадоў выдаткаваў на сьвятыню 200 тысяч штук цэглы й 500 кв. м. граніту. Першы камень у падмурак закладаў тагачасны япіскап беластоцка-гданьскі Сава, цяпер мітрапаліт Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Сёньня сястра Сынкавіцкай і Маламажэйкаўскай цэркваў падпірае неба магутнымі вежамі. І яшчэ на дваццаць гадоў рэстаўратарам досыць працы ў Супрасьлі — левае крыло

манастырскіх будынкаў пакуль цалкам нежылое. Вакол снуюць работнікі. На пажухлай восеньскай траве стаяць дзьве цыбулепадобныя макаўкі, абабітыя медзьдзю.

### Уланская бабка

Застаць у манастыры кагосьці са сьвятарства ўдалося ня зь першага разу. Пасьля працяглых званкоў дзьверы манастырскай прыёмнай адчыніла кабета. Сталая, у белым кухарскім халаце. „А архімандрыта няма. І нікога няма. Дзьмітраўская субота — дык яны на могілках усе”. Чакаючы прыёмнае гадзіны, туляюся Супрасьлем. Золкая раніца. Над камінамі сьцеляцца ўтульныя восеньскія дымы. Акуратныя шаляваныя й цагляныя хаткі, ружы ў палісадніках, на кожнай брамцы — надпіс: „Uwaga, ostry pies”. Нават калі той „пес” — кату па пяту.

Супрасьль патроху ператвараецца ў курорт. Экалёгія й здаровы клімат вабяць сюды прыезджых з Варшавы й Цэнтральнай Польшчы: квадратны мэтар зямлі тут каштуе як у сталіцы. Дзе-нідзе на вуліцах відаць указальнікі: „Найманьне пакояў”. Праўда, турыстычная інфраструктура толькі ў плянах. Яна мусіць паўстаць у наступныя дзесяць гадоў на грошы Эўразьвязу. Пакуль-жа ў золкія 8 гадзін раніцы ў мястэчку няма дзе дзецца. Адзіны заўважаны „Бар” працуе ад 11-й. І прэзэнтуе „рэгіянальную кухню”. Страва дня — „бабка бульбяная, уланская”.

У шапіку з прэсай, побач з цэнтральнымі „Газэтай Выборчай”, „Жэчпасполітай”, ляжыць „Наш Дзеньнік”, газэта праварадыкальнай Лігі Польскіх Сем’яў. Гэтая газэта прадаецца нават у прадуктовых крамах. Кожны нумар прысьвечаны пэўнай мясцовасьці й мае каляровую ўкладку з этнаграфічнымі хаткамі, народнымі строямі, зьвярамі й птушкамі. Газэта беларусаў у Польшчы „Ніва” — у далёкім куце, заторкнутая за дзіцячыя кніжкі. Ківаю кіяскёрцы: „Ці добра „Ніва” прадаецца?” — „Прадаецца”.

У Супрасьлі два касьцёлы. Той, каторы бліжэй да манастыра, быў перад вайной лютэранскай кірхай. Куды

падзеліся пратэстанты? Хто за немцамі падаўся на Захад, хто ў глыб Польшчы, рэшта распусьцілася між праваслаўных і каталікоў. Зранку былая кірха зачыненая. У касьцёле імша. Шэсьць бабулек у махеравых барэтах, ксёндз і копія іконы Маці Божай Вастрабрамскай у алтары. „Гэта з раніцы, людзі-ж усе на працы, — камэнтуе прадавачка мясцовага супэрмаркету, эўрапэізаваная цётка-магазіншчыца. — А так два касьцёлы сябе спраўджваюць". Зь пяці тысяч насельнікаў Супрасьлю праваслаўных семсот чалавек. „Калі царквы не было, яны ў касьцёл хадзілі некаторыя. Дзеля цікавасьці, або як..." — „Калатні няма. Ксёндз з папом размаўляюць", — дадае стары, што падграбае лісьце ля касьцёлу.

Апошняя супрасьльская „калатня" тычылася катакомбаў — рэшткаў царквы Ўваскрасеньня Хрыстова паблізу манастыра. У яе скляпеньнях хавалі заснавальнікаў Супрасьльскага манастыра. І пахаваньні, і сама царква былі зьнішчаныя пасьля вайны. Спрэчка за гэтыя раскапаныя падмуркі — апошняе водгульле змаганьня за ўвесь манастырскі комплекс, які ў сваім доўгім жыцьці пабыў і праваслаўным, і вуніяцкім. Катакомбы ўрэшце засталіся за манастыром. Цяпер яны абнесеныя будаўнічай стужкай. Побач, як абарог, — праваслаўны й каталіцкі крыжы, счэпленыя агульнай папярэчынай.

### Манастыр на курорце

„У касьцёле няма такога духу моцнага, такой містыкі, як у нас. У некаторых рыма-каталіцкіх кляштарах дапускаецца, каб манахі займаліся мэдытацыямі нават не хрысьціянскіх культаў. Каб узмацняцца духоўна. У нас гэта непадумна. Наша крыніца — благадаць Духа Сьвятога, жыцьцё па Эвангельлю. Калі людзі жывуць па Эвангельлю, удзельнічаюць у таінствах, каторыя дае царква, абшчаюцца духоўнымі цэнтрамі, каторыя праабражаюць чалавека, даюць яму новы напрамак, узмацняюць у духоўным жыцьці. Такімі крыніцамі духоўнымі, да якіх людзі спакон вякоў хадзілі

й езьдзілі, зьяўляюцца манастыры, цудатворныя іконы, сьвятыя мошчы, Афонская гара ў Грэцыі, Кіева-Пячэрская лаўра, у вас Жыровіцкая абіцель, Троіца-Сергіева лаўра на Русі, другія манастыры, намоленыя вякамі, благадатныя...” Мы гутарым з архімандрытам Гаўрыілам у манастырскай перадканцылярыі. Салідная разьблёная мэбля, фатэлі, кілімы. На сьценах — самыя розныя карціны: ад рэалістычнага Сергія Раданескага да імпрэсіяністычнага афорціка сьвятой гары Грабаркі. Гэта ўсё падарункі манастыру ад вучняў. Сам айцец Гаўрыіл у манастыры ад самага яго адраджэньня. Спачатку яны тут былі ўдвох з намесьнікам. Намесьнік цяпер — япіскап Мірон, апякун праваслаўных салдатаў польскага войска. Той „япіскап з калашнікавым”, што лётаў у Ірак да сваёй паствы.

Іканапісная школа на Беласточчыне адна — у Бельску. Але пры кожным манастыры ёсьць свая майстэрня. Чым яшчэ займаецца брацiя? Хто на што здольны, кажа айцец Гаўрыіл, раздрукоўваючы мне на ксэраксе копію манастырскага распарадку дня. Госпад прызывае людзей у манастыр і тыя, каторыя надаюцца да школаў, ідуць у сэмінарыю, у акадэмію. Іншыя дапамагаюць кухарцы на кухні, нехта водзіць экскурсіі, паслушнікі працуюць на падворку. Дый людзі цэлы дзень ідуць — трэба прымаць. Тыя, хто мае слых, сьпяваюць у невялікім манаскім хоры. Апроч яго пры манастыры ёсьць дзіцячы хор „Загадка”. „Дзеці самі так назвалі. Бо, вядома, заўжды гатуецца хор, каб акуратна сьпяваць, а бывае ня выйдзе ім што-небудзь. Пагэтаму загадка — як выступім”, — тлумачыць архімандрыт. На бліскучыя кубкі й граматы, якія „Загадка” атрымала за выступы ў Грэцыі, Нямеччыне, Расеі, Беларусі, самой Польшчы, адведзеная цэлая шафка.

Айцец Гаўрыіл цешыцца з курортнае будучыні Супрасьлю. Манастыр — найпершы пункт усіх экскурсіяў. „Гэткім чынам мы абуджаем у людзях цікавасьць да пра-

васлаўя”. Звініць званок: прыехалі школьнікі на экскурсію. Айцец Гаўрыіл вядзе паказаць царкву Яна Багаслова, што месьціцца проста ў жылым корпусе, пакуль яе не запаланілі экскурсанты. Невялікі прыцемнены храм. Перад іконай Усіх беларускіх сьвятых гарыць лампадка. Царква моцна пацярпела ў 1956-1959 гадах, яе мусілі зусім разабраць... Словы архімандрыта абрывае званок сотавага тэлефону. І айцу Гаўрыілу, і братам-манахам, што маюць асаблівыя службы, можна карыстацца мабільнікамі. Але фатаграфаваць, як ён гаворыць, айцец Гаўрыіл забараняе.

Каля манастырскай кухні натыкаемся на прыхілены да сьцяны чырвона-зялёны сьцяг. „Во, насаджвалі на чаранок, — крыху сумеўшыся тлумачыць архімандрыт, — каб паставіць у афіцыйнай залі, зь іншымі сьцягамі”. Мо гэта неяк зьвязана з тым, што напярэдадні манастыр наведала здымачная група БТ?

З натугай адчыняюцца каваныя дзьверы ў галоўны супрасьльскі храм. Дзіўна, але гіганцкая, магутная звонку царква ўсярэдзіне ня дужа вялікая. Абарончае дойлідзтва — не паветраная готыка. Грубыя сьцены, магутныя скляпеньні, невялічкія вокны-байніцы. На трохмэтровай вышыні ад падлогі — пас беларускай цэглы. Яна сьвятлейшая за мясцовую. Айцец Гаўрыіл пстрыкае рубільнікамі й электрычнае сьвятло залівае храм. Няма яшчэ тынкоўкі, росьпісаў. Будуць фрэскі, новы іканастас, спасыды — спэцыяльныя крэслы, за якімі можна й стаяць, і сядзець. Асаблівы гонар айца Гаўрыіла — харас-панікадзіла зь іконамі сьвятых апосталаў і прарокаў: „Такога ў вас у Беларусі няма”. Тут — копія цудатворнай іконы Божай Маці Супрасьльскай. Арыгінал быў вывезены ў 1914 годзе, падчас бежанства, у Маскву й там прапаў.

Ідзем нежылым манастырскім крылом. Звонку ён мае выгляд — увесь корпус накрылі мэталадахоўкай, паўстаўлялі эўравокны. У 2005 годзе манастыр атрымаў

зь дзяржбюджэту Польшчы два мільёны злотых на рамонт. Але ўсярэдзіне працы яшчэ — пачаць і скончыць. „Як ёсьць фінансы, дык мы рамантуем, як няма — чакаем і молімся, каб Госпад паслаў каму-небудзь сьветлую думку ахвяраваць на манастыр”, — гулка разносяцца калідорам словы айца Гаўрыіла.

Тут месьціцца невялікая друкарня. Працуюць у ёй чалавек пяць — мужчыны й дзяўчаты. Зараз яны робяць „мірскія кніжкі” — выконваюць замову Нарваўскага заводу, які займаецца трактарамі. Невялікі „Пронар”, што жвава бегае знадворку — вынік гэтага плённага супрацоўніцтва. Паслушнікі парадкуюць на прычэп трактару старыя рамы й бясплатна развозяць на апал прыхаджанам сталага веку. Айцец Гаўрыіл разважае, пазіраючы на адстаяныя катакомбы: „Добра па-суседзку жыць. Касьцёл у Польшчы найбольшы. Павінен памагаць меншым цэрквам, пазьбягаць цяжкіх сытуацый. Гісторыя складаная. Трэба папросту быць адкрытым”. Ізноў зьвініць мабільнік: „А-а, добраго здороўічка...”. Гэта вярнуўся з Грэцыі навуковы кіраўнік доктарскай дысэртацыі айца Гаўрыіла.

**Топ-навіна для праваслаўных**

Нашы беластоцкія суродзічы паперадзе ўсіх беларусаў увайшлі ў Эўразьвяз. У прыватнасьці, гатэль „Туркус” яўна пераўжыў укладаньне эўразьвязаўскіх грошай. Эўрапакеты на вокнах, Інтэрнэт, швэдзкі стол з раніцы. Праўда, зарэтушаваць размах сармацкай гасьціннасьці не ўдалося. Падлогі ў пакоях выкладзеныя белай пліткай 30x30, замест сьцяны — шафа-купэ зь люстэркамі. Адсоўваеш адну сэкцыю — трапляеш у лазенку, адсоўваеш іншую — трапляеш, уласна, у шафу. Прычым туды трэба заходзіць. Куды там Старой Эўропе зь яе культам кампактнасьці, пакручастых лесьвічак і алягічных калідорчыкаў. Праўда, з вакна „Туркусу” адкрываецца від на цудоўны барочны касьцёл — калі глядзець паўзьверх бэнзазапраўкі. Беластоцкія храмы

не абыдзеш за тыдзень. Іх тут больш, чым у двухмільённым Менску. Папросту сядзьце ў душэўны гарадзкі аўтобус, электроннае табло якога паказвае, апроч інфармацыі пра маршрут, чые сягоньня імяніны. І пабачыце канструктывісцкі касьцёл, падобны адначасова як да стамбульскага мінарэта, так і да менскай Опэры. Або постмадэрную царкву, архітэктар якой спалучыў готыку з суздальска-ўладзімірскім стылем. Галоўны праваслаўны храм Беластоку — сабор сьв. Мікалая, побач якога месьціцца рэзыдэнцыя япіскапа беластоцка-гданьскага Якуба. У дольнай залі сабору зь верасьня йдзе польскамоўная служба. Яе ўвядзеньне было топ-навіною гэтага году для беластоцкіх праваслаўных.

Усяго праваслаўных у Польшчы каля 500 тысяч. Недзе палова зь іх — этнічныя беларусы. Астатнія — украінцы, палякі, лэмкі, каторыя сябе ўкраінцамі ня лічаць. У большасьці цэркваў Польшчы служаць па-царкоўнаславянску. Толькі япіскап-патрыёт Пярэмышльскай япархіі ўвёў ва ўсіх сваіх храмах украінскую службу. На Беласточчыне скрозь па-беларуску маліліся толькі ў часе вайны. Цяпер беларускую службу можна паслухаць у адной царкве сьв. Сафіі ў Беластоку. Польскую — ужо ў чатырох цэрквах: сьв.сьв. Кірылы й Мятода ў Вроцлаве, Сьв. Тройцы ў Варшаве й дзьвюх беластоцкіх — Сьв. Духа на Антанюку й сьв. Мікалая. Служба, разьлічаная на праваслаўных палякаў, бывае раз на тыдзень у дольных цэрквах. Але хто такія праваслаўныя палякі? Ці ёсьць яны? „Гэта людзі аднаго пакаленьня, — пэўны гісторык і багаслоў, прафэсар Антон Мірановіч. — У наступным пакаленьні яны або пераходзяць да каталіцызму, або вяртаюцца да сваёй сапраўднай нацыянальнасьці. Сьвятары кажуць, што гэта служба для праваслаўных, якія маюць польскае нацыянальнае пачуцьцё й для тых, хто жыве ў зьмяшаных шлюбах. Але большасьць прыходзіць туды зь цікавасьці...”

## Бардзо задаволёны

Спусьціўшыся па крутых сходах у дольную царкву пры саборы сьв. Мікалая нібы трапляеш у часы катакомбнага хрысьціянства. Цэркаўка маленькая, сорак-пяцьдзясят прысутных запаўняюць яе ўсю. Тыя, што запазьніліся, стаяць на сходах — да канца службы людзей набіраецца аж да самага іх верху. Пакуль малады бацюшка моліцца па-польску, людзі моўчкі хрысьцяцца. Калі-ж чытае „Ойча наш" і „Верую" па-царкоўнаславянску, яго суправаджае зладжаны хор вернікаў. У царкве многа моладзі. Вялікавокая выпускніца Бельскага Беларускага Ліцэю, якая слова ў слова паўтарала за бацюшкам царкоўнаславянскія малітвы, ня лічыць, што ў Беластоку запатрабаваная служба па-беларуску. „У Гайнаўцы мо ці ў Бельску, але ня тут. Здаецца, і ў Беларусі больш карыстаюцца расейскай мовай..." Гаворыць яна па-польску.

Тры сталыя пані ў барэтах першы раз тут, але „бардзо задаволёны": „Сувязь з царкоўнаславянскай мовай перарвалася, расейскай у школах ня вучаць, дзецям ужо нічога не зразумела. Па-беларуску маліцца? Навошта? Усе-ж беларусы на працы тут карыстаюцца польскай мовай. Могуць і службу разумець..."

Высокі рудаваты Вячаслаў таксама вучыўся ў Бельску („мы там многа сьпявалі па-беларуску народных песень"). Пасьля скончыў гандлёвую школу, быў на стажах у Нямеччыне, на захадзе Польшчы. Кажа, там жывуць іначай: „Не глядзяць, ці ты брат, ці сын, бяруць на працу па здольнасьцях. А тут могуць яшчэ й палкі ў колы ставіць, калі занадта актыўны... У Беластоку людзі чакаюць, што нехта ім дапаможа. Створыць прадпрыемства, возьме на працу. Самі не парупяцца". На польскую багаслужбу ён прыйшоў упершыню, зь цікавасьці. На яго думку, патрэба ў ёй ёсьць. „У Варшаве польскую службу ў царкве ўводзілі мае аднагодкі", — кажа Вячаслаў зь нейкім адценьнем гонару. Падобна выказаўся й Дарыюш Жданюк, кіраўнік моладзевага праваслаўна-

га брацтва: „У Польшчы *толькі* чатыры царквы, дзе служба йдзе на мове тытульнай нацыі”.

**Качынскі галасаваў супраць**

„Для мяне гэта не пагроза, — пагаджаецца дэпутат Сойму Яўген Чыквін. — Ня думаю, што пры маім жыцьці на польскія службы будзе хадзіць больш за пару працэнтаў гэтых людзей, якія й так сябе палякамі лічаць. А можа бяз гэтага яны наагул не пайшлі-б у царкву”. Ён ад 1989 году прадстаўляе Беласточчыну ў парлямэнце. Чыквін дабіваўся прыняцьця Закону аб стаўленьні дзяржавы да Праваслаўнай Царквы, паводле якога Царкве адышла раней канфіскаваная маёмасьць. Другая заслуга Чыквіна — Закон аб нацыянальных меншасьцях. „Частка польскай эліты, перад усім правыя, не хацелі яго, — распавядае дэпутат. — Пакт, які цяпер кіруе дзяржавай, Права й Справядлівасьць, усе 100% галасавалі проці гэтага закону. Казалі, яго прыняцьцё падарве базавыя прынцыпы польскай дзяржавы, будзе пагражаць тэрытарыяльнай цэласьці. І гэта ў сытуацыі, калі ўсіх меншасьцяў у Польшчы — 2,5%. Закон прайшоў зь перавагай у пару галасоў — левыя мелі тады вялікую фракцыю. Цяпер ён бы не прайшоў. Але Польшча ў ЭЗ, дзе правы меншасьцяў становяцца лякмусавай паперкай для дзяржавы. І цяпер у гэтым канфлікце гродзенскіх палякаў, калі мяне пытаюць журналісты, я кажу: канешне, Польшча прыняла такі добры закон аб сваіх мяншынях, мы маем права — маральнае — чакаць, што палякаў будуць трактаваць дастойна ў Беларусі”.

Сьвежы яшчэ ўспамін і пра прэзыдэнцкія выбары. Чаму выбарцы Гайнаўскага павету так масава галасавалі за Дональда Туска, хоць на Беласточчыне большасьць галасоў узяў Качынскі? „Качынскі — гэта польская правая партыя, зьвязаная з Каталіцкім Касьцёлам, — кажа Чыквін, — а нашы людзі гэтага пабойваюцца інстынктыўна. Таму й у „Салідарнасьць” ня ішлі сваім часам, бо яна была зьвязаная з каталікамі”.

## Хай яе, тую палітыку

У 2003-2005 гадах дэпутат Чыквін узначальваў польска-беларускую міжпарлямэнцкую групу. „Два пераходы новыя адкрылі: у Белавежы й на Аўгустоўскім канале. Рабілі сумесныя дзеяньні ў справе аховы Белавескай пушчы. Праўда мы, як дэпутаты, больш слухалі на тых паседжаньнях, а гаварылі лесьнікі, спэцыялісты... Зь беларускай стараны ў міжпарлямэнцкай камісіі Чаргінец старшыня. Я прапанаваў: давайце нейкімі канкрэтнымі справамі будзем займацца. Палітыку тую, хай яе... І яны пагадзіліся...”

Час ад часу спадару дэпутату даводзіцца гаварыць гучней, бо за сьцяною гудзе электрадрыль. У рэдакцыі часопісу „Przegląd Prawosławny”, які займае два пакойчыкі ў адной зь беластоцкіх друкарань, скончаецца рамонт. Яўген Чыквін — рэдактар гэтага часопісу. Выходзіць „Пшэглёнд” па-польску, але зь беларускімі, украінскімі й расейскімі ўстаўкамі. Прадаецца ён ва ўсіх цэрквах Беласточчыны. У верасьнёўскі нумар укладзеная ўлётка са справаздачай дэпутата за мінулыя чатыры гады ў Сойме. У кастрычніцкім паведамлялася, што Яўген Чыквін зноў абраны ў Сойм 14 181 голасам. На вокладцы лістападаўскага — Яўген Чыквін з патрыярхам Алексіем II і мітрапалітам Савам адчыняе ў Маскве выставу, прысьвечаную польскаму праваслаўю. Існаваньне праваслаўных палякаў дэпутат пацьвярджае. „Ёсьць карэнныя палякі — нямнога — якія прынялі праваслаўе. Але ёсьць і беларусы, што проста ў працэсе асыміляцыі сябе адчуваюць ці дэкларуюць палякамі, хаця іх дзяды яшчэ былі беларусамі ці ўкраінцамі. Але яны нашы людзі, радыкальна адрозьніваюцца ад палякаў. Цікава, што праз два ці тры пакаленьні яны вяртаюцца да беларускай самаідэнтыфікацыі. Так што яны ня страчаныя назусім, бо праз царкву маюць кантакт з усходнеславянскай культурай”.

Думку аб тым, што царква, трымаючыся царкоўнаславяншчыны, кансэрвуе мэнталітэт тутэйшага, не дае

kamunikat.org

людзям самаідэнтыфікавацца, і ўрэшце спрыяе палянізацыі, ён адкідае: „Без праваслаўя не было-б і беларускага нацыянальнага жыцьця!” Як прыклад — беларусы-каталікі, што жывуць у ваколіцах Саколкі. „Іх гаворкі бліжэйшыя да літаратурнай беларускай мовы, чым беластоцкія, але там усе лічаць сябе палякамі. Беларусы палянізаваліся, пераяжджаючы ў гарады, у зьмяшаных шлюбах. Людзі намагаюцца хаваць сваю адрознасьць. Слабае тут беларускае культурнае жыцьцё, слабыя кантакты зь Беларусьсю — ну на што абаперціся? Культура польская, і тэатры, і кіно, і музыка. Кантакты адрэзаныя яшчэ пры савецкай уладзе. А службы па-беларуску непазьбежна ўвядуць. Царква-ж ня можа адмовіць, калі людзі ходзяць, просяць”. Калі я заўважаю, што й ходзяць жа, і просяць, высьвятляецца, што ходзяць ня тыя. „Бывае так, што ў нас узьнімаюць гэтую тэму людзі ня вельмі царкоўныя. Каб пакрычаць, што няма службы па-беларуску. А як увядуць, дык ня прыйдуць...” На гэты закід рэдактар „Нівы” Яўген Вапа адно ўсьміхнуўся й сказаў: „А вось хай увядуць. Хай увядуць!”

### „Нейкі рытуал”

Чаму гэта так важна? „Бо праваслаўе тут яднае. Выразна, — кажа Ян Чыквін, старшыня беластоцкай суполкі пісьменьнікаў. — Ня мова. Беларусы ў гарадах гавораць па-польску, у вёсках — на дыялекце. Багаслужба па-польску паскарае працэс асыміляцыі. Палякі будуць памалу націскаць на япіскапаў, каб перавесьці набажэнства на польскую мову. Палякам на гэтым залежыць.

Нас змушаюць быць палякамі ў сваіх паводзінах, мове, традыцыях, сьвяткаваньнях. Калі ідзеш даваць імя дзіцяці, падкажуць іншае. Канешне, калі адмовішся — няма расстрэлу. Але падказваюць. У школе таксама. Ледзь зьвініць званок на перапынак, настаўніца беларускай мовы гаворыць: „Dzieci, proszę ciszej!”. І дзіця адчувае, што ўрок беларускай мовы — гэта нейкі рытуал.

А тут ужо нармальнае жыццё пачынаецца. А там было ненармальнае”.

Георгі Валкавыцкі, першы рэдактар беларускага тыднёвіка „Ніва” кажа, што яго газэта пашыралася збольшага сярод праваслаўных. „З каталікоў яе выпісвалі адзінкі. Быў у Новым Двары дзядзька — яго браты-ксяндзы загінулі ў Сыбіры. Выпісваў, але карэспандэнтам стаць не схацеў. З-за асяродзьдзя. І было чаго. Вунь у 1956 годзе ў Міхалове зь бібліятэкі ўсе беларускія кніжкі, якія былі, спалілі на пляцы. „Ніву” часам выкідалі з шапікаў. А нават калі й не выкідалі, то калі падыдзе хто купляць, а яму кажуць: „Навошта табе гэта камуністычнае гаўно?..”

Нацыянальныя праблемы трансфармуюцца ў палітычныя, палітычныя ў рэлігійныя. Няма ў сьвеце ніводнай бязболеснай мяжы. І на старыя траўмы накладаюцца новыя. Беластоцкі парадокс: з аднаго боку ўсе нацыянальныя арганізацыі тут маюць якую-ніякую дзяржаўную датацыю, зь іншага, кажа прафэсар Антон Мірановіч, „усе дзеяньні й рэлігійных, і грамадзкіх польскіх установ накіраваныя на тое, каб абмежаваць беларускае нацыянальнае жыццё. Во да чаго даходзіць: у інтэрвію газэце „Кур’ер Паранны” я сказаў, што беларусы ў нас маюць свае праблемы. А журналіст напісаў, што беларусы Беласточчыны маюць такія самыя праблемы, як палякі на Гарадзеншчыне. І ўсе газэты тыдзень пісалі, які я вораг Польшчы й прапаноўвалі мне выехаць у Беларусь... Польскай дзяржаве выгадна, каб беларускі рух быў абмежаваны да афіцыйных арганізацый, без нармальнага грамадзкага жыцьця беларусаў. Ня ў тым справа, што баяцца. У польскай палітыцы заўжды ёсьць тэндэнцыя палянізаваць нават тыя малыя групы, што засталіся...” Беларусы Беласточчыны багата кажуць пра асыміляцыю, пра тое, што ім няма ад каго спадзявацца помачы. Беларускай уладзе нявыгадна бараніць іх нацыянальныя правы, бо сьледам зноў

чакай заявы аб нацыянальных правах ад уласных беларусаў. Дэмакратычнае-ж грамадзтва небеспадстаўна бачыць у Польшчы стратэгічнага партнэра, які, у адрозьненьні ад Расеі, ня будзе блытаць палітыку з эканомікай. І ўсё-ж вырашэньне беластоцкай праблемы ляжыць за ўсходняй мяжой. Гэты балючы вузел разьвяжацца тады, калі скончыцца час палітычных парыяў. Калі тэлебачаньне, якое трансьлюецца на памежныя рэгіёны, будзе сапраўды беларускім. Калі ў праваслаўных цэрквах Беларусі пачнуць служыць па-беларуску. Калі „беларускай культурай” перастануць называць адно этнаграфізм і безгустоўнасьць. Калі, урэшце, беларускую валюту будуць прымаць у замежных абменьніках. Калі Беларусь стане Беларусьсю. Да тае пары беластачане могуць разьлічваць толькі на ўласныя сілы й цьвёрдасьць духу, якія можна чэрпаць са Скарынавай Бібліі. Чаму — патлумачыў айцец Рыгор Сасна.

**Зямля Рускай Бібліі**

Вёска Рыбалы ляжыць між Заблудавам і Бельскам. Асфальт, акуратныя платы й хаты, ахайная царква — у нас сказалі-б „мураўёўка”. Побач — пяцімэтровы драўляны крыж, які дзіцячая рука размалявала выявамі анёлаў і сьвятых. Такую акцыю — каб дзеці ўпрыгожвалі крыжы пры цэрквах — прыдумаў мастак Лявон Тарасэвіч. „Дзе-ж тут бацюшкаў дом?” — запытваю ў цёткі, якая цягне ваду са студні. Яна гаворыць да мяне палескім дыялектам. І маю беларускую разумее цудоўна. „У нас людзкі бацюшка. Ён любога прыйме”, — кажа яна, ведучы мяне да абсаджанай туямі хаты з высокім ганкам. На званок выйшаў сам айцец Рыгор. Высокі, асаністы, без барады й зь белай калараткай на чорнай кашулі. У бацюшкі госьці — прыехаў вучань, які зараз працуе на захадзе Польшчы, пад Вроцлавам, прыехалі дачка й сын зь сем’ямі. Дзіцячыя галасы, на падлозе раскіданыя цацкі, вялікі стол. Госьці, спажываючы гарачыя флякі, гамоняць міжсобку „хатняй” мовай.

— Тут ніколі не было чыстай літаратурнай беларускай, тым больш украінскай мовы, — кажа айцец Сасна. — Кожная вёска мае сваю гаворку. Мая парафія знаходзіцца ў межах даўняга Падляшскага ваяводзтва, а тут пяць кілямэтраў за рэчкай, пад Заблудаў, было Троцкае ваяводзтва. Дык тут інная мова, а там інная. Напэўно, яна не такая, як у Менску або як літаратурная мова, але гэта мова, на якой пісаліся Статуты, на якой да 1607 году выдаваліся ўсе ўказы, фундацыі. Гэта мова Бібліі Скарыны. І, вы знаеце, для мяне асабіста — гэта найцаньнейшае. Тое, што мы зьяўляемся нашчадкамі той мовы, таго разгавору, які меў назву „рускі".

Кабінэт айца Рыгора абстаўлены кніжнымі паліцамі з духоўнымі кнігамі, фаліянтамі энцыкляпэдыяў, архіўнымі тэчкамі. Кампутар зь невялікім маніторам, на іншым стале — ноўтбук. Разам з матушкай Антанінай айцец Рыгор Сасна піша артыкулы й кнігі. За 36 гадоў іх назьбіралася больш за тры сотні. Зараз матушка складае свой радавод, а бацюшка — даведнік цэркваў Заходняй Беларусі за польскім часам. І вельмі пакутуе ад недахопу крыніцаў. „За саветамі ў вас назвы многіх мясцовасьцяў зьмяніліся. Бывае цяжка адшукаць як цяпер многія вёскі й гарады называюцца". Якім коштам выдаюцца яго кніжкі? „Тое, што я не прап'ю, не пракуру — тое ўкладу ў макулятуру", — сьмяецца айцец Рыгор.

Прыход у яго збольшага пэнсійны. За год хрысьціў толькі двaіх, а пахаваў дваццаць пяць. „Але ў вас, я чуў статыстыку, 56% сем'яў разводзіцца, — кажа айцец Рыгор. — Гэта-ж трагедыя для дзяржавы, для народу..."

Найменшая пэнсія ў Рыбалах — 150 даляраў. Маладыя выяжджаюць у гарады, шукаючы працы. „Бо на вёсцы якая работа? Ну, птушкафэрму, што была некалі дзяржаўная, прыватнік узяў. Там раней дзьвесьце чалавек рабіла, а цяпер дваццаць". Ад тых курэй „курнікамі" называюць блёчныя дамы збудаваныя для рабочых птушкафабрыкі. Толькі там у ваколіцы ёсьць каталікі.

„Панаяжджала людзей з розных старон. 36 сем'яў праваслаўных, 28 каталіцкіх. Двое аж з Казахстану — таксама каталікі. Яна Тацяна, ён Васілій...”

Да 1989 году было цяжэй. Я добра тыя часы помню. Калі штось будуваты, трэба было прашэньне пісаць. Але давалі рады... Калі я хадзіў з калядой, заходзіў да першага сакратара партыі, дык той, панятно, стаяў за дзвэрыма, а жонка прымала. А потым мы разам чай пілі. У нас не было такога, як у вас. Было, можа быць, крыху, дзеля страху юдэйскага. А, напрыклад, калі я бараніў царкву ў Цеханоўцы, дык жонкі міліцыянэраў былі маімі найлепшымі прыхаджанкамі. І яны ўтрымалі царкву. Яе хацелі ці каталікі забраць, ці на музэй. А я пастанавіў не аддаваць на музэй. Яны дапамагалі, работнікаў трымалі, кармілі”.

Зараз з будоўляй прасьцей, цешыцца айцец Сасна. Вунь у Зьверках пад Беластокам паўстае цэлы комплекс — манастыр на дваццаць маладых манашак. Ён відаць ад дарогі. Незвычайны — паднесены на калянадзе.

„Нас тут засталася горстачка — нават па афіцыйнай статыстыцы запісалі нас 50 тысяч беларусаў, тысяча украінцаў на Беласточчыне. У Польшчы 95% каталікаў астатнія ўсе — 5%. Гэта, можна так сказаць, маленькая скварачка ў вялікай кашы. Праўда, стараемся, і цэрквы нашыя няблага выглядаюць, і кніжкі друкуем...”

Асаблівасьць аўтобусных прыпынкаў Беласточчыны — на 4 зь 5 няма раскладу руху. Усё ахайна пазьдзірана й выпалена дзіцячай рукою. Маю надзею, ня той самай, што расьпісвала крыжы ля цэркваў. Таму хвілінаў сорак стаю ў Рыбалах, чакаючы хоць на які аўтобус. Раптам побач спыняецца маленечкі „Фіат”: „Да Бялэгостоку?”. За рулём — сівы спадар у сінім гарнітуры пад гальштукам. „Колькі?” Усьміхаецца: „Ніц”. Мушу, відаць, заплаціць падарожнай гутаркай. Кажу, у якой я тут справе. „А, ты не паляк? Дык і я не паляк” — хітра ўсьміхаецца стары, пераходзячы на „рускую” мову.

**Дзьве найбольшыя сьвятыні Беласточчыны**

гэта Супрасьль і Гара Грабарка. Супрасьльскі Дабравешчанскі манастыр — духоўны цэнтар, роўны Жыровічам. Тут месьціцца Дабравешчанская царква, шэдэўр абароннага дойлідзтва. Да 1915 г. тут знаходзілася цудатворная ікона Супрасьльскай Адзігітрыі. У пачатку жніўня 1915 г. яна была адпраўлена ў Маскву і памешчаная ў храме Няскучнага Спаса. Адсюль ікона ў Супрасьль не вярнулася.

Супраслькі Дабравешчанскі манастыр быў заснаваны ў 1498 г. у рэзыдэнцыі маршалка літоўскага Аляксандра Хадкевіча ў Гарадку. Аднак ваяводзкі двор быў неспалучальны з манаскім жыцьцём. І ў 1500 г. брацiя перасялілася на бераг ракі Супрасьлянкі. Адным з самых вядомых настаяцеляў манастыра быў архімандрыт Іларыён Масальскі, што актыўна змагаўся супраць Берасьцейскай вуніі. Але з 1631 г. Супрасьль усё-ж трапіў у падпарадкаваньне да вуніяцкага мітрапаліта. У 1824 г. супрасьльскія манахі выказалі жаданьне вярнуцца да праваслаўя. У 1915 годзе манахі разам з жыхарамі выехалі ў бежанства. Пасьля ўтварэньня незалежнай польскай дзяржавы мясцовыя ўлады закрылі Дабравешчанскую царкву, а манастыр перайшоў да сьвецкае адміністрацыі. У вайну Дабравешчанская царква была разбураная немцамі.

Наноў манастыр адчынілі толькі ў 1958 годзе, калі ўлады вярнулі вернікам царкву сьвятога Яна Багаслова. У 1984 годзе пачалося аднаўленьне Дабравешчанскай царквы. У 1993-1996 гадах манастыру, нягледзячы на пратэсты Каталіцкага Касьцёлу, вярнулі ўсе будынкі. Просьба аб перадачы манастыру катакомбаў разглядалася з 1997 году й была станоўча вырашаная толькі летась.

Грабарка знаная з XVIII ст. Крыжовая гара з цудатворнай крыніцай. Манастыр там дзейнічае з 1947 г. Шматтысячныя паломніцтвы на Грабарку адбываюцца на сьвята Праабражэньня.

### Як музыка, як вецер

У будынку япархіі на кніжным развале, між ікон і сьвятых кніжак ляжыць друкаваны ўкраінскай мовай часопіс „Над Бугом і Нарвою”. Гэта сьвецкае выданьне ўкраінскай меншасьці Беласточчыны. Беларускіх выданьняў там няма. Пік актыўнасьці ўкраінскага руху тут прыпаў на сярэдзіну 1980-х гадоў, калі ў беластоцкіх цэрквах пачалі зьяўляцца ўкраінскія багаслужбы. Ці гэта было зьвязана з рэальнай патрэбай, ці з украінскім лобі ў япіскапаце, ці з патрэбай дзяржавы „падзяляць і ўладарыць”? Думкі разыходзяцца. Частка ўкраінцаў трапіла на Беласточчыну ў выніку апэрацыі „Вісла” 1947 году. Але ёсьць украінцы й зь ліку беларусаў. „Тут толькі адзін украінскі паэт — Астап Лапскі, дый яго бацькі пабеларуску гаварылі, — кажа Ян Чыквін. — Іншыя былі хлопцы, у „Ніве” дэбютавалі, а потым заяўлялі, што яны ўкраінцы, а потым прападалі як творчыя асобы. Бо іх вершы бралі, перакладалі на літаратурную ўкраінскую мову, а яны-ж пісалі на дыялектах. Дыялекты — гэта як музыка, як вецер. Калі ёсьць нейкі элемэнт, падобны

да ўкраінскага, нельга казаць, што гаворка ўкраінская. З такімі праблемамі сутыкаліся малыя народы ў Францыі, Нідэрляндах. Былі спробы пісаць на дыялектах, бараніць малую айчыну. Але як успыхне раз такі інфармацыйны канал, як літаратурная мова, пісаць дыялектам — вялікі крок назад".

**Антон Мірановіч пра:**

*Беларускую аўтакефалію*

Пакуль патрэбы ня бачу. Для аўтакефаліі павінна быць згода ўсіх памесных Цэркваў. Ня можна без Царквы-Маці рабіць аўтакефалію. У Польшчы мала таго, што была незалежная дзяржава, але яшчэ й незалежная царкоўная структура. І сьвятары, і япіскапат ня мелі нічога супольнага з РПЦ. У Беларусі таксама паступова разьвіваюцца незалежныя структуры. Ёсьць мітраполія, сэмінарыі, акадэмія, манастыры. Гэта ўсё вядзе да таго, што, магчыма, калі япіскапат і сабор Беларускага Экзархату захоча, Маскоўскі Патрыярхат пагодзіцца. Беларускі Экзархат ужо амаль незалежны. Ён сам прымае пастановы каго высьвяціць на япіскапа, каго зрабіць намесьнікам таго ці іншага манастыра. Як Каталіцкі Касьцёл цэнтралізаваны, так і Праваслаўная Царква мусіць мець пачуцьцё еднасьці. Усе Цэрквы павінны адна за адну быць адказныя. Цэрквы мусяць мець кантакты — ня так, як ва Ўкраіне, ці між РПЦ і Канстантынопалем.

*Нацыянальнае жыцьцё*

Для нармальнай працы трэба мець грошы, памяшканьне — а мы ня маем нават памяшканьня пад Беларускі Саюз, карыстаемся з дапамогі другіх установаў, каб зладзіць якую сустрэчу. Людзі, калі бачаць, што няма посьпеху, ня дужа ахвотна ангажуюцца ў нацыянальнае жыцьцё. Магчыма, за наступныя дваццаць-трыццаць гадоў колькасьць беларусаў на Беласточчыне паменшыц-

ца, да 50-60 тысяч, але гэта будуць сьвядомыя беларусы. Ужо ў час гэтага перапісу 50 тысяч дамагалася паставіць крыжык проці нацыянальнасьці беларус. Бо звычайна перапісчыкі аўтаматычна запісвалі ўсіх палякамі, і толькі запярэчыўшы можна было гэта зьмяніць.

*Беларусаў-каталікоў*

Яны ёсьць, хоць і нямнога. Фэномэн Сакольшчыны — вельмі цікавы. Польскі бок прыклаў там вялікія намаганьні, каб пераканаць беларусаў, што ўсе каталікі павінны быць палякамі. Аднак, між сабою яны гавораць, што яны тутэйшыя, свае, маюць пачуцьцё адрознасьці ад палякаў. А на перапісе гавораць, што яны палякі. Бо каталікі. Беларускі ксёндз — такога на Беласточчыне няма. Прыходы каталіцкія абсаджаныя ксяндзамі-палякамі. У 1920-я гады ксяндзоў-патрыётаў было шмат, хоць бы Адам Станкевіч, ці Леў Гарошка. Яны ня толькі служылі па-беларуску, але й пацярпелі ад архібіскупа, які звальняў іх з працы й пераводзіў на другія прыходы, дзе беларусаў не было.

Антон Мірановіч — гісторык і багаслоў. Прафэсар. Выкладае ў Беластоцкім Унівэрсытэце, на найвышэйшым багаслоўскім сэмінары ў Варшаве, чытае лекцыі па гісторыі Праваслаўнай Царквы ў Грэцыі.

KAMUNIKAT.org

**Марыя Савушкіна**

# Беларуская адукацыя на Беласточчыне

Адукацыя на беларускай мове зьявілся на Беласточчыне пасьля вайны, у 1947 годзе. Тады ў беларускае навучаньне было заангажавана 11 тыс. дзяцей. Сёньня гэтая лічба складае каля 3,5 тыс. Дзьве тысячы школьнікаў вучацца ў пачатковых беларускіх школах і гімназіях, каля тысячы — у беларускіх ліцэях. „Гэтыя лічбы можна назваць сымбалічнымі. Нашая моладзь на 99% асыміляваная, — кажа Ганна Кандрацюк, спэцыяліст у галіне беларускай адукацыі на Беласточчыне. — Паміж сабой моладзь размаўляе па-польску, а асноўным асяродзьдзем беларускай адукацыі стаў бацькоўскі дом”.

У пасьляваенныя гады пад „беларускай адукацыяй” разумелася навучаньне ў школах, дзе ўсе прадметы выкладаліся па-беларуску. Сытуацыя зьмянілася ў 1972 годзе. Тады ў школах, дзе навучаліся дзеці зь сем’яў нацыянальных супольнасьцяў, усё навучаньне перавялі на польскую мову. Нацыянальная мова выкладалася асоб-

ным прадметам. У зьвязку з такімі пераменамі праблема беларускага навучаньня пачала абвастрацца. „Усе пачалі казаць, што беларуская адукацыя павінна быць добраахвотнай. А хто пагодзіцца нешта вывучаць добраахвотна?” — гаворыць Яўген Вапа, галоўны рэдактар газэты беларусаў у Польшчы „Ніва”.

Зараз, на думку беларускіх лідараў Беласточчыны, беларуская адукацыя знаходзіцца ў вельмі ўразьлівым стане. Яна безабаронная. Няма арганізацыі, якая-б прадстаўляла інтарэсы настаўнікаў і дзяцей, заангажаваных у нацыянальную адукацыю. Няма мэханізму абароны сваіх інтарэсаў падчас канфліктаў. „Беларусы ня ўмеюць, альбо ня хочуць абараняцца. На сёньняшні дзень меншасьць пасыўная, а час працуе супраць нас”, — гаворыць Я. Вапа.

Магчыма, корань гэтай праблемы ня ў Польшчы. Вядома, што агульныя настроі ў дыяспары вызначае сытуацыя на духоўнай радзіме, у Беларусі. Факты з найноўшай гісторыі сьведчаць пра гэта. Калі на пачатку 1990-х гадоў пачаўся працэс станаўленьня беларускай дзяржавы, то зацікаўленасьць у беларускай адукацыі на Беласточчыне сярод настаўнікаў і вучняў значна павысілася. Выпускнікі школаў з ахвотай ехалі вучыцца ў беларускія ВНУ. Зараз наадварот — у Беларусі пануе русыфікацыя й гэта адмоўны прыклад для беларусаў замежжа, асабліва для моладзі, якая гадуецца ў беларускіх сем’ях. Нярэдка бацькі чуюць ад сваіх дзяцей: „Навошта нам вучыць гэтую беларускую мову, калі ў самой Беларусі на ёй ніхто не размаўляе, а ў Гародні няма ніводнай беларускай школы”. Гэта моцны аргумэнт.

Акрамя таго, мяжа ўскладняе паездкі ў Беларусь. Рэдкія выезды ў Менск і Гародню арганізуюцца выключна намаганьнямі бацькоў і настаўнікаў, без аніякай падтрымкі з боку беларускай дзяржавы. А які прыклад паказвае сёньняшняя Беларусь беластоцкім школьнікам? Прыязджаючы, яны чакаюць пачуць на вулі-

цах нашых гарадоў беларускую мову, а замест гэтага чуюць „русскую речь”...

### Навучанне ў Беластоку

Падчас апошняга перапісу ў Беластоку, дзе жывуць амаль 300 тыс. жыхароў, каля 8 тыс. чалавек запісаліся беларусамі. Усяго ў беларускай адукацыі ў Беластоку заангажавана каля 150 вучняў. Тут працуе беларускі дзіцячы садок, у школах ёсць шэсць клясаў з навучаньнем беларускай мовы, беларуская гімназія, у Беластоцкім Унівэрсытэце адкрыты факультэт беларускай мовы. Асноўны працэс навучаньня дапаўняе пазашкольная праца: тэатар, танцавальны калектыў, плястычны гурток для дзетак і г.д.

„Польская правінцыя асымілюецца маланкавымі тэмпамі. Сваю ролю ў гэтым мае й працэс выміраньня вёсак. Але на гэтым фоне ў Беластоку назіраецца цікавая зьява, — кажа Ганна Кандрацюк. — Большасьць бацькоў, якія пасылаюць сваіх дзяцей на заняткі беларускай мовы, самі ўжо асыміляваліся. Гэты факт паказвае, што нягледзячы ні на што, беларускасьць не памірае. Гэта дае ўпэўненасьць, што ня ўсе хочуць асыміляваццa”.

Дзеля таго, каб у школе дзеці вывучалі беларускую мову, бацькі павінны падаць заяву. Калі заяву на навучаньне падалі ня менш сямі бацькоў, школа абавязана знайсьці настаўніка. Калі дзяцей, жадаючых вывучаць родную мову, менш за сем, то кіраўніцтва навучальнай установы павінна знайсьці спосаб далучыць дзяцей да іншай групы. Заява бацькоў неабходная як у звычайных, так і ў беларускіх школах, дзе кожны вучань абавязаны вывучаць мову. Акрамя беларускага навучаньня, на Беласточчыне вядзецца ўкраінскае, літоўскае й цыганскае нацыянальнае навучаньне.

### Рэлігійнае выхаваньне ў школах

У традыцыі польскага навучаньня — удзел няўрадавых арганізацыяў у пазашкольнай працы. Грамадзкія арганізацыі прадастаўляюць школьнікам магчымасьці валянтэрскай працы, акрамя таго, вядзецца праца, якая

рыхтуе школьнікаў да жыцьця й да вырашэньня жыцьцёвых праблемаў. Вялікую ролю маюць заняткі па закону Божаму. Заняткі рэлігіі, праваслаўнай альбо каталіцкай, адбываюцца два разы на тыдзень. Зазвычай іх праводзіць катэхет — чалавек, які мае для гэтага спэцыяльную падрыхтоўку й дазвол на працу ў школе.

Для навучаньня дзяцей рэлігіі бацькі павінны напісаць дэклярацыю аб тым, якой рэлігіі будзе навучацца іх дзіця. Такім-жа чынам — дэклярацыяй, бацькі могуць увогуле вызваліць школьніка ад гэтых заняткаў. Самае істотнае ў гэтым пытаньні — жаданьне бацькоў. Статыстыка сьведчыць, што ў гарадах больш дзяцей навучаюцца каталіцкай рэлігіі, у вёсцы — больш праваслаўнай.

**Ступені беларускай адукацыі**

Пачаць адукацыю дзеці зь беларускіх сем'яў у Беластоку могуць з Прадшкольля № 14 з польскай і беларускай мовамі навучаньня. Калектыў дзіцячага садка рэалізуе праграмы для выхаваньня дзяцей ад 2 да 6 год. Беларускія групы тут існуюць з 1995 года. Шасьцігодкі вучацца па агульнапольскіх праграмах навучаньня. Таму зь беларускага прадшкольля ў школы дзеці прыходзяць цалкам падрыхтаванымі.

Падчас заняткаў тут знаёмяцца зь беларускай мовай, культурай і традыцыяй. Адметнасьцю прадшкольля зьяўляецца тое, што бацькі, настаўнікі й дзеці супольна, разам сьвяткуюць царкоўныя й абрадавыя беларускія сьвяты. У традыцыю садка ўвайшлі супольныя выезды за горад, творчыя вечарыны.

Ад самага пачатку працы садка тут быў арганізаваны тэатар „Ад абраднасьці да тоеснасьці". Асноўная ідэя пастановак — беларушчына. Акторы — дзеці, іх бацькі й настаўнікі. „У сучасным сьвеце нельга адчуць сябе паўнавартасным чалавекам ня ведаючы сваіх каранёў", — так лічаць настаўнікі й выхавацелі Прадшкольля № 14.

Выпускнікам дзіцячага садка працягнуць беларускае навучаньне дае магчымасьць базавая школа № 4 г. Бе-

ластока з дадатковым навучаньнем беларускай мовы. Базавая школа ўключае ў сябе навучаньне з 1 да 6 клясы, а таксама нулявую клясу, у якую прыходзяць шасьцігодкі. Для навучаньня беларускай мове ў школе ёсьць спэцыяльны кабінэт. Яго абсталявалі сваімі сіламі настаўнікі й бацькі. Бацькі дзяцей, якія вучацца беларускай мове, вельмі актыўныя. Яны дапамагаюць у арганізацыі навучаньня, цікавяцца школьным жыцьцём, і, як кажуць настаўнікі, „робяць у тысячу разоў больш, чым консульства й беларускі ўрад разам узятыя". Кажа дырэктар школы Зьбігнеў Клімовіч:

— Навучацца роднай мове ў нас маюць магчымасьць дзеці з украінскіх, беларускіх і літоўскіх сем'яў. Мова выкладецца тры гадзіны штотыдзень зь першай клясы. Для бацькоў гэтае навучаньне бясплатнае. Калі бацькі заяўляюць, што іх дзіця будзе вучыць сваю нацыянальную мову, то моўныя заняткі для навучэнца становяцца абавязковымі. Вучань павінен наведваць гэтыя ўрокі. Іншая сытуацыя з заняткамі па рэлігіі — вучань сам, паводле свайго жаданьня, вырашае ісьці на занятак ці не. Дзеці зь беларускіх сем'яў маюць дадатковыя заняткі беларускай мовы, а таксама лекцыі на беларускай мове. На кожным этапе нацыянальнага навучаньня да лекцыяў дадаюцца заняткі па музыцы й пластыцы, але ўсе яны так ці інакш зьвязаныя зь беларускім навучаньнем.

Мы зьяўляемся рэгіёнам, дзе ёсьць тры найбольшыя нацыянальныя суполкі — літоўская, беларуская, украінская. Але ня толькі. Напрыклад, у нашай школе ёсьць дзеці з Чачні — 8 чалавек, а таксама цыганы. Чачэнцы вельмі кепска гавораць па-польску. Нашая мэта — навучыць іх і даць ім магчмасьці для навучаньня. Таму яны, апроч звычайных лекцыяў, маюць дадатковыя заняткі польскай мовы.

Таксама ёсьць група зь сямі дзяцей цыганскай нацыянальнасьці. Цыганы ў Польшчы не зьяўляюцца нацыянальнай меншасцю ў поўным разуменьні гэтага слова.

Нашыя цыганы вельмі спалянізаваныя, добра гавораць па-польску. Яны не карыстаюцца сваёй мовай. Таму бацькі й не імкнуцца, каб у школах іх дзецям выкладалі цыганскую мову. Яны хочуць захаваць некаторыя свае традыцыі. Мы можам стварыць для іх такія ўмовы. З цыганамі мы працуем ужо некалькі дзесяткаў гадоў. Дзеці з цыганскіх сем'яў у апошнія часы вельмі ахвотна ходзяць у школу. Для нас яны — звычайныя вучні, як і ўсе астатнія.

І чачэнцы, і беларусы, і цыгане ходзяць у звычайныя клясы, а пасьля лекцыяў маюць свае дадатковыя заняткі. Сродкі дзеля гэтай працы школа атрымоўвае зь дзяржаўнага бюджэту.

— **Ці маюць дзеці зь сем'яў нацыянальных супольнасьцяў праблемы ў камунікацыі з аднагодкамі?**

— Я выкладаю матэматыку ў шостай клясе. На беларускую мову з гэтай клясы ходзіць 9 навучэнцаў з 24. У іншых клясах адны дзеці ходзяць на каталіцкую, другія на праваслаўную рэлігію. У нас ёсьць адзін хопчык-мусульманін. Паводле маіх назіраньняў, у такіх клясах ёсьць толькі адна праблема — кожны хоча быць найлепшым. Я магу сказаць, што ў пытаньнях паходжаньня альбо веравызнаньня ніякіх праблемаў паміж дзецьмі няма.

— **Як тут глядзяць на Беларусь?**

— На Беларусь у гэтым рэгіёне ёсць два погляды. Першы — на афіцыйную ўладу, якую прадстаўляе А. Лукашэнка. Другі — на беларусаў як на людзей. Для нас яны такія-ж самыя як і кожны іншы чалавек. На вуліцах Беластоку, на рынку, у школах ёсьць шмат беларусаў. Кантакт штодзённы. А палітыка сёньня можа быць такая, а заўтра іншая. На міжасабовым узроўні палітыка нічога не мяняе. Беларусы ў Польшчы зараз успрымаюцца так, як палякі ў Эўропе й Амэрыцы. Мы гэта ведаем.

— **Што зьмянілася з уступленьнем у Эўразьвяз?**

— Польшча толькі нядаўна ўвайшла ў Эўразьвяз. Але мы даўно былі да гэтага падрыхтаваныя. Недзе дзесяць

год таму пачалі дзейнічаць правілы, якія надалі нацыянальным меншасьцям магчымасьць больш актыўна разьвівацца на тэрыторыі нашага краю. Прыклад гэтага — нашая школа, дзе ўжо 8 год мы навучаем дзяцей беларускай мове. Такая школа толькі адна ў Беластоку, таму вучыцца да нас прыяжджаюць зь іншых мясьцінаў.

Выпускнікі школы № 4 могуць працягнуць сваё навучаньне ў гімназіі. У беластоцкай гімназіі трэці год працуюць клясы з навучаньнем беларускай мовы. Дырэктар навучальнай установы пані Сакалоўская гаворыць, што навучаньне распачалося па жаданьню бацькоў. Выхаванцы беларускіх клясаў гімназіі актыўныя й не пакідаюць беларускасьці ў школьных сьценах, а штодзень карыстаюцца беларускай мовай у сваіх справах і на адпачынку.

У ліпені гэтага году настаўнікі й навучэнцы гімназіі правялі этнаграфічны летнік „Я нарадзіўся тут". Тыдзень школьнікі правялі ў Белавескай пушчы. Там узьнікла ідэя стварэньня творчага згуртаваньня беларускай моладзі „Барацьба". Удзельнікі „Барацьбы" самі паставілі спэктакль. „Тэма спэктаклю — стасункі паміж бацькамі й дзецьмі на вёсцы. Праблема ў тым, што дзеці прыяжджаюць на вёску да бацькоў толькі дзеля таго, каб узяць сабе мяса. На мой погляд, вельмі актуальна", — гаворыць Наталька Швэд, навучэнка гімназіі, дачка вядомага дзіцячага беларускага паэта Беласточчыны Віктара Швэда.

Гайнаўскі ліцэй з дадатковым навучаньнем беларускай мовы — самая вядомая, можна сказаць нават легендарная беларуская навучальная ўстанова ў Польшчы. Зараз беларускай мове тут навучаюцца 174 асобы.

У новым будынку знаходзіцца комплекс школаў — гімназія й ліцэй. У гімназіі навучаюцца дзеці з 13 да 15 гадоў, у ліцэі ад 16 да 19 гадоў. У гімназіі лекцыі па беларускай мове праходзяць тры разы на тыдзень, а ў ліцэі — чатыры. Дадатковая, чацьвёртая гадзіна навучаньня для ліцэістаў — выключэньне з правілаў. Такая маг-

чымасьць зьявілася дзякуючы ўладам павету, якія прадаставілі фінансаваньне.

Гайнаўскі ліцэй вядомы ня толькі як беларуская навучальная ўстанова. Паказчыкі пасьпяховасьці вучняў лепшыя ў ваяводзтве й адны зь лепшых ва ўсёй Польшчы. Таму й конкурс сюды даволі вялікі. У мінулым годзе на 120 месцаў дакумэнты падалі 240 вучняў. Тут жадаюць вучыцца дзеці ня толькі беларускіх бацькоў. „Але калі нехта прыходзіць да нас вучыцца, мы яго не пытаем беларус ён ці паляк", — гаворыць дырэктар Гайнаўскага ліцэю.

Кіраўніцтва ліцэю шмат робіць для пашырэньня беларускай адукацыі й па-за межамі ліцэю. 7-8 год таму выкладчыкі Гайнаўскага ліцэю й гімназіі ініцыявалі сустрэчы з бацькамі ў пачатковых школах Гайнаўкі. Падчас гэтых сустрэчаў настаўнікі пераконвалі бацькоў у тым, што калі іх дзеці будуць вывучаць беларускую мову — гэта добра. Высілкі настаўнікаў мелі плён — калі раней у пачатковых клясах беларускай мове вучыліся 4-5 чалавек, то пасьля сустрэч з бацькамі навучацца сталі каля 20-30 чалавек. Гаворыць выкладчыца беларускай мовы й літаратуры Гайнаўскага ліцэю Вольга Сянкевіч:

— Проста трэба было гаварыць, што беларуская мова — гэта мова нашых суседзяў, наша родная мова. Бацькі гэта разумеюць і запісваюць сваіх дзяцей на навучаньне. Але агітацыя, ці, дакладней кажучы, матывацыя павінна быць з нашага боку. Вельмі важнай, мяркую, зьяўляецца й матывацыя з другога боку мяжы.

**— Бацькі, якія прыводзяць сваіх дзяцей да вас, на беларускамоўнае навучаньне, зьвязваюць далейшы лёс сваіх дзяцей зь Беларусьсю?**

— Не, думаю, што не зьвязваюць. Зараз нават няма жадаючых вучыцца ў беларускіх ВНУ. Раней з кожнага выпуску вучыцца ў Беларусь ехала па 15-20 чалавек. А зараз мы заўважаем, што ў Беларусі беларуская мова не ўспрымаецца як народная мова й відавочная даміна-

цыя рускасьці. Нашая моладзь выхаваная ў больш дэмакратычных абставінах. Яны прывыклі гаварыць тое, што яны думаюць.

На гэты час у кожнай школе ў Гайнаўцы ўведзенае добраахвотнае навучаньне беларускай мове. Самаўрады выдзяляюць сродкі на заробкі настаўнікам беларускай мовы ў памеры аплаты трох гадзінаў на тыдзень. Гэты мінімум прадугледжвае праграма беларускага навучаньня. Бельскае й Гайнаўскае староствы выдзяляюць грошы яшчэ на адну дадатковую гадзіну навучаньня. Некаторыя школы атрымліваюць сродкі на аплату інстуктараў, якія працуюць зь беларускімі творчымі калектывамі. У Гайнаўцы ў нацыянальную адукацыю зараз заангажавана 577 школьнікаў. Цікавасьць да навучаньня даволі вялкія: напрыклад, у базавай школе ў квартале Юдзянка з 92 вучняў мову вывучаюць 50.

Але, тым ня менш, агульная тэндэцыя беларускага навучаньня ў Польшчы адмоўная. Лік навучэнцаў паволі скарачаецца. Дваццаць гадоў таму беларускай мове навучалася 4 275 чалавек. У верасні 2005 году навучанне роднай мове распачалі 3 521 чалавек.

**Алег Гардзіенка**

# Арарат беларускіх гісторыкаў

У мурах Беластоцкага Ўнівэрсытэту дыхаецца вальней, чым у Беларусі. Пра гэта падумалася, калі мераў я крокамі калідор ля Катэдры Беларускай Культуры, чакаючы Алега Латышонка. А можа дыхаецца вольна таму, што ты там не працуеш.

**Свабода выбару**

Па той бок мяжы — няма сьпісу забароненых навуковых тэмаў. Ці не найбольшая ў гэтым цяжкасьць — на пэўную тэму можна не здабыць стыпэндыі. Але ў Беластоку табе ня скажуць, што дасьледаваньне жыцьця жанчынаў у XIX ст. — гэта ненавукова, а вывучэньне нацыянальнага руху падчас другой нямецкай акупацыі — гэта ўсхваленьне фашысцкіх памагатых.

Хочаш — дасьледуй нацыянальны рух на Беласточчыне падчас Другой сусьветнай, хочаш — польскую партызанку ці палітыку польскага ўраду ў дачыненьні да нацменшасьцяў і сацыяльны ўціск. І цябе ня будуць ві-

наваціць у ачарненьні ідэалаў польскай дзяржавы. Навука не павінна быць служкай ідэалёгіі.

Я расказваю старшыні Беларускага Гістарычнага Таварыства (БГТ) у Беластоку доктару Алегу Латышонку пра апошнія зьвесткі з гістарычнага жыцьця ў Менску. Ён раз-пораз абхоплівае галаву далонямі й жахаецца: „Божа мой, які маразм”. Так, мінула амаль пятнаццаць гадоў, як ляснула жалезная заслона, на дварэ 2005 год, а мы страшна далёка ад цывілізаванага сьвету нават у гістарычнай навуцы, у адрозьненьне ад нашых суседзяў.

**Падрэзаныя крылы**

Натуральна, беларускія гісторыкі ў Беластоку таксама сутыкаюцца зь цяжкасьцямі. Ёсьць праблемы падобныя на беларускія. Паводле слоў Алега Латышонка, курс гісторыі Беларусі ва ўнівэрсытэце складае 30 гадзінаў, таму стаўку даводзіцца дабіраць, напрыклад, выкладаньнем гісторыі Вялікай Брытаніі. Але самая галоўная праблема — судовыя разьбіральніцтвы па справе Праграмнай Рады Тыднёвіка „Ніва”.

„Падрэзаныя крылы”, — характарызуе сытуацыю Алег Латышонак. Суды не даюць уздыхнуць на поўныя грудзі ды цалкам сканцэнтравацца на гістарычных дасьледах, „хоць гэта адзінае, што добрае ідзе ў жыцьці”.

Доктар А. Латышонак і загадчык Катэдры Беларускай Культуры прафэсар Яўген Мірановіч — Геракл і Антэй беларускай гістарыяграфіі. Толькі ў адрозьненьні ад герояў грэцкіх мітаў не ваююць міжсобку, а супольна працуюць.

Яўген Мірановіч — аўтар бэстсэлеру *Найноўшая гісторыя Беларусі* — цягам трох апошніх гадоў дасьледуе палітыку санацыйнай Польшчы ў дачыненьні да беларусаў і ўкраінцаў. Кніга мае выйсьці на пачатку 2006 г. Алег Латышонак кажа, што сп. Яўген — матор Беларускага Гістарычнага Таварыства й яго друкаванага органу „Białoruskie Zeszyty Historyczne”: „На Яўгене ўсё трымаецца, ён упарта штурхае наперад справу”.

Яўген Мірановіч расказвае пра апошнія тэндэнцыі гістарычнай навукі ў Польшчы, у прыватнасьці пра тое, што ўзрасло зацікаўленьне апошнімі гадамі ПНР, трансфармацыяй грамадзтва, а таксама — хто быў даносчыкам за камунай. Так, нядаўна былі выдрукаваныя сьпісы „ціхароў” па Мазавецкім ваяводзтве. Набралася 26 тыс. прозьвішчаў.

На пытаньне, наколькі гэта этычна — друкаваць сьпісы тайных супрацоўнікаў, сп. Яўген адказвае, што частка грамадзянаў і гісторыкаў настроена адназначна: неэтычна было даносіць на сваіх суседзяў.

**На сваім баку**

У польскіх і беларускіх гісторыкаў розныя погляды на падзеі XX ст. Для палякаў „цуд на Вісьле” 1920 г. — несумненны прыклад геройства. А якое было стаўленьне ў беларусаў да гэтых падзей? Адны разам з палякамі тварылі „цуд на Вісьле”, другія — у складзе „чырвоных” — несьлі рэвалюцыю ў Эўропу. Цывільнае насельніцтва, паводле слоў А. Латышонка, ставілася да вайны індыфэрэнтна. „Бязладзьдзе было, многія яшчэ не павярталіся зь бежанства. Нацыянальна сьведамыя беларусы, асабліва зь Беласточчыны, ваявалі за БНР у арміі Булак-Балаховіча, адагналі бальшавікоў аж за Мазыр. І былі пасьля раззброеныя палякамі. Многія балахоўцы разам зь мясцовымі сялянамі потым у 1920-я гады бралі ўдзел у БНРаўскай партызанцы ў Белавескай пушчы”, — так пракамэнтаваў падзеі 85-гадовай даўніны ў інтэрвію менскаму штотыднёвіку „Наша Ніва” А. Латышонак.

Тое-ж тычыцць падзеяў 1939 г. Для шараговага паляка падзеі 17 верасьня — відавочная акупацыя краіны. „Саветы ўтыркнулі нам нож у сьпіну, — казаў мне й калегу-журналісту ў гатэлі швайцар. — Каб не 17 верасьня, мы-б яшчэ пазмагаліся зь немцамі”.

Пры ўсёй павазе да прыемнага, гаваркога сп. Вінцэнтага, ён выказаў погляд тытульнай нацыі. „Беларусы чакалі зьменаў, большасьць праваслаўнага грамадзтва па-

чувалася прыніжанай. Яно ня мела ні школаў, ні ўстановаў, — кажа Я. Міրановіч. — Таму беларусы ня надта й бедавалі з нагоды прыходу чырвоных. Польская ўлада здавалася ім чужой”. Аднак прыхадні ня спраўдзілі чаканьняў. Пачалі сотнямі лавіць мітычных кулакоў, пацягнуліся на Ўсход эшалёны зь дзясяткамі, сотнямі тысяч арыштаваных. Бальшавікі каралі за саму малую віну — і людзі пачалі чакаць новую зьмену ўладаў. „У літоўскіх Дукштах у **1941** г. старыя маліліся, каб пачалася вайна, — кажа гісторык з Варшавы, сьведка тых падзеяў Юры Туронак. — Маліліся, каб прыйшло збаўленьне ад бальшавікоў”.

**Палямон „прыйшоў” з Поўдня**

Алег Латышонак, што больш як дзесяцігодзьдзе займаўся XX ст., нібы машынай часу перанёсься на некалькі стагодзьдзяў у мінулае. Цяпер піша дысэртацыю пра пачаткі беларускай нацыянальнай ідэі — „той час, калі ідэя была, але не было нацыі”. Ён упэўнены: Беларусь можна разглядаць тады, калі ейныя насельнікі пачынаюць сябе дэкляраваць беларусамі. Так, першым чалавекам, які лічыў сябе беларусам, быў кальвініст, пісьменнік Салямон Рысінскі (1560-1625). У іматрыкуляцыйных актах унівэрсытэта Альтдорфа ён запісаў сябе беларусам (леўкарусусам).

Іншы прадмет пошукаў — разьвянчаньне міту пра Палямона. Усе памятаем легенду, што Палямон уцёк з Рыму, ратуючыся ад Нэрона. Праз Паўночнае мора й Балтыку трапіў на тэрыторыю сучаснай Літвы.

Алег Латышонак даказвае, што Палямон насамрэч існаваў, але быў... царом элліністычнай дзяржавы на беразе Чорнага мора. Зваўся ён Палямон II і быў нашчадкам Мітрыдата VI Эўпатара. Менавіта яго імя адшукаў у працах Страбона й Тацыта ананімны аўтар XVI ст. і стварыў геніяльную літаратурна-гістарычную містыфікацыю, прымусіўшы літоўцаў паверыць у рымскае паходжаньне сваіх князёў. Але як добры майстар дэтэктыва ана-

німны аўтар пазначыў коды, па якіх вылічваецца містыфікацыя. Адна зь іх — грэцкае імя. Палямон, сярод іншага, — марскі грэцкі бог, патрон маракоў.

### У пошуках Дзядоў

Зь бібліятэказнаўцам і філёлягам Гражынай Харытанюк я пазнаёміўся ўлетку 2001 г., калі ў рамках летняй міжнароднай школы Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы ОВТА мы запісвалі ўспаміны людзей у Гайнаўскім павеце. Праектам кіравала экс-пасол Польшчы ў Беларусі прафэсар Альжбэта Смулкова. Але душой летняй школы стала Гражына. Ейная ветлівая ўсмешка, жарты, гатоўнасьць прыйсьці на дапамогу кожнаму неафіцыйна зрабілі маладую прыгожую дзяўчыну галоўнай асобай школы.

У адрозьненьне ад мяне, Гражына прайшла ўсе этапы школы. Пабывала таксама на польска-літоўскім, беларуска-ўкраінскім, беларуска-літоўскім памежжы. Палявыя дасьледаваньні праводзіліся нават у Горках (Магілёўшчына) на мяжы з Расіяй. „Гэта была ці не найцікавейшая сэсія”, — зазначае Гражына.

Вынікам некалькіх гадоў працы мусіць стаць грунтоўная праца, прысьвечаная памежжу — куды ўвойдуць як аналітычная частка, так і ўспаміны людзей.

„Асабістае” навуковае зацікаўленьне магістра Г. Харытанюк — абрад „Дзяды” ў этнасацыялягічным і філялягічным кантэкстах. Тэма дысэртацыі — стары абрад у дакумэнтах, літаратуры (перад усім у Адама Міцкевіча), а таксама палявых досьледах.

Гражына аб’езьдзіла ўсю Беларусь — і ў адзіночку, і ў экспэдыцыях — ад Гарадзеншчыны да ўсходняй Магілёўшчыны. „Адзінае месца, дзе я не была, гэта паўночны ўсход — Віцебшчына”, — кажа Гражына.

„Як людзі ўспрымаюць прыезд навукоўца?” — „Абсалютна нармальна. Галоўнае правіла — дасьледчык мусіць ставіцца да чалавека не як да інфарматара, а як да суразмоўцы”.

### Крамола на мяжы

На жаль, не ўдалося пагаварыць зь Ірэнай Матус і Аленай Глагоўскай. Першая мела сямейныя праблемы, другая прыхварэла й не прыехала на лекцыі з Гданьска ў Беласток. А. Глагоўская так і жыве між двума гарадамі. Асноўнае месца пражываньня — горад на Балтыцы, галоўнае месца працы — Беласток, куды прыяжджае на два-тры дні кожны другі тыдзень месяца.

Затое ўдалося пагутарыць зь ейным калегам Вячаславам Харужым, сябрам БГТ ды чальцом рэдакцыі штомесячніка „Czasopis". Веслаў выкладае гісторыю ў ліцэі, а дасьледаваньнямі й выдаваньнем кнігаў займаецца ў вольны час. У рамках працы ў ліцэі разам з навучэнцамі бярэ ўдзел у міжнародным конкурсе „Блізкая гісторыя". Відаць, Вячаслаў — добры педагог. Інакш як тады патлумачыць, што ягоныя выхаванцы пастаянна бяруць другое месца ў досыць складаным масавым конкурсе?

А. Глагоўская й В. Харужы працуюць разам, выпускаючы й рэдагуючы кнігі. Наступны праект — выданьне ліставаньня беларускага дзеяча, ураджэнца Браслаўшчыны Мар'яна Пецюкевіча. Актывіст нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі, дырэктар музея імя І. Луцкевіча, у 1949 г. ён быў арыштаваны саветамі й асуджаны на 25 гадоў. *Кара за службу народу* — так назваў Пецюкевіч мэмуары, што выйшлі чатыры гады таму ў выдавецтве БГТ. „Ліставаньне" мусіць стаць 28-й кнігай БГТ, што выдаюцца ад 1994 г. Дарэчы, найбольш актыўна манаграфіі друкаваліся ў 1990-х, калі выйшла 18 кніг.

Між іншым, праз некалькі дзён па маім вяртаньні ў Беларусь, у трох беларусаў, што кіраваліся ў Менск, канфіскавалі кнігі БГТ — *Наш радавод. Палякі й беларусы: дыялог культур*, *Успаміны* Анелі й Веранікі Катковіч, М. Пецюкевіча, нарысы Сакрата Яновіча. Падстава — невядомая. На памежжы нават прасілі кніганошаў перакласьці зь беларускай назвы кнігаў, якія забралі на экспэртызу. „Відаць, рэжым баіцца нашых кнігаў. Нас

гэта пераконвае, што наша праца патрэбная", — напісаў мне ў электронным лісьце В. Харужы.

**Праўда пра СБМ**

Расказ пра беларускіх гісторыкаў Польшчы быў бы няпоўным без аповеду пра доктара Юрыя Туронка. Напісаная ў 1990 г. і выдадзеная па-польску, а ў 1993 г. па-беларуску ягоная *Беларусь пад нямецкай акупацыяй* да гэтага часу трымаецца ў сьпісе беларускіх бэстсэлераў. І калі эпізадычна зьяўляецца на кніжных развалах у Мінску, прадаецца за шалёныя грошы.

Сумна, але навукоўцы ў метраполіі нічога за гады незалежнасьці не стварылі не тое, што вартага, а падобнага на кнігу Ю. Туронка. Відаць, насьпеў час перавыдаць кнігу, пагатоў Юры Браніслававіч сам зазначае, што некаторыя разьдзелы перапрацаваў-бы — зьявіліся новыя факты, некаторыя рэчы састарэлі.

Аднак сёньня ён сканцэнтраваўся на іншым — канчае працу над кнігай пра Саюз Беларускай Моладзі (1943—1945). Манаграфія будзе распавядаць пра дзейнасьць арганізацыі як у Беларусі, так і Нямеччыне.

Юры Браніслававіч кажа, што кніга можа не спадабацца й тым, хто цягам некалькіх дзесяцігодзьдзяў бэсціў СБМ, і тым, хто яго ўсхваляў. Гэта будзе аб'ектыўная ацэнка таго, чым быў для гісторыі й кожнага яго ўдзельніка СБМ. Удзел у арганізацыі моцна паўплываў на далейшы лёс ягоных сябраў. Адным за сяброўства ў СБМ давалі 10 год турмы, іншыя нават на эміграцыі баяліся прызнацца, што былі ўдзельнікамі Саюзу. Трэція атрымалі ў СБМ моцны зарад беларушчыны й спрычыніліся да заснаваньня безьлічы беларускіх суполак у Вольным Сьвеце.

У *незалежнай Беларусі* ўжо чакаюць кнігі. У сучаснай — яе чакае шквал крытыкі афіцыйных гісторыкаў, бо манаграфія пойдзе ў разрэз з „генэральнай лініяй партыі". Маўляў, як можна такое выдаваць? Але факт ёсьць фактам. Кніга Ю. Туронка здольная пахаваць сотні кні-

гаў-мітаў пра рэспубліку-партызанку. Так было й зь *Беларуссю пад нямецкай акупацыяй*. Багата крытыкі, але ніхто ня здолеў напісаць рэцэнзіі, дзе-б раскрытыкаваў аўтара. Не было чым пярэчыць.

**Далёка наперадзе нас**

Пры канцы 1990-х гадоў Беласток падаваўся для нас — жыхароў метраполіі — беларускім гістарычным П'емонтам, а працы тамтэйшых гісторыкаў-беларусаў былі перадавой гістарычнай думкай. Артыкулы ў „Беларускім Гістарычным Зборніку" служылі ўзорам: вось так пішуць навуку не абцяжараныя ідэалягічнай задухай мясцовыя гісторыкі.

Калегі зь Менску, Горадні, Берасця ехалі ў цэнтр Падляшскага ваяводзтва на канфэрэнцыі й для таго, каб адчуць, што гэта такое — займацца гісторыяй *не на заказ*. Некаторых немагчыма было пазнаць. Падчас дакладаў яны казалі такія рэчы пра БССР, акупацыю Заходняй Беларусі ў 1939 г. і пэрыяд нямецкай акупацыі, што на аналягічных канфэрэнцыях у Мінску казалася цішком, у курылцы.

Здавалася, ну нічога, вось мы — маладзейшыя — аперымся, станем на ногі й пакажам, што можам пісаць ня горай. Ня сталі. Толькі ідэалягічнай задухі за апошнія гады яшчэ пабольшала. Дый колькі ў нас, у Беларусі, было таго гістарычнага рэнэсансу?

Беларускі „Беласток" жыве ў незалежнасьці ад 1990 г. Таму тут і сапраўды дыхаецца вальней. Гэта Арарат беларускіх (метрапольных) гісторыкаў. Ён знаходзіцца за мяжой, хоць і бачны зь любога беларускага ўнівэрсытэту. Але гэта наш Арарат.

**Зьміцер Дзядзенка**

# Стыгма беларускасьці

Галоўны рэдактар газэты „Ніва" Яўген Вапа кажа, што раней Польшчай кіравалі „левыя" беларусы, а цяпер пачынаюць кіраваць беларусы „правыя": „Бацька Цімашэвіча родам з-пад Ваўкавыску, у Кваснеўскага маці з Глыбоччыны. Сям'я цяперашняга прэм'ера Марцінкевіча родам з Усходняй Беларусі, ад бальшавікоў уцякла пад Ліду. Качынскі прызнаўся, што ягоны дзед працаваў на чыгунцы ў Баранавічах. Як казаў яшчэ Пілсудскі, палякі ня ўмеюць кіраваць Польшчай". Адно што, кажа Вапа, беларусам Польшчы ніякай карысьці ад „беларускай" улады няма.

Сапраўды, беларускую мову на вуліцах Беластоку можна пачуць яшчэ радзей, чым у Менску. Беларускія вёскі на Беласточчыне стаяць нешматлюдныя: жывуць там пераважна старыя. Гісторык Яўген Міpановіч кажа: „Большасьць беларусаў Беласточчыны жыве ў гарадах і мястэчках — Беластоку, Бельску, Гайнаўцы. Лепшая моладзь паехала ў горад, каб пакінуць вёску, якая атаясамлівалася зь бядой, цяжкой працай. Працавалі 8 гадзінаў, жылі пару гадоў па кутах і атрымлівалі кватэры

па 30-40 квадратных мэтраў. Гэта была мэта, якой дасягнулі людзі: лепшае жыцьцё, лёгкая праца. У вёсках засталіся пэнсіянэры. Ім цяжка пераехаць у Беласток, бо яны не прызвычаеныя да гэтага жыцьця. Яны маюць невялікія пэнсіі ў 150-200 даляраў: маючы сваю хату, сваю бульбу, можна неяк пражыць”. Сапраўдных гаспадароў, фэрмэраў — 1-2 на вёску!

У суседніх зь беларускімі польскіх гмінах насельніцтва больш. І жывуць там людзі больш маладыя. У чым прычына? Мірановіч лічыць, што віной тут палітыка, якую праводзілі польскія ўлады ў 70-х гадах: „У 70-х гадах на 1 000 жыхароў усходніх гмінаў інвэстыцыяў у інфраструктуру: пабудову дарог, разьвіцьцё школьніцтва, мэдычнае абслугоўваньне — было прыблізна ў 3-4 разы менш, чым у заходніх гмінах ваяводзтва. Гэтая інфраструктура была на захадзе ваяводзтва — там людзі й заставаліся, дзе былі дарогі, умовы для жыцьця, месцы для працы. У беларускіх вёсках не было ніякай пэрспэктывы. Людзі бачылі, што можна выехаць сям’ёй у Беласток, папрацаваць троху і зажыць нармальна — дык яны і ўцякалі.

Была і такая палітыка ў 70-я гады, каб прывезьці ў беларускія вёскі асаднікаў з Цэнтральнай і Заходняй Польшчы. У беларусаў не было магчымасьці купіць трактар, машыну ў гаспадарку. Асаднікам жа давалі ўсё. Яны бралі машыны, пару гадоў спрабавалі трымаць зямлю, але ўрэшце зьяжджалі. Нашыя сяляне куплялі ў іх машыны ў 3-4 разы даражэй, бо іх не было ў вольным доступе. Такі парадокс камуністычнай гаспадаркі. Так асаднікі атрымлівалі крэдыт, прадавалі самаход, аддавалі крэдыт і яшчэ куплялі сабе кватэру ў Беластоку”.

Тыя, хто жыве ў гарадах, беларускай мовай публічна не карыстаюцца. Не таму што асыміляваліся, а таму што не рызыкуюць вылучацца з асяродзьдзя. Сакрат Яновіч кажа, што асыміляцыйныя працэсы ня так даймаюць, як неталерантнасьць навакольных: „Неталерантнасьць моцная. Палякі хваляцца сваёй талеранцыяй. Але калі

я ў Варшаве, Кракаве ці Шчэціне, я ня думаю, што я беларус. А Беласток — горад вельмі халопскі. Тут няма мовы пра талеранцыю. Беласток ёсьць неталеранцыйным, ультракаталіцкім горадам".

Я. Вапа ў сваіх выказваньнях больш радыкальны: „Талерантнасьць — ужо анахранізм. Мы мусім гаварыць пра партнэрства. Калі Беласток полікультурны горад, я-б хацеў пачуць тут беларускую мову нароўні з польскай. У Горадні можна пачуць на вуліцах, беларускую, польскую, расейскую. І ніхто не зважае на гэта. А ў нас баяцца! Талеранцыя ў нас такая: твая беларускасьць можа быць толькі справай прыватнай, а не публічнай. А беларуская меншасьць хоча быць гаспадарамі на сваёй зямлі. Мы такія-ж грамадзяне гэтага краю і рэгіёну, з такімі-ж правамі. Трэба, каб людзі адчулі, што беларуская мова можа быць ня толькі хатняй, але й публічнай". Зрэшты, улады гэта пакуль што не абыходзіць: на запрашэньне ўзяць удзел у „круглым стале" па праблемах беларускай мяншыні, зладжаным беластоцкай рэдакцыяй „Gazety Wyborczej", яны не адгукнуліся.

Што праўда, няма салідарнасьці і ў беларускім асяродку. Пасол Сойму ад „лявіцы" Яўген Чыквін (апрача яго ў Сойме ёсьць яшчэ 2 прадстаўнікі нацмяншыняў — абодва ад немцаў) лічыць, што нацыянальныя праблемы хвалююць толькі інтэлігенцыю: „Тыя, хто называе сябе «рускімі» ці «тутэйшымі», ня хочуць адрозьнівацца ад навакольных. Польская культура больш выгадная, больш прывабная, больш распаўсюджаная. Беларускасьць — гэта стыгма, яе хаваюць як фізычнае калецтва". Зрэшты, такая мімікрыя многім усё адно не ўдаецца: Я. Чыквін кажа, што ў пасольскай працы сутыкаўся з выпадкамі звальненьня з працы па нацыянальных і рэлігійных прычынах — і ў 90-я гады, і цяпер. Зь іншага боку, пасол бачыць у гэтай сытуацыі й віну саміх беларусаў: „Мы занадта схільныя падкрэсьліваць сваю асаблівасьць і замыкацца ў сваім коле".

**Скончыліся „тутэйшыя”**

Калі ня мова, дык што? Другім „маркерам” беларусаў выступае праваслаўе. Я. Чыквін перакананы: „Найпершым для людзей ёсьць жаданьне хадзіць у царкву”.

Аднак прафэсар Мірановіч кажа, што сацыялягічныя досьледы польскіх сацыёлягаў сьведчаць: 75% праваслаўных беларусаў у вёсках называюць сябе ўжо палякамі. Сам гісторык рабіў дасьледаваньні ў 1983 г.: „У мяне атрымлівалася, што пад 30% праваслаўных называлі сябе палякамі, пад 40% называліся „рускімі” (па веры — „рускай веры”) і 27% — беларусамі. Дасьледаваньні Інстытуту Сацыялёгіі паказалі, што „беларусаў” застаўся такі самы адсотак — пад 27%, але зьнікла катэгорыя „рускіх”, „тутэйшых”. Засталіся толькі „палякі”. Людзі, якім тоеснасьць вызначала толькі вера, былі прыцягнутыя польскай культурай. Перапіс 2002 г. адназначна паказаў 46 тыс. беларусаў на Беласточчыне ды 1,6 тыс. далей у Польшчы. Хаця мы лічым, што найменей 200 тыс. людзей тут павінна быць беларускага паходжаньня. З маёй вёскі збольшага выехалі ў Беласток як беларусы. Але яны пажаніліся, ходзяць у касьцёл і ня хочуць павяртацца. Уцякаюць, бо гэта перашкаджае. Яны ўжо ўвайшлі ў зону іншай культуры і нічога ня хочуць мець супольнага са сваімі каранямі”.

У такой сытуацыі не ратуе нават рэлігійная прыналежнасьць. Вернікі папросту мяняюць канфэсію. Палова з тых, хто выехаў у Беласток, кажа Я. Мірановіч, вянчаецца ў касьцёле: „Зьмяшаныя сужэнствы, якія вянчаюцца ў царкве, дзяцей усё-ж хрысьцяць у касьцёле. Алег Латышонак рабіў дасьледаваньне: палічыў колькасьць паховінаў у праваслаўнай царкве, вянчаньняў і хрышчэньняў. Яму атрымалася недзе ў год у тры разы больш паховінаў, чым хрысьцін, і ў два разы больш вянчаньняў, чым людзей, хрышчаных у царкве. Памірае праваслаўных столькі-ж, як і каталікаў. Але вянчаньняў ёсьць толькі 8%, а хрышчаных — толькі 4% ад каталікаў. Гэта паказвае, як хутка ўсё замяняецца”.

Пэсымізм Я. Мірановіча падмацоўваецца адсутнасьцю беларускамоўнай сыстэмы асьветы, сыстэмы культурніцкіх установаў: „Думаю, зьмены, якія ідуць цяпер, скончацца на працягу аднаго-двух пакаленьняў. Застанецца жменька інтэлектуалаў, якія будуць сустракацца ў сваім вузкім коле, гаварыць, успамінаць... Але гэта ёсьць лёс эмігранцкай супольнасьці, якая будзе пастанна між сабой сварыцца — усе эмігранты сварацца”.

**„Пятая калёна” Лукашэнкі?**

Пачуцца эмігрантам на радзіме, у краі, дзе жылі твае бацькі й дзяды — крыўдна й абразьліва. І надзеяў на паляпшэньне стану рэчаў прафэсар Мірановіч ня бачыць. Нават уступленьне Польшчы ў Эўразьвяз нічога не мяняе — дарма што ЭЗ спрыяе нацыянальным меншыням. „Працэс уваходжаньня ў Эўразьвяз быў спрыяльным: дзяржава выконвала нейкія ўмовы, безь якіх быў бы ўскладнены працэс уваходжаньня. Гэта быў спрыяльны час. Але пасьля ўступленьня пачаліся нашыя праблемы. Выглядае так: працэс уваходжаньня ў Эўразьвяз завяршыўся і ўлады зразумелі, што можна дазволіць сабе свабоду”, — канстатуе гісторык. Менавіта ў той час узьнікла крымінальная справа, паводле якой пад сьледзтвам апынулася кола беларускіх актывістаў, якія апякуюцца выданьнем „Нівы”: іх зьвінавацілі ў грашовым махлярстве. Такі вынік глядзіцца вельмі кантраставa на фоне таго, што атрымалі падчас уваходу ў ЭЗ іншыя меншыні — нямецкая (яна мае нацыянальнае самакіраваньне ў гмінах, падтрымку з боку Нямеччыны), літоўская (таксама нацыянльнае самакіраваньне, дом культуры, апеку Літвы). Прафэсар Мірановіч прыводзіць іх як дадатны прыклад міждзяржаўнай супрацы: „Вялікай пашанай яны карыстаюцца пры дачыненьні паміж дзяржавамі: мы будзем, маўляў, спрыяць вашым, а вы — нашым! Тое самае і з украінцамі: яна часта ёсьць пасярэднікам у міждзяржаўных кантактах”.

Спрыяльным пэрыядам ён называе пачатак 90-х і цёплым словам згадвае Яцка Кураня — „чалавека прыхільнага да нацыянальных меншасьцяў, дзеяча апазыцыі. І сапраўды, ён быў пасярэднікам паміж нацыянальнымі меншасьцямі". Пачатак 90-х — час афармленьня й беларускай дзяржавы. Кожны, хто займаўся палітыкай на Беласточчыне, разумеў, што на ўсходзе ёсьць партнэр. Цяпер беларуская дзяржава мае асаблівыя нацыянальныя ды палітычныя погляды. Расплачвацца за гэта даводзіцца беластоцкім беларусам.

„Нас успрымаюць як прадстаўнікоў нацыі, якая пайшла ў нейкі іншы бок. Да беларусаў ставяцца як да часткі вялікай Беларусі. Гэтага не гавораць, але бачаць нас як частку таго народу, які выбраў Лукашэнку", — канстатуе Я. Мірановіч.

Апошнім разам „пятую калёну Лукашэнкі" спрабавалі „прыціснуць" у сувязі са скандалам вакол Саюзу Палякаў Беларусі. Беларуская супольнасьць у Беластоку выказалася ў падтрымку Анжалікі Борыс (у тым ліку і ў „Ніве"), але некаму гэтага падалося замала. Патрабавалася дэманстрацыя ляяльнасьці — публічныя лісты з пратэстамі. „Штосьці такое нездаровае, прыкрае! Штосьці ад шантажу: ты мусіш выказацца, мусіш пратэставаць, нібы ня можаш свайго слова сказаць!.. Гэта прыніжае".

Беларускія актывісты кажуць, што супраць іх пачалася сапраўдная кампанія шальмаваньня. У прэсе зьявіліся артыкулы, дзе мясцовую беларускую эліту называлі псыхічна хворымі людзьмі. Ананімныя чытачы „Gazety Wyborczej" пісалі, што ўсе беларусы — банда Лукашэнкі. Прапаноўвалі, каб усе беларусы ўцякалі. Многім гэта нагадала паваенныя гады. Першы рэдактар „Нівы" Георгі Валкавыцкі згадаў, як польскія банды палілі ў той час беларускія вёскі, змушаючы жыхароў выяжджаць за ўсходнюю мяжу. Дзе беларусаў было шмат і жылі яны кампактна, там чапаць баяліся. А дзе няшмат, дык выразалі, бывала, нават цэлымі вёскамі...

**За нашу і вашу Беларусь!**

Атаясамліавацца зь Беларусьсю Лукашэнкі беластоцкія беларусы ня згодныя. Але надзеі на рэнэсанс нацыянальнага руху ўсё-ж зьвязваюць зь беларускай дзяржавай. Беларускай ня толькі па назьве, але й па духу. Што праўда, нават у цяперашняй Беларусі захоўваецца там-сям беларускае навучаньне, ёсьць беларускамоўныя тэатры. „А тут дзяржава польская!" — жорстка й катэгарычна абразае Я. Мірановіч. І гэтая дзяржава вядзе палітыку на карысьць пануючай нацыі, а не меншыняў.

Ці пяройдзены Рубікон, за якім няма вяртаньня да паўнацэннага жыцьця беларускай меншыні на Беласточчыне? Ці ўсё-ж дапамогуць ёй магчымыя дэмакратычныя зьмены ў Беларусі? Пачуўшы гэтае пытаньне, прафэсар Мірановіч сьмяецца: „Гэта футурыстычнае пытаньне, бо не відаць, каб у Беларусі былі нейкія зьмены. Але гэта напэўна будзе вялікая надзея! На пачатку 90-х людзі вучыліся беларускай мове, бо была суседняя краіна Беларусь. Гэта быў не Савецкі Саюз, не Расея, а Беларусь, і з гэтым усе лічыліся. Беларуская мова лёгкая для вывучэньня.

Ёсьць сьвядомасьць прадпрымальнікаў, што там можна рабіць бізнэс, але-ж трэба ведаць мясцовыя правілы дарожнага руху, мясцовае заканадаўства. Людзі вучыліся Беларусі! Горадня — за 60 км: гадзіна дарогі! Можна паехаць туды, паглядзець і вярнуцца назад. Гэта было тэарэтычна, але пачынала станавіцца рэальным: лічылі, што тут будзе нейкі рух. Людзі адчулі, што мінуў Савецкі Саюз, што мяжа была адкрыта. І сотні, тысячы людзей прыяжджалі. Беласток атрымліваў сотні кіляграмаў даляраў! Мяшкі даляраў укідвалі ў Беласток! Гэта азначала новыя будынкі, новыя прадпрыемствы. Беласток квітнеў: за пару гадоў ён расквітнеў як агарод на вясну. Людзі адчувалі, што ёсьць суседняя краіна, і ад гэтага ёсьць карысьць".

Беларуская меншыня на Беласточчыне не займаецца пражэкцёрствам: яны рэалісты. Яны хочуць жыць у эўрапэйскай краіне, але ведаюць, што належнае жыццё ім можа гарантаваць толькі дэмакратычная Беларусь па той бок мяжы.

KAMUNIKAT.org

# Зьмест


*палітыка*

Аляксей Лапіцкі
Знаёмства з далёкай і блізкай Польшчай ............... 7
Уладзімір Хільмановіч
Польская сыстэма мясцовага самакіраваньня ....... 57
Валеры Шчукін
Выбарчая сыстэма Беларусі й Польшчы ............... 64
Зьміцер Дрыгайла
Самі сабе кааліцыя ................................................ 71

*грамадзтва*

Алена Сіневіч
Падляшша пад знакам эўра ................................... 79
Аляксандар Дварэцкаў
Стан польскага турызму ....................................... 84
Сьвятлана Станкевіч
Фонд роўных магчымасьцяў .................................. 91
Алесь Бяляцкі
Ад астрогу няма перасьцярогу ............................... 98

*беларусы*

Андрэй Скурко
Маленькая скварачка ў вялікай кашы ................ 119
Марыя Савушкіна
Беларуская адукацыя на Беласточчыне .............. 139
Алег Гардзіенка
Арарат беларускіх гісторыкаў ............................ 148
Зьміцер Дзядзенка
Стыгма беларускасьці .......................................... 156


kamunikat.org